**Алесь Разанаў**

# Танец з вужакамі

*Выбранае*

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1999

УДК 882.61

Серыя заснавана ў 1999 годзе
Рэдакцыйны савет:
Генадзь Бураўкін
Вольга Іпатава
Віктар Казько
Георгій Марчук
Міхась Мушынскі
Уладзімір Някляеў — старшыня савета
Алесь Пісьмянкоў
Іван Пташнікаў
Мікола Станкевіч
Люба Тарасюк
Кастусь Цвірка

ISBN 985-02-0468-0

© А. С. Разанаў, 1999

# ВЕРШЫ

## ПОШУК

А шлях раўнюткі, быццам лісцік,
ляці —
каб вецер у вушах!..
Як гэта лёгка памыліцца
і па чужых
    пайсці шляхах.
Няхай яны імкнуць, як стрэлы,
няхай шырокія яны! —
Стаю адзін.
У небе —
    дрэвы
і жураўліныя кліны.
Лісты апалыя на стрэсе…
Але чакай,
    няўмольны час:
я маю права
ўсё закрэсліць
і потым
нанава пачаць.

* * *

Наіўны хлопчык з сіняй казкі —
ён апантана верыць дню...
А чарната?..—
      глухая маска
на твары ярага агню.
З дрымучых глыбаў антрацыту
здзяры яе,
      бы шалуху,—
і ў той жа міг язык узвіты
удзячна
      тыцнецца
            ў шчаку.

**МАЛАНКА**

Імкліва вымкне
сілай сіняй
з глыбінь насупленых начэй,
асветліць дол,
жуду асіны
і зрэнкі
    стомленых вачэй.
Абпаліць жорстка хмар абрысы,
разбурыць ночы змрочны склеп –
каб свет
    нудоце не скарыўся,
каб свет
    у цемры не аслеп!

**МОВА**

Празрысты звон,
грымотны грукат,
скалісты свіст,
магутны гул —
усе
      разрозненыя гукі
цяклі,
каб зліцца
                  у агул.
Хісталі
      ўздыбленыя далі,
глыбаста білі ў небасхіл.
І ў немату не прападалі,
а западалі і раслі.
І ціш і гром,
і звон і шорах
спляліся
      ніткаю радства,
калі з грудзей,
                              нямых і чорных,
аднойчы мова
прарасла.
1965

## СПЯКОТА

Ацяжалелай галавы
ніяк
сцяблінка не падыме.
І прагнуць ліўню паплавы,
нібы цяля
тугога вымя.
А цішыня,
як партызан,
праходзіць чуйна сцежкай вузкай.
І прагнуць хмарку аблізаць яроў
парэпаныя вусны.
І сонца
з соснаў баравых цярэбіць
сонную ігліцу.
...А дзесьці
дрэмлюць бураны,
а дзесьці
спеюць навальніцы.

## АДКРЫЦЦЁ

Прысняцца
      жоўтыя іконы,
і твары строгія святых,
і перапэцканыя колы
сярод вясновае слаты.
Бы некранутую ажыну,
я адкрыццё
      убачу ў сне.
Яго шукаў я прагай жылаў
і прагай мараў у вясне.
Чатыры крокі па кватэры
праз ноч,
                    няўтульнасць,
                                        забыццё.
О, неразважлівая вера
у будучыню і ў адкрыццё!..
Узнікалі профілі вялікіх
на сшытку, скрэсленым у дым,
дзе запаветныя разлікі
і лічбаў важкія рады.
А то, мінаючы раздзелы
разваг, бяссоння абалонь,
нібыта яблык пераспелы,
само
      ляцела у далонь.
Сусед,
гаворкай падагрэты,
пад шчодрай яблыняй гавеў.
І білі буйныя ранеты
па неразумнай галаве.
А адкрыццё
                    брыло начамі
пад гоман рэчак і асін,
у выпадковасці адчайнай
невыпадковае зусім.
Трывожны лоб.
Сівыя скроні.
Скупы пагляд.
Міжвольны рух.

І прарывалася,
як промень,
і вырывала з цемры круг.
І, адступіўшы ад парога,
вятрыскам
грукалася ў дах...
О, адкрыццё!
Твае дарогі
яшчэ ніхто не разгадаў.
...Ляцяць
гіганцкія арэлі,
азёраў кубкі
і масты,
ды ападаюць на карэнне
начныя цені і лісты.
На твары месяца сляпога
бяссоння
цьмяныя сляды.
Бы першабытны помнік богу,
карчага высіцца з вады.
Сякуць
шалёныя падковы л
угоў напятае крысо...
І кожны момант
выпадковы,
і выпадкова
адкрыццё.
1965

* * *

Які запал!
Які размах!
Які напал азарту!..
Гульня —
і ўраз не да развяг
і роздумы да заўтра.
Трывогу цьмяную ганю
і цені прадчування.
Іду
        ў вялікую гульню
з затоеным дыханнем.
Як неабходна іншы раз
без ветразяў і вёслаў,
забыўшы ўсе:
і кроль, і брас,
аддацца хвалям лесу.
Няхай нясуць,
няхай імчаць,
вагаючы сутонне,
няхай, узняўшы на плячах,
шпурляюць у бяздонне,
а потым соннаю чаргой
прыб'юць,
                    нібы да мэты,
да незнаёмых берагоў
нязведанага свету.
І стане класціся абшар
па стоптанай дарожцы...
Тады я — Бог,
тады я — цар,
тады я — пераможца.
Калі ж надзея падвядзе
і ўдача пройдзе збоку,
калі на мой вясёлы дзень
насунуцца аблокі
і не змагу —
хоць бы ледзь-ледзь —
у справах разабрацца,
я буду ціхенька сядзець
і мудра пасміхацца.

І — усе роўна ў рэшце рэшт:
лунаў ці падаў ніцма,
а проста дыхаецца лепш,
нібы ад навальніцы.

## НЕМАГЧЫМАЕ

Твае бары
у цішы напеўнай
страляюць стромка ўвышыню.
Твая зара
бунтуе гнеўна,
як кроў,
як полымя агню.
Дымяцца горача, як рана,
твае
рачныя паплавы...
Задумай велічную справу
і абвясці:
«Іду на вы!»

Сівы стары хісне плячыма
і, быццам гледзячы ў ваду,
прамовіць мудра:
«Немагчыма,
як два разы быць маладу».

Пакажа доўгія разлікі
і стосы спісаных папер...
А ты ў рашучасці вялікай
яму сягоння не павер.

Не адступаючы ні разу,
твары,
высноўвай
і палай!..
Твая энергія, як лазер,
разрэжа
неба напалам,
праб'е
без грозных грукатанняў
свяціла выпучаны шчыт —
і сумны свет другою гранню
перад табою заблішчыць.
Калі засмужыць часам
вочы

сумненне хмараю сівой,
застынь у роздуме паўночным
сам-насам
                з мэтаю сваёй.

Хай над табой
                агнямі Прэсні
палаюць
                ягады рабін.
Паўстань,
                распніся,
                        уваскрэсні
і немагчымае зрабі!

* * *

Ноч гасіць у вокнах агні
і дыхае ветрам і лёдам.
Нібыта ў рацэ акуні,
ўва мне
касякі мелодый.
А я,
непапраўны рыбак,
з няпэўнай надзеяй на ўдачу
хаджу па нямых берагах,
чакаю,
маўчу
і рыбачу.

## ЧАЛАВЕК

Касматы,
першабытны,
нізкалобы,
яшчэ не чалавек,
упершыню
ён аглядзеў —
загадкавая спроба —
дрымучымі вачамі вышыню.
Яна цякла,
палала,
зіхацела,
уздрыгвала агеньчыкамі зор.
Ён разагнуўся мускулістым целам,
узняўся і —
уражаны —
замёр:
працяты невядомым запаветам,
апалены
высокай сінявой,
нібы Атлант,—
нагамі у планету
і ў нерухомы купал —
галавой.

**ПРАЗОРЦА**

Жаданне жыць...
Любоў і смага...
Што можа быць вышэй за іх?!.
Беззапаветная адвага
з'яднала мертвых і жывых.

У бяседзе з зоркай вартавою
ці не такі ты бачыў шлях —
спаць непрытомнай галавою
на разасланых шынялях?!

**ВОЛЯ**

Раўлі ўстрывожана марціры,
блішчэлі
                    косы і штыкі…
Ішлі па славу камандзіры,
ішлі па волю мужыкі.
І, быццам маятнік,
                                эпоха
ішла размеранай хадой.
А на стале дыміўся бохан,
і ў кубку пеніў сырадой.
І ліцэіст,
забыўшы яву,
чытаў натхнёна Буало…
І пераможцы неслі славу,
і толькі
                    волі не было.

## ВЫТОКІ

Адпачыць ад непаладку,
шуму,
        гвалту,
                калатні
уцякаем без аглядкі
у зацішныя куткі.
Праз лясы сцяжына тчэцца
каляіна,
капыток...
Там маленства чалавецтва,
там пачатак,
там выток.
Там гуляе ў пазалоце
з рыжым промнем дацямна
на вярбе пушысты коцік,
быццам з ніткай кацяня.
Любата...
Брыдзем узмежжам
нетаропка,
без турбот...
Ды прывабіць непазбежна
ў сталасць мудрую
зварот.

## ЭКСПЕРЫМЕНТ

З глыбінь,
як лава з кратэра,
вырвецца распад.
Экс-
перы-
мен-
та-
та-
ры
не ідуць назад.
Азонам вее ў зале
ды лілавее шкло.
Святло,
што вызвалялі,
ім сэрцы апякло.
Учора за гарамі,
цяпер выразна,
тут...
Лаві, кардыяграма,
узмахі амплітуд!
Агні,
дажджы
і здані
вандруюць за сцяной.
Мы плацім за пазнанне
нязнанаю цаной.
А маладому сняцца
усмешкі і руччы...
Адчайна мітусяцца
спакойныя ўрачы.
Загінем — не загінем,
бадай, не ў гэтым сэнс...
Работу,
што пакінем,
наступны данясе.
Такое наша шчасце,
калі далёкі
хтось
праз многа-многа часу

нягучна скажа: ёсць!
...Прыпаў
                    да занавескі
знясілены
прамень,
акамянела
                    вестка...
. . . . . . . . . . . . . . . . .
Жыве эксперымент!
*1967*

* * *

Урал,
        Урал!
І стэп, і мора
табе паіць да скону дзён.
Твой горды дух, бунтоўны нораў
у кожнай кропельцы відзен.
Нібы чаканае развязкі,
нібы з абрыву галавой,
шукаю ўтульнасці і ласкі
у неласкавасці тваёй.
Калі ўскіпіць густое лісце
і цемры ўздыбіцца правал,
нясі мяне, як нёс калісьці,
як нёс Чапаева,
Урал.
Расхваляваны,
                    ў грознай пене,
бушуеш — божа барані!..
Тут не адзін знайшоў збавенне
у спахмурнелай глыбіні.
Ішлі да дна і не ўсплывалі
падзеі,
        воіны,
                    гады.
А ты ўсё коціш-коціш хвалі
і сам не ведаеш куды.
І шлеш пагоню за пагоняй,
з самім сабою не ў ладу.
Нібы каня шалёны коннік,
свой шлях мяняеш на хаду.

...Празрыста ходзіць над прадоннем
напаўзабытае «ура».
Нясі мяне ў сваіх далонях,
ласкавы
                    бацюхна Урал!..

**ШЧАСЦЕ**

Твой недаступны лёс,
музыка,
пасуе велічы тваёй.
Як неадкладную пазыку,
як у глыбіні з галавой,
да ачмурэласці,
да стомы
аддаць усё, усё аддаць
і — неістотнаму самому —
хадзіць,
смяяцца,
уздыхаць.

* * *

Сцюдзёнае паветра разлілося
крыштальнаю празрыстасцю крыніц...
Цябе заб'юць —
і толькі адгалоссе
павісне, як танюсенькая ніць.
Адчайным крыкам
вецер панясецца,
заломяць дрэвы рукі ўвышыню...
А ў дальняй вёсцы
маці
ўстрапянецца
і будзе доўга
слухаць
цішыню.

1967

## ПАГАНІНІ

Гады
змясціліся
ў хвіліне,
рука
прыпала да пяра...
Пара, маэстра Паганіні,
вас зачакаліся.
Пара...
Нашчадкі бога Апалона —
паэт,
музыка
і мастак,
О як вы прагнулі палону,
каб гулка крочыць па мастах,
каб расхінаць, нібы адзенне,
стагоддзі,
далі,
галасы...
Дажджы дрымучыя гудзелі,
нібы зялёныя лясы.
Вятры шумелі
і мычалі,
1 святкавалі ваш палон.
А вы маўчалі,
і начамі
да вас з'яўляўся Апалон.
Густая ціш,
як перад шквалам,
усё самлела —
ні шу-шу...
А скрыпка плакаць пачынала
і развярэджвала душу.
Вы атрымалі, што хацелі,
вы дасягнулі, што маглі.
Але чаму у грэшным целе
таго агню не зберaглі?
Нібы дакор,
які не згіне,
стаіць, захутаны у плашч,

бунтоўны геній Паганіні,
царквой асуджаны скрыпач.
Рука
        камечыла пальчатку,
паліла навалач папер.
О як вы марылі спачатку!
О як вы гаснеце цяпер!..
Трывога...
Воклічы...
Пагоня...
Застаў агні...
Парог...
Радня...
Ніхто не ведае сягоння
дарогі заўтрашняга дня.
Шынкі сустрэнуць,
                                быццам свахі,
і шапаток:
«Любой цаной...»
Нібы марудныя манахі,
ішлі гадзіны за сцяной.
Той адрачэцца,
той загіне,
той хмура
                    сыдзе у труну...
...Неўтаймаваны Паганіні
кранае першую струну.
1968

## ТАМАЗА КАМПАНЕЛА

Падступіць горад Сонца.
Сагрэе халады.
Ў палоне, бы ў палонцы,
жыць 33 гады!..
Спярша прыстане памяць,
пасля не стане сноў...
Раскайваліся, паўстанец,
звяздар і багаслоў.

Падвал ззалелы, гразкі
і маскі цемнаты.
Каму патрэбны казкі,
якія мроіш ты?!
Каму патрэбна мука,
твой д'ябальскі імпэт?!
Не вырвецца ні гуку
адсюль на божы свет.

Прыкідвацца вар'ятам...
Цягнуць надзеі ніць...
Не выбухне гармата,
паходня не ўзляціць.
Пакуль жывы —
змірыся,
скарыся перад злом.
А ў задуманых рысах:
змагаемся —
жывём!..

Свабода, толькі снішся,
ты бітва —
не спакой.
У скамянелай цішы
нічога ад людской.
Тут мёртвы загадзя,
тут сонца рэдкім госцем.
І не саноўны хтосьці —
яно
табе суддзя.

Аб тым, што набалела,
што вабіць не ў пару,
раскажа Кампанела
гарачаму пяру.

Хай вершаць езуіты
пабоішчы і тло,
каб скрозь
                    былі забыты
і розум, і святло,—
дух творчасці не стане
вітаць
        астрожных соў!..
Але ў Святым пісанні
няма такіх высноў?!

Абвіты дзень пятлёю,
працяты дзень ражном...
Ды не згасае тое:
змагаемся — жывём.

Праз ноч,
                    злачынствы,
                                        голад,
праз дым, што узнялі,
заззяе
дзіўны горад,
магчымы
                    на зямлі.

## САКАВІК

Яшчэ навінаю сумненне
і нечаканасцю
азы:
пасля завеі — пацяпленне,
пасля адлігі —
маразы.
Ды свет, заручаны з палётам,
ужо натхнёны,
сам не свой...
Дыханне цепліцца пад лёдам,
буянне —
ў скібе веснавой.

І ўсё наіўна верыць чутцы,
што адыходу
не бываць...
Тым — з-пад завеі не ачнуцца,
тым — з новай сілай
забуяць.

Чый недавер,
чыя нуда,
чыё няведанне сплывае?
Мармыча цёмная вада,
вада празрыстая спявае.

Відаць, далёка завяло —
ау! — пярэдаднем бялёсым
чакаць таго, што не было,
крычаць таму, што не збылося?!.

Яшчэ пад снегам сакавік,
яшчэ не страчана нічога,
і прадчуваецца усклік
неакрыялага жывога.

## ПРАМІЛЬГНУЎШАЕ

Прамільгнуўшую думку шукаю,
прамільгнуўшую думку лаўлю.
Не разгледзеўшы нават —
                                                  якая,
ўсей душой уцякачку люблю.

Як збягаюцца рэкі да мора,
як агонь сярод дыму прыціх —
можа, вернецца заўтра ва ўчора
спасцігаць
                        неспасцігнуты міг.

## РОСПАЧНАЯ БАЛАДА

Быццам грозны круты ледавік
падмінае лясы і абжытыя гроты,
быццам юная курчыцца з дрэў зеляніна лісця —
гэта скардзіцца скарга,
гаруе гаркота:
— Не ўспамінаў хачу я, хачу забыцця.

Ёсць у часе працяг, і даліны, і выямы-груды,
і ўзнясенне — я ведаю іх!..— і абрыў.
— Я хачу забыцця, забыцця, калі ведаць не буду,
што хадзіў, што любіў, што ўсміхаўся, што быў.

Забыцця! Забыцця! Ад шалёных трывог,
ад бясконцых дарог,
ад сляпога кружэння.
На вялікае мноства усіх перамог
дастаткова ўсяго, усяго аднаго паражэння.

Нерухома трываць: не патрэбны ні розум, ні зрок,
і чакаць, і чакаць — праяснення?., змяркання?..
Забыццё б! Забыццё!..
Ці — апошні рывок
да канца, да святла, да надзеі — ў змаганне!..
1969

## НЯВЫКАЗАНАЯ БАЛАДА

Чаромхі горкі пах...
Зялёных дрэў красунак...
Пялёсткі на тваіх губах —
мой пацалунак.

Спяшаўся я і не паспеў:
заспела ранне...
Ляснога ветру спеў —
мае прызнанне.

Прайду дажджом,
з'яўлюся сном,
мільгаў трывожным ценем.
Шум вяза пад тваім акном
мае трызненне.

Куды твой шлях ні павядзе
і я там буду.
Не азірайся
анідзе —
з табой я ўсюды.

Марыя, чуй,
Марыя, стой!..—
варожыць ноч глухая.
А ты бяжыш...
І за табой
бязмоўнае: кахаю!..

* * *

Смуткуе бярозавы гай,
і ясені курчацца ў трансе...
Каханне — куды ты?
Бывай!..
Ідзі...
        не пакінь...
                                не астанься!..
Куды не даходзяць, туды —
у хмарную, горную, тую...—
ўратуе цябе ад бяды,
ад гібелі, можа, ўратуе.
А стуль,
на знямоглым адрэзку,
дзе возера стыне ў труне,
твая незабудная вестка,
што ёсць ты,
                    ўратуе мяне.

1969

## БАЛАДА ПРЫКМЕТЫ

Дзяўчына, каго чакаеш?
Яна не чакае нікога,
у цэлым свеце нікога,
чырвонымі певунамі
яна ручнік вышывае
і не глядзіць на дарогу.
Ды падае на падлогу
клубок яе вышывання...
Прыкмета хлусіць не ўмее,
прыкмета хлусіць не стане
каго прывядзе дарога,
каго прывядзе дарога
у гэты куток маўчання?!
...А ўжо прывяла дарога —
крокі і шум з парога.

Быццам хістаецца лісце,
ўваходзіць ён, гожы станам
вусны крывёй запякліся,
позірк смугой засланы.
Убачыў —
нібы з прадоння,
дыхнулі знямоглыя словы:
— Я гэта... Ад пагоні...
І ўпаў...
Ніхто не нагоніць...
Пасланнік ветру і лёсу,
ён трызніць гарачым боем.
Што ж ты, ці не збылося,
што мроілася — збылося,
дыханне тваё зайшлося,
любая, што з табою?!
Дай моцы ёй, Божа родны!.
Хлопец — яе каханы...
Гэтак неверагодна,
гэтак нечаспадзявана.
Сама сабе не парадзіць,
дзяўчына шчыруе шчырма...
Уцялася ў чырвань гладзі

крыві палымяная чырвань.

Конаўку несла з вадою —
рукі
        апалі
                    ў млосці...
Ну што ты, ну што з табою,
няўжо адною хадою
яшчэ завітае хтосьці?!

І гэтак сэрцу балесна,
нема — адчай напяты.
...Стала ў хаце цесна,
стала цесна ў хаце —
смерць
        увайшла ў хату.
1969

**ДРЭВЫ**

На ўсход
гарлапаняць пеўні,
а захад,
як боль,
прыціх.
Губляючы вас, напэўна,
губляем сябе саміх.
Пляліся рукамі людскімі
і лапці,
і кашалі...
Вы нашы браты,
якія
па нашых слядах не пайшлі.
Вы засталіся шумліва
расці ўвышыню і ўглыб,
каб рушылі мы шчасліва
дарогаю птушак і рыб.
Мо быў бы наш крок дарэмны
і ўсхліпам быццё сплыло,
калі б,
паміраючы,
дрэвы
не слалі сваё цяпло,
калі б не паілі нас ветрам
у душныя ночы і дні,
калі б не ішлі у нетры
шурпатыя іх карані.

О як хрустальна штогод
звінела лісцё
і каралі...
Ды ў час шалёных нягод
яны разам з намі
ўміралі.
Закручаны рух учарашні
І заўтрашні
ўшчэнт,
да вузла...
Нам дзіўна,

нам горка,
нам страшна,
што вы не трымаеце зла.
Сякера звінела і секла,
ды шчодры,
як брага,
азон...
Пашчасціць —
у самае пекла
шпурне нас вар'яцкі разгон.
Вяртаемся беспераcтанку,
як хворыя,
зноў і зноў
да вашае калыханкі,
да шэпту зялёных слоў.
Вы нас разумееце моўчкі,
нам большай любві не сустрэць...
А красак дасціпныя вочкі
нам будуць у вочы гладзець.

Расхрыстаны,
перамогшы,
дыхае лес пад дажджом.
Мы ваша цвіценне ўбярогшы,
тым самым
сваё ўберажом.

**ЛЕС**

Там — лес
блакітны па лісці.
Ён задумбны,
незнаёмы...
Мне ў лес блакітны
не ўвайсці,
калі ўвайсці —
ўвайсці ў зялёны.
Іх між сабой не прыміру,
яны не хочуць прымірэння,
непадуладныя пяру
у прастаце пераўтварэння.
Але, ступіўшы ў пераплёт,
адкуль
не выберашся квітам,
святкуй асмужаны палёт
між зелянінай і блакітам.
Упарта зменлівы
і скрытны,
не захаваўшы дробных рыс,
сябе самога лес блакітны
трымае зводдаль,
як сюрпрыз.
Ён —
дзе зямля ўпадае ў схову
і дзе нябёс круты абрыў,
каб быў зялёны дастаткова
і тут жа ўсё-такі не быў.
...Развёўшы рукі, лес сустрэне.
Усе сумненні абсячэ.
Праз пальцы
пырскамі струменя
лісцё зялёнае сцячэ.
Сыдзі ў пахмурае глыбока,
да самых дробязяў
сыдзі.
Цябе нідзе не згубіць вока
твайго дарадцы і суддзі.
Пакуль пагроз няма скуль чуць

і блізкі вецер не скавыча,
мо прыадкрыецца чуць-чуць
яго істотнае аблічча.
Лістом даткнецца да шчакі
ён,
ад якога не адрокся.
Тут, як сафізмы — ваўчакі,
баравікі — як парадоксы.
І, не ствараючы законаў,
але стварыўшы запавет,
падыдзе блізка свет зялёны,
адыдзе ўдаль блакітны свет.
1969

## ЗАПАВЕТ

Надломы — не яму надломы,
пярун — і гэта не яму...
Уздымацца дрэву маладому,
мацнець
                        праз лета і зіму.

І захаваць не проста звесткі,
а запавет на ўсе часы:
тады выстойваюць падлескі,
калі выстойваюць лясы.

## РАДЗІМА

Радзіма, да цябе з мальбой
і нараканнем
                    не скрануся.
Я ў весялосці не з табой,
з табой у роздуме і ў скрусе.

Высвечвала бяздонным дном,
ў акно ўзіралася з'інела,
і ведзьмавала туманом,
і летам бабіным звінела.

Калі будзіла весялосць?!
А прахаплюся — ты ўсе будзіш.
І мне няўцям, адкуль ты есць,
адкуль пасля з'яўляцца будзеш.

Ты не ўмяшчаешся ў куток,
дзе трызніць Буг, дзе Белавежа...
Тваё не вызначыць мне межы
і не намацаць твой выток.

У свет балючы дабяла,
у снежны свет, мае усходы
ідуць: там ты... там ты была!..
Ты ўся наводдалі заўсёды.
1970

## УЗЫХОД

Мо пярэдадзень,
мо здзяйсненне,
можа, захад,
можа, ўзыход —
хай буяе тваё цвіценне,
ззяе сонцам твой умалот.

І ў расчыненым насцеж прадвесні,
і ў прадвосеньскім забыцці
ты самога сябе, як песню,
светлай будучыні прысвяці.

Прысвяці без астатку,
па праву,—
на прасторы сябе перамнож —
як зямля прысвячаецца травам,
як зямлі прысвячаецца дождж.

Прысвячэнне, а не прычасце,
не прамежкі —
падзенне меж...
Жывучы ў адваёваным часе,
і для іншага часу жывеш.

Так і будзе —
прад самым замахам!..
Так і ёсць —
абрываецца год!..
Туманом цябе ўхутае захад,
і палоскаю
блісне ўзыход.

## ПАЧАТАК

Усе хутчэй,
усе хутчэй,
адчуўшы волю,
ад парога!..
Так пачынаецца ручай,
так пачынаецца дарога.

Неўладкаваных дзён разлад –
адчай у позірку —
прыесца.
І немагчыма ўжо назад,
і немагчыма ўжо на месцы,

Туды, сабе наперакор,
насустрач вечнаму расстанню,
дзе замыкаецца прастор,
дзе абрываецца хістанне.

Ісці,
мінаць вясновы тлум
і лістападу галашэнне,
ад задумення — да задум,
ад першых спроб —
да завяршэння.

Ў адзіны голас галасы
сальюцца,
вымкнуць галасамі...
Так пачынаюцца лясы,
так пачынаемся мы самі.

* * *

Не распнутае доляю ўбогай,
не пранізанае свінцом,
абкладаецца сэрца аблогай,
заціскаецца жорсткім кальцом.

Зайчаня маё, сэрца, бяжы,
затаіся дзе-небудзь,
замоўкні...
Гэта восень на рубяжы,
лістапад зазірае ў вокны.

Перагледжаны тайнікі:
можа, там ты,
і ў каруселі
з дрэў бязмоўных твае двайнікі
спапялёныя абляцелі.

У тузе, у смузе, ў балянванні,
ў свеце сонечным і сівым
пільна цягнецца паляванне
за намацаным сэрцам сваім.

Трапяткое стварэнне прыгоды,
усяісная сутнасць біцця —
удыхнула дыханне ў прыроду,
небыццё узняло да быцця.

Мысліць воблака і зіма,
мысліць возера і дарога...
Ды няма ў іх, няма ў іх, няма
неспасціжнага сэрца жывога.

Як бянтэжыць між звыклых трапецыі
між настылых канструкцый, між...—
што калоціцца і трапеча,
нетутэйшае... Богам звыш...

Утаймоўваюць пераплёты,
і бяскрылы мкнецца закон
збіць высокае неба палёту,

супыніць ашалелы гон.

Грукачы, грукачы, грукачы,
уцякай у туман,
у бязмежнасць...
Раскрычаліся крумкачы,
абвяшчаючы непазбежнасць.

Буду — хваля свайго адплыцця,
буду — попел,
                    развеяны ў смерці,
грукат сэрца, жывога сэрца
ўздыме нанава да быцця.

**ПЫТАННЕ**

За абрывамі дня пагрукочвае гром,
навісае палац,
вышынёй азароны...
А сцярожкім дваром,
                    нерухомым дваром
ходзіць Гамлет — наследнік кароны.

Можа, заўтра ляжаць давядзецца ў труне,
мо наліта атрута, адкладзена шпага,
што прызначаны мне,
што сумуюць па мне...
Неспатоленай скончыцца смага.
Я рашаю ўвесь час і ўвесь час не рашу...
Ці ўся мудрасць зямлі —
                    развважаць без адказу
 Іраніст і вар'ят,
ён хавае душу,
як у музыку, ў мройную фразу.
Наплывае, бы сон,
                    свет прасторы і кроз...
Дык навошта туга, калі ёсць летуценні,
дык навошта жыццё, беспрытульнае скрозь,
калі ноччу блукаюць нятленныя цені?!
Пакаранне за здраду —
зноў здрада і грэх?!.
Ды калоціцца помста ў прычал і прыпынак.
Вы шукаеце шчасця,
шукаеце ўцех —
ілюзорныя пошукі...
Ёсць паядынак.
Засцярога...
І боязь...
І ўсхліп...
Не спіце...
Там— удары стыхій, там — дажджу лапатанне...
Адыходзіць жыццё,
без адказу жыццё,
ды любоў, ды любоў яму ўся за пытанне.
1970

* * *

Сачу вясну.
Жыву ў Міжбор'і.
І два бары, як спарышы,
між дыялектыкай надвор'я
і дыялектыкай душы.

Прачнуся сцішаным світанкам —
на шыбах вільгаці налет.
Гадзінай шарай да сняданку
крышу збуцвелай пешняй лёд.

Зайздросна жыць пераканана,
счапіць ватоўку гапліком
і знаць, што ўжо нагатаваны
аладкі з кіслым малаком.

Туман нябачна нойдзе ў сені,
ён і вакол, падманны газ...
Я разумею праясненне
як вырашэнне і адказ.

Іду-брыду...
Настрой прыўзняты,
і ўзняты сцежкі — шво на шво,
і светла мроіцца пра свята...
А свята часам тым прайшло.

І дзень — на схіл,
і сам бы ў змане,
світанкі быццам па вадзе...
Ды зноў пярэдадзень паўстане,
бор да Міжгор'я прывядзе.

* * *

Іх далячыні развялі,
і хоць трагедыяй — адведка,
сумуе ястраб па зямлі,
па вышыні
сумуе
клетка.

Як апякае рану ёд,
як высь аблытваюць цянёты
не мае сэнсу сам палёт
без перашкодаў да палёту.

Няхай пачатку страчай след
ляціць працяг,
і час у сведкі,
што знітаваны гэты свет
саюзам ястраба і клеткі.
1970

* * *

Адно сказаць,
як пішацца — пішы,
не мудрагеліць,
слухацца натхнення...
Кляймення адзнакаю душы,
тваімі стануць гэтыя імгненні.
Пішы —
і паслухмяная рука
накрэсліць знакі,
словы занатуе
і перадасць пульсацыяй радка
суіснасці пульсацыю крутую.

Магчыма, справядлівы меркаванні:
і тэму ўзняць,
і рух адлюстраваць...
Ды кожны раз твае выратаванне
і клопат твой — як пішацца, пісаць.
У двух часах
з сумненнем і надзеяй,
у двух часах спыняюся, бягу...
Але заўжды
па-новаму не ўмею,
а па-старому ўмею —
не магу.
Што застаецца нам ад летуценняў,
што самі пакідаем мы ў жыцці?
Адно сказаць —
прыйшлі б у час здзяйсненні,
а іншае —
самім да іх прыйсці.
Самаахвярны клопат
блаславёны.
Не згіне свет з адмецінай душы...
Ёсць рацыя сказаць:
жыві натхнёна
і паўтарыць:
як пішацца — пішы.
1971

* * *

Каб не пакінуць успаміну,
а забываць усе гады —
было сысціся на хвіліну
і разысціся назаўжды.

Было ўзірацца ноччу белай
ў акенца, бачнае ледзь-ледзь,
каб зараз колішняй, няўмелай,
сваей душы не зразумець!..
1971

* * *

Калі мы проста былі знаёмыя —
было ўсё проста:
сустракаліся, як давядзецца,
гаварылі, што давядзецца,
так, пра клопат, пра дом, дарогу...

Калі мы проста былі знаёмыя —
мы былі як лісцё вясною:
ні мінулага, ні ўспамінаў,
толькі будучыня
і ўзаемнасць.

Калі мы проста былі знаёмыя —
непатрэбна было нам ведаць,
што збліжэнне, як разбурэнне,
небяспечна і незваротна,
што наноў знаёміцца цяжка,
немагчыма амаль...

Калісьці
мы з табой былі проста знаёмыя.

* * *

Усюды голас твой чуцён,
і пасплятаціся галіны...
Не пакідай мяне,
жыццё,
і я нікога не пакіну.
Не забывай...
Любі...
        Калі ж
скранецца значнасць дыялога
мяне да існага наблізь,
яму вярні мяне самога.
Вазьмі назад свой вешчы дар,
вярні ў інакшыя надзелы...
Як сон,
                    заблытаны гушчар,
сны гушчароў незразумелы.
І здзірванела
                    з-пад рукі,
мае ўбіраючы пратэсты,
жывуць сцяблінЫ,
                              як радкі
недасягальнага падтэксту.
Я іх маўчаннем гавару
і трызню іхнім задуменнем,
каб стаць у спелую пару
іншабыцця увасабленнем,
каб свой узрост перарасці
перад свядомасцю бязмежжа
і распазнаць,
                    чаму належу,
што мне належыць у жыцці.

* * *

Усплёскі
                        вады і вербаў
і промняў разводны нахіл —
хваля даверу.
Праменны
вечарам небасхіл.
Крылы нібы трымцелі,
цені нібы брылі,
выклікання да нечага,
запеньваліся бруі.
І прападалі
                        навечна,
і быў глыбокі спачын...
Чыім хаценнем — рэчка,
дыхаць цішком — чым?!
Засведчаныя,
                        маўчым.
Здранцвелае разуменне,
што іншае ўсё — прычым
і нашае ўсё — ўзаемна.
Выспелы дзень.
Век белы —
помні... жыві...—
згарыць.
Чый абрыс спахмурнелы
воблакам угары?
Наспее...
Што жывіць і поўніць
і помніць мяне — пазнаю...
Слухаю, анямелы,
нечую споведзь сваю.

## АРЫШТ КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА

Аблога...
Крокі...
Ляск...
Прыцемненыя сцены,
і дрогкай свечкі бляск,
і на парозе цені.
І месяц паўз акно
слізне, як паражэнец —
на схіл усе адно...
Як зваць вас?
Вітажэнец.
Утойваюць муры,
сцярожкі бор таемны
да іншае пары
імя яго нядрэмна.
Да іншае пары
пакінуты сякеры,
да іншае пары
сышлі касіянеры.
І запазычай край,
і аціхаюць знічы...
Хавай,
хавай,
хавай
сапраўднае аблічча!
О, наступ нематы —
нябога... выраджэнец...
І ўжо знікаеш ты...
Няма ўжо...
Вітажэнец...
Ні вучняў, ні сяброў...
Сарвецца шлях памалены...
Як волю і любоў,
дае нам час імёны.
Учэпяцца...—
з пятлёй —
не выбіцца...—
ажэняць...
Па той бок — што па той?..

Па гэты —
Вітажэнец.
Заўжды — адзін адказ,
утойванне... змяншэнне...
Але прыходзіць час
імя і ўваскрашэння.
Усе ніці у сувой,
у заклік пагалоскі
з'яднаць —
                    і стаць сабой!..
Як зваць вас?
Каліноўскі.
1973

## ПАПЯРЭДЖАННЕ

Час абарваны...
Сню нябыт...
Абрабаваныя пагляды...
Нібы сплывае ў плыні плыт,
срабрыста свеціцца спагада,
і ззяе захад залаты,
і сны расплаўленыя
                    паляць...
Распеpазаныя плыты —
сплывае спадчына і памяць.
І праступае праз зеніт
крыж зорны
ў зорным карагодзе...
А мне і долі —
сню нябыт —
крыж Богшы Лазара ўзыходзе.
Рукою творцы і суддзі
да судных дзён,
                    каб, быццам раны,
смылелі словы —
не ўкрадзі
і не аддай! — занатавана.
І славу — прэч,
і ўцеху — прэч...
У змрочнай пільнасці астралу
цябе дзялілі зман і меч,
а папярэджанне вяртала.
У камянях хаваўся след,
і пераймалі футаралы,
і зацінаўся бранзалет...
А папярэджанне вяртала.
Няўжо не вернешся цяпер?
Ці ўжо няма куды вярнуцца?!
І толькі цягнецца няўцерп
час абарваны...—
звёны рвуцца.
Былы і новы парадні,
злучы ў адзіную сцяжыну!
Якая скруха дзень пры дні

цябе праводзіць на чужыну.
Якая бездань — не змагчы,
не памагчы,
не ўзяць з палону...
Не лес выносны — а карчы...
Што прызначалася для плёну?
Што лес паклаў?
А з мітульгі —
у перападах не прыстала —
прадвесце славы і тугі
глядзіць маўклівая Прадслава.
І той жа зор, і той жа твар...
Я сню нябыт.
Якое ранне
адзначыў зорны каляндар?!
Гняце няпамяці цяжар.
Праменна свеціцца вяртанне.
1973

# ПУНКЦІРЫ

*
Залевы.
Дражняць міражы.
Гудуць вятры пры падыходзе...
Мы кожны дзень на рубяжы
былых і будучых стагоддзяў.

*
Калі ўсе згублены ключы,
калі ні шанцу,
анічога —
усё ж ідзі,
любі,
крычы
і пасягай на перамогу.

*
Не вернецца воін,
вандроўнік не вернецца,
вернецца сейбіт...
Заўсёды
вяртаецца сейбіт.

*
Што будзе з намі? —
клінам свет.
Што будзе з ім? —
няўжо дарэшты?..
Гасподзь не ведае як след,
Гасподзь вядзе эксперыменты.

*
Вядзе, закружвае віццё
турботаў,
хмелю,
пуцявінаў.
І папярэдняе жыццё
усё глыбей,
у сарцавіну.

*

Адшчыкну вугельчык ад палена
перакідваць з далоні на далонь...
Замірае, дыхае нятленны
спадарожнік, продак мой — агонь.

*

Мінула, знікла...
І ў траве
прамень бязбоязна іграе.
Але мінулае жыве,
яно за намі назірае.

*

Ды ёсць яшчэ прастор далёкі
і сцежка — доўгая, бы ўздых...
Ты сам з сабой не адзінокі,
а між людзей: куды ж ад іх?!

*

Развей няведання туман
і адкажы нам,
непазбежнае,
ці гэта час належыць нам,
ці гэта мы яму належныя?

*

Я іх прыдумаў:
абавязкі!..
Я іх стварыў, я гаспадар,.
Мне надакучыла іх ласка,
іх непрадбачаны цяжар.
Не адпускаюць абавязкі.

*

Шукаем ісціну.
Сцюдзёна
яна ў азоне і ў вадзе...
Яе не знае здавалёны,
яна сасмяглага вядзе.

*

З дзівотнай вечнасцю ў хаўрусе
да супярэчнасцяў прывыкну.
Застацца каб! — не застануся.
Бясследна знікнуць бы! — не знікну.

*

Тут толькі лета і зіма,
світальны позірк,
сон глыбокі, і
белаплынныя аблокі,
і міг, што быў
і ўжо няма.

*

У гэтым лесе,
на гэтай зямлі,
нечакана безабаронны,
буду пакутліва ўспамінаць,
як падаюць дрэвы.

*

Спазнаць —
спазнаеш разважанні,
трактаты, дні, календары,
спазнаеш круг і скрыжаванне,
спіраль...
А ісціну — ствары.

*

Здасца, што ўсё ўжо было:
позірк, пяшчотны і чулы,
сонца ў лісці і крыло,
што ўвышыні мільганула.

*

Чые сляды засыпала пяском,
чые сляды травой пазарасталі.
Нібы мы памыляемся —
прырода
сцірае чалавечыя сляды.

*

Каб дачакацца,
не хапіла хвіліны,
каб назаўсёды расстацца —
хапіла якраз
хвіліны.

*

Прыйшла —
туман на мураву —
звінець,
ах, восень,
ганарыцца...
Сланечнік згубіць галаву,
празрыста ясень загарыцца.

*

Паміж дзвюма бяздоннямі
маўчання пульсуе думка —
голас пра маўчанне.
Людзі,
аблокі,
дрэвы,
з якімі ў мінулым расстаўся,—
няма да каго вярнуцца —
таксама з мінулым рассталіся.

*

Магчыма, выслалі лісты на доле
і напісалі птушкі на аблоках
фармуліроўку вечнага закону,—
адлёт і одум —
восень наступае.

*

Перакладаю шэпт дажджу,
пагляд вачэй,
трымценне гаю...
Кранаю,
слухаю,

гляджу,
я не пішу — перакладаю.

*

Няма звароту у маленства...
А хвалі — блізкая радня —
завабяць, знойдуць падабенства...
Але гняце нас глыбіня —
няма звароту у маленства.

*

Свет у аблозе навальнічных хмараў,
агеньчык у аблозе цемры —
крык не праб'ецца,
скамянее сказ...
Як выказаць цябе, маё маўчанне?

*

Перажыву —
і сны, і дзеі,
і шчасце (вышай галаву!..),
і здрады ўдар, і час надзеі,
і сэрца плач...
Перажыву.

*

Блакіт нябёсаў,
луг стракаты
больш не узрадуюць таго,
хто страціў сэнс.
Бо сэнсу страта —
то, пэўна, страта усяго.

*

Як пехацінец долу сціх,
уцяўся ў жвір,
ніхто, ніякі,—
перачакаць бы гэты міг,
уберагчыся да атакі.

*

Паміж усім на зямлі
дзве адлегласці:
паменшыцца адна —
павялічыцца другая...
Калі мы далёка — блізка,
калі мы блізка — далёка.

*

Вярнуць... вярнуцца б
позьнім госцем
у юны свет,
у маладосць...
А хто захоча ў маладосці
застацца гэтакім, як ёсць?!

*

Самыя грозныя пытанні —
простыя пытанні.
Іх вылепваюць дзеці:
навошта? чаму? калі?..
Ды сплываюць пытанні,
праходзяць пытанні,
застаёмся адны мы.
Пытанні былі...

*

Ляцяць —
праз леты... зімы...
о птахі,—
дзень і год...
Ім не зямля радзіма,
радзіма ім палёт.
Блукаюць сны
у лабірынце розуму,
і ў снах
блукае розум —
шлях людскі.

*

Прыкмеціць позірк
хмары і абсяг,

учуюцца зацішша, бездыханне...
І толькі думка,
вымкнуўшы маланкай,
знітуе ўсё
і рынецца ў бязмежжа.

*

Дарога дадому...
Усе дарогі,
якімі хадзіў і ездзіў,
убірае дарога дадому.

*

Выбіўся з рытму часу —
падаю
ў бездань часу.

*

Піць малако...
Не ведаць млосці,
не вандраваць па гарадах,
быць маладым у маладосці
і памяркоўным у гадах.
Піць малако.

*

Бядую: страта,
радуюся: страта...
Воўк-санітар —
нас насцігае страта,
і неадступна гоніць,
і ніколі
не ведае ні літасці, ні жалю —
усё слабое забірае страта.
Бядую: страта...
Радуюся: страта...

*

Аднойчы,
калі закончу ўсе справы...
О, колькі трэба зрабіць,

калі закончу ўсе справы!..

*

А стоміцца сонца, і неба
туман апануе густы —
акрыюць азяблую глебу
налітыя сонцам лісты.

*

І дрэва —
барва і прагалы —
лісты крамяныя свае,
якія ўчора ўберагала,
цяпер самохаць аддае.

*

Г олас клікаў —
таму прыходзіў...
Замаўкаў ён,
калі прыходзіў.

*

Чакаюць навальніцы хвоі —
а навальніца вызначыць абраных,
якія упадуць ад перуна.

*

Праз момант і праз век
вяртае рэха,
вяртае рэха слова,
думку,
жэст,
вяртае нас саміх...—
так помсціць рэха.

*

Дзіўная бітва —
з бязмежнасцю,
і дзіўны рахунак
у бітве з бязмежнасцю —
не перамогшы,

загінуць волатамі.

*

Век хуткасцяў, век паскарэння
хутчэй,
няспынка,
назусім...
У будучыню, у азарэнне,
мы, быццам падаем, ляцім.

*

Сярод усіх вятроў
адзін спадарожны.
Сярод усіх шляхоў
адзін незваротны.

*

Куды? Адкуль?..—
маўчанне.
Не дасць адказу час.
Стаю — і сам пытанне,
іду — і сам адказ.

*

Паўхвілі да ратунку —
і жыццё —
гады...
дзесяцігоддзі —
ўсё жыццё
знячэўку пераважвае паўхвілі.

*

Усё мы маем —
пільным вокам
акінь зямныя берагі...
Але адзін памрэ ад спёкі,
памрэ ад холаду другі.

*

Праб'ецца даўні запавет —
і стане цяжка,

стане дрэнна...
Але ужо не марны свет,
і шлях, і клопат недарэмны.

*

Адменная чарга —
чарга дарогі,
восені,
задумы...
І нават выпадак,
і нават непазбежнасць
марудзяць
і пільнуюцца яе.

*

У вечаровым аўтобусе
чуваць урыўкі людскіх размоў...
Зрэшты, усе размовы
урыўкі чагосьці.

*

Кружацца ўвышыні буслы —
неўзабаве вырай.
Пазіраем на іх —
і паглядам адлюстраваным
бачым сябе.

*

Наведваюся ў мясціны,
дзе ўжо некалі быў,
і не ведаю, як растлумачыць
дрэвам, людзям, сабе самому,
што ўжо мяне двое,
і не ведаю, чым запоўніць
прагал паміж мною гэтым і тым.

*

Не сплю. Адліжна. Поле
туманіцца ў акне.
Міжчассе — ў наваколлі.
Міжчассе — ува мне.

*

Нікога,
хто ў тэты свет прыходзіць,
не абыходзіць доля:
атрымліваюць усе без вынятку
два найвялікшыя падарункі —
жыццё і смерць.

*

Спазніўся ўстаць
і спазніўся легчы,
спазніўся пачаць работу
і спазніўся скончыць —
і пачалі мяняцца
месцамі дні і ночы,
вынікі і прычыны,
і я апынуўся насупраць самога сябе.

*

Смерць косіць салому —
зярнят скасаваць не можа:
ратунак у лішку.

*

Карэнне і лісцё.
Бальшак жыцця зямнога.
Цябе сустрэне Ўсё,
а правядзе Нічога.

*

Як стары мудры вуж
шукае вузкае выйсце,
каб скінуць старую скуру —
так і я патаемнай вужовай натурам
шукаю сабе перашкоды,
хоць і пярэчыць гэтаму розум.

*

Гукаю цябе ў мінулым,
гукаю цябе ў наступным —

ты адгукаешся рэхам
майго гукання.

*

Сустракаюся ў думках з тымі,
каго няма побач.
Для кагосьці
і я таксама ўспамін,
для кагосьці
і я гэтаксама думка.

*

Час —
калі адна мэта
слухаецца другую.
Бясчассе —
калі замінае
кожная кожнай.

*

Такі рухавы малы:
амаль што выслізгвае са свету,
такі нерухомы стары:
свет амаль што выслізгвае ад яго.

*

Навокал пратaліны.
І толькі тую сцяжыну,
якой мы заўсёды хадзілі з табою,
не адпускае зіма.

*

Сярод гамонкі анямець,
з паўтораў выбіцца,
з кружэння,
і — бы ўваскрошання — хацець
сабе не ўдачы —
паражэння.

*

Сяджу дома —

не падарожнічаю, не вандрую.
Падарожнікі апавядаюць
пра свае ўражанні і назіранні —
назіраю адно за імі.

*

За крок да ўдачы
спынюся,
за хвіліну да перамогі
паглыблюся ў одум...
Сябры ўздыхнуць і адыдуць прэч,
жыццё ўсміхнецца і спыніцца побач.

*

Усё мінае, - сказаў мудрэц,
і ўсе з ім згадзіліся.
Аднак засмяяўся непадалёку дзіцёнак,
і ўсе, азірнуўшыся, успомнілі:
і настае.

*

Снег растае.
Шкада —
і яго,
і сябе чамусьці.

*

Сакавік.
Усё паварочваецца ў наступнасць.
Праз чорнае голле блішчыць
вострыя маладзічок.

*

Вяртаюся да ранейшых размоў,
да ранейшых сустрэч,
магчымасцяў і абавязкаў —
каб узяць тое, чаго не ўзяў,
каб пакінуць тое, чаго не пакінуў.

*

Я — рака.

Цяку ад таго, дзе быў,
кім не стаў...
А яно даганяе мяне берагамі.

*

Калі твая будучыня
сумесціцца з будучыняю сусвету –
усе словы дарэчы,
усе ўчынкі да месца,
усе стрэлы ляцяць у цэль.

*

Азірнуўся —
нехта бяжыць па маіх слядах:
сухое лісце.

*

Адкрывае абсяг
думка-голас,
а думцы-бязмоўю
адкрываецца неабсяжнасць.

*

Асеннія хмары. Імжа.
Няма куды больш спяшацца,
няма куды больш пасяваць —
суцяшае дождж.

*

Выбег на сцежку
няўрымслівы дзьмухавец
і разгубіўся:
што будзе?!

*

Хіба іду зямлёй?!.
Іду сабой —
бесперастанна сцелючы пад ногі
свой цень,
свае намеры,
свае мэты.

*

Аблётваюць буслы зямлю кругамі,
каб увабраць яе ў сябе дарэшты
і скіравацца,
вольнымі ўжо,
ў вырай.

*

Дом знеслі.
Застаўся сад.
Як пастарэлі адразу дрэвы!

*

Людзі
глядзяць у будучыню,
мінулае —
на людзей.

*

У лесе пахмурым
бярозы —
белыя паланянкі.

*

Маленства:
пад шэраю глебаю
жоўты пясок —
радовішча залатое.

*

Ёсць лепшыя за мяне,
ёсць горшыя,
але сам я
ні лепшы, ні горшы —
адзіны,
угледзьцеся...—
чалавек
моўчкі кажа людзям.

*

Вулічныя ліхтары —

ці начныя сонцы:
той самы цень
ляжыць на тым самым месцы.
Каб зразумець сябе —
думка
дзеліцца ка дзве долі:
адна становіцца паляўнічым,
другая — уцекачом
і спасцігаецца,
калі гіне.

*

Стаю перад кніжнай паліцай,
гляджу,
не чапаючы іх,
на кнігі —
чытаю сваю душу.

*

Бабуля з пад'езда:
усё цяжэй ёй спускацца па лесвіцы,
усё цяжэй падымацца,
усё цяжэй заставацца дома.

*

Марафон:
бягуць
людзі навыперадкі
са сваім целам.

*

Адчыняю паштовую скрынку:
газета, часопіс, ліст...—
усё, што было і раней дагэтуль.
А кожны раз
чакаецца вестка.

*

Напярэдадні Новага года
шлём свае віншаванні-зычэнні небу,
а яно — ўсёй зямлі:
сняжынкі.

*

Дрэва:
крывыя галіны,
крылатае лісце,
скрытыя карані.

*

У дзедавай вёсцы:
гляджу на аблокі —
бачу людзей.

*

Пад шэрым небам
між шэрых палёў
зялёны агонь надзеі:
палетак руні.

*

Сосны: ўзышлі на самы
высокі пагорак
і вось разважаюць:
куды далей?

*

Той крок,
якім я не здолеў
ступіць напрасткі,
ператвараецца ў мноства крокаў
па крузе.

*

Блукаю
па горадзе незнаемым.
Ніхто мяне тут не спаткае,
ніхто не пярэйме,

ніхто не скажа:
ты сёння не гэтакі, як звычайна.

*

Раніца.
Дворнік мяце тратуар —
ніяк не патрапіць
змесці свой цень.

*

Я там ужо быў,
і гэта я ўжо рабіў,
і тое ўжо зведаў...—
стаю сярод белага дня
з жыццём ашчаджоным
для невядомай справы,
для невядомай думкі
і для невядомага дня.

*

Канчаецца лета:
лісце
туліцца да галіны,
галіна — да дрэва,
дрэва — да каранёў,

*

Снег растае —
а тэтак
шмат абяцаў,
калі падаў.

*

Як бы ні мкнулася дрэва
у неба,
яно ўсё роўна не дасягае
неба...
Але, магчыма,
ніякага іншага неба няма,
апроч самога імкнення.

*
Калі ўсё наўколле
я ведаў на памяць,
тады ўзяў у павадыры
незнаёмага чалавека —
і сцежкі скрануліся і павялі
ў невядомасць.

*
На адну шалю вагаў
паклаў я хлеб,
на другую — камень,
але калі яны ўраўнаважыліся,
не змог
паверыць, што важыць хлеб
гэтулькі ж,
колькі камень.

*
Сцежка па-над абрывам:
па ёй прывабна ісці,
на ёй кожны крок
змястоўны.

*
Парастак, што прабіўся
праз пласт асфальту,—
усе пешаходы
табе саступаюць дарогу,
быццам вялікаму дрэву.

*
Дрэмле на летнім дажджы
спутаны конь —
спутаная прастора.

*
Праехаў з канца ў канец
увесь горад.
Трэба вяртацца:
прыпынкі

адлічваюцца наадварот.

*

Над небакраем акрэсліўся
жоўты ветах —
вушная ракавіна
нематы.

*

Думаў аб вечнасці.
Чорна-чырвоны матыль
прыляцеў,
сеў мне на руку,
стаў думаць разам са мною.

*

Скача па сцежцы
перад дзіцяцем
нязграбны вялізны грак:
не хочацца лётаць?

*

Што ўбачыў
я ў горадзе іхнім за дзень —
распытваюць гаспадары,
быццам самі
яны ўжо не могуць убачыць
таго, што ў ім ёсць.

*

Сярод красамоўных кветак
знямелы сівы палын:
ён адзін
чуе і разумее,
што кажа лёс.

*

Сівітае,
Першай убачыла гэта зорка,
што пагасіла сваё святло.

*

Стаю ў вялізнай чарзе.
Перш, чым з апошняга
стану першым,
пабуду ўсёю чаргой.

*

Летні раптоўны дождж.
Я прытуліўся
да ніцай вярбіны —
і мноства лістоў на міяне глядзела,
нібы здзіваваныя вочы.

*

Нехта назваў уголас
маё імя.
Хвіліна —
і зноў яно стала
тым, чым было заўсёды:
голасам цішыні.

*

Паслаў у прастору думку,
апамятаўшыся — другую...
Што робіцца зараз там,
у абсягах вашых,
думка-крумкач
і галубка-думка?!.

*

Старая бярэзіна
ля акна —
світанак,
што доўжыцца цэлы дзень,
што доўжыцца цэлую вечнасць.

*

Непрыкметны прахожы —
як ён стараецца стаць
яшчэ больш непрыкметным,
каб людзі не заўважалі,

што ён зняможаны
і стары.

*

Заляцела ў пакой пчала —
зумкае,
б'ецца ў шыбу
і не знаходзіць выйсця.
Гэтак і мы?!.

*

Уздоўж начнога перона
такія самотныя ліхтары,
быццам прыйшлі
кагосьці праводзіць
і не могуць успомніць — каго.

*

Афарбавалі ў парку
замшэлы валун —
і памерлі
стагоддзі.

*

Зноў выпадкова сустрэўся
з адным выпадковым сустрэчным:
хіба
ён па-ранейшаму незнаёмы?

*

Пеўні,
пазвязваныя матузамі:
іх прадаюць —
а яны спяваюць.

*

Нехта надзвычай знаёмы —
быццам світала ўваччу —
набліжаўся насустрач.
Ах, тэта проста
жаночая прыгажосць.

*

Жывём пад высокімі дрэвамі —
вышэйшыя за саміх сябе
на вышыню дрэў.

*

Машыны глядзяць
вачамі людзей,
людзі — вачамі машын:
ці знойдзем
дарогу ў наступнасць?!.

*

Дождж напаіў зямлю —
і вочы
расплюшчыліся ў зямлі
і ўбачылі неба.

*

Стары мураваны дом:
становіцца ён з гадамі
усё больш адметны,
усё больш сапраўдны,
усё больш жывы.

*

Дзівосныя рыбіны — уначы
плаваем у бязмежжы, а ўдзень
блукаем па сушы, шукаючы ў ёй
рэшткі страчанага бязмежжа.

*

Паўрасталі ў зямлю
замшэлыя камяні
з незразумелымі літарамі:
на зямлі
нікога не засталося,
хто змог бы іх прачытаць?!.

*

Спрачаюцца людзі ў чарзе,

а ззаду,
за ўсімі,
стаіць самотнае неба
і ўсім уступае сваю чаргу.

*
У апусцелых дрэвах
пустое гняздо:
мінула,
пакуль яго ўбачыў,
лета.

*
Сярод зялёных кустоў
язміну і бэзу
зялёная лаўка.
Якой яна стане самотнай,
калі ападуць лісты!

*
У старажытным парку
раптоўна ўзляцелі
гурмой вароны:
нібы жывая істота,
ў галінах вагаецца крык
і ўспуджвае наваколле.

*
Які агромністы дом!..
Тут што ні дня
то свята,
а то жалоба.

*
Аркуш паперы —
аркуш жыцця:
забіраецца час,
збіраюцца знакі.

*
Усё змясцілася ў маім целе:

безліч вякоў,
безліч жыццяў,
а сам я —
не.

*

Яшчэ не світала —
прастукацелі па вуліцы
нейчыя крокі.
Пра што яны гаварылі?
Нешта і пра мяне.

*

Дрэвы ўскрай прорвы:
стаяць —
бы схапіліся ў бітве
з лесам.

*

Са старажытнага бору
насоўваецца змярканне.
Ці — старажытнасць?

*

У парасткаў-клёнікаў
такія ж сапраўдныя,
як і ў вялікіх кляноў,
лісты
і — такая ж сапраўдная восень.

*

Світае —
так паволі,
так неахвотна,
нібы засталіся на цэлым свеце
насельнікамі адно толькі
шэрыя камяні.

*

Прачнуўся ўночы:
па чорных дахах

кралася жоўтая поўня,
кагосьці высочваючы —
ці не мяне?

*

Зялёны мох на страсе —
песнаспеў зялёны
асенняму хмураму небу.

*

Да каменя прытуліўся
жоўты кляновы ліст —
хочацца стаць каменным?!.

*

У вокнах
запальваецца святло.
Хто праходзіць узбоч дамоў —
зазірае ў вокны,
хто ўнутры —
засланяе вокны.

*

Быццам само чаканне
увасобілася і стала
постаццю —
дрэва на гарадскім прыпынку.

*

Глухія завулкі.
Бляклыя ліхтары.
Хаваецца рэдкі прахожы
ад цемрадзі ў светлыню,
ад светлыні — у цемрадзь.

*

Застаўся вісець на сцяне
пажоўклы
леташні каляндар:
гэткія самыя дні,
гэткія самыя тыдні, —

а ўсё ўжо не гэтак.

*

Леташнія аб'явы:
чытаюць іх адно толькі
вецер і дождж,
пакуль
не прачытаюць дарэшты.

*

На небе ўзышоў
вусцішны,
даўні,
відушчы месяц —
і распазнаў мяне
ува мне.

*

Убачыў на вуліцы, у прыцемках,
чалавека,
надзвычай падобнага на майго —
ужо нябожчыка - бацьку.
О як мне хацелася
ўслед пайсці,
о як мне хацелася папытацца:
хто ён?!.

*

Акрыла наўколле шэрань:
кветкі панiклі,
камень зацвіў.

*

Кладка на гразкай дарозе —
нібы падае
руку незнаемы сябра.

*

Гусіныя крыкі
ў асеннім полі:
заўтра — зіма?

*

Абапал гразкай дарогі
белыя лапікі,
белыя іншасветы:
сляды зімы.

*

Над горадам,
дзе жыву,
падае светлы,
світальны,
вясковы
і заўтра ўжо тут не патрэбны снег:
заблудзіўся?!.

*

Справы,
якія здаваліся неадступнымі,
адступіліся...
Вось ты і вольны,—
сказала ўранку душа.
А ўвечары дадала:
і лішні.

*

Нібы святочная ёлка,
ззяе
вокнамі новы дом:
ці за кожным — радасць?

*

Зыпаў на досвітку снег:
бязмоўна
спявае наўколле.

*

Свеціцца
нізкае сонца ў вокны —
і постаці дрэў
блукаюць навобмацак
па пакоі.

Сам-насам з зімою:
вось і настала твая пара,
сутонлівая яліна.

*

Снег сышоў —
і ўзышла
леташняя трава.
І што мне з вамі рабіць,
шматкі мінулага часу?!.

*

Цягнецца з коміна
і растае
дым у паднеб'і —
сцежка,
што не варочаецца назад.

*

Па заінелым трамвайным акне
хтось напісаў:
«Я кахаю».
Усе пазіраюць на свет
праз гэтыя словы.

*

Над вёскай,
утуленай у зіму,
заззяла першая зорка...
І засталася яна ў душы
такой — неадлучнай ад зоркі.

*

Не спяшайцеся, кіламетры:
я ж яшчэ не прайшоў
гэты шлях
душой.

*

На снежным узмежку
калышацца ссохлы быльнёг:

ужо не пужае сцюжа?!.

*

Адліга.
Вяршаліны дрэў
намацваюць неабсяжнасць.

*

Падмерзла зямля —
стала суха,
сонца ўзышло —
стала слотна:
жыву — нібыта іду
па раздарожжы сусветаў.

*

Пачатак вясны —
сустрэча
усіх пораў года.
Хто яшчэ ходзіць у шапках зімовых,
хто — ужо ў летніх,
а хто — наогул без шапак.

*

Паляць у садзе
леташнюю лістоту.
Дым
лашчыцца да галінаў:
родны?!.

*

То хмары, то сонца...
І тэта ўсё,
што даюць нябёсы?!.
І гэта ўсё,
што чакаецца ад нябёсаў?!.

*

Чарнеюць на схіле
палосы і плямы:
аўтапартрэт агню.

*

Разводдзе.
Быццам чыясьці рудая шапка —
стог сена ў вадзе.

*

Не бойся, муха-нязграба:
хіба я стану сягоння
цябе чапаць,
калі зіма пражыта?!.

*

Падмерзла дарога:
нібы нерухомыя лодкі,
на ёй засталіся нашы
учорашнія сляды.

*

Стаіўся за дрэвам —
і для паловы свету
стаў толькі дрэвам.

*

Натрапіў у кнізе на захаваны
білет цягніковы:
не ведае ён,
дзе я быў,
не памятае —
куды ездзіў.

*

Вяртаюцца з выраю птушкі —
зямлі
вяртаюць нябёсы.

*

Каштан
у набраклых пупышках:
прыгожы
будучай прыгажосцю.

*

Садзяць бульбу: цяпер
думай сама,
турбуйся сама,
як выбрацца з гэтай сховы.

*

І табе ахвота
з усімі разам
пабыць на свяце вясны,
пякучая крапіва?!.

*

Сад атуляюць плотам.
А ён усё роўна
цвіце для ўсіх.

*

У ранку я выйшаў з дому
і ўвесь дзень ішоў
у кірунку да сонца.
Якім супярэчлівым аказаўся
мой шлях!..

*

Ці чуеш,
асушаная балацінка:
кнігаўкі прыляцелі?!.

*

Пачало неўпрыкмет змяркацца —
і неўпрыкмет
аціхла гаворка,
а ціша загаварыла.

*

Стаяць на балоце
стагі
з аснежанымі вярхамі —
тутэйшыя горы.

*

Рэчка замерзла.
Мост
здзіўляецца лёду:
адкуль ты ўзяўся?!.

*

Па непарушным снезе
лёгкі заечы след
і чалавечы —
цяжкі.

*

Ялінка на сметніку.
Вось і ўвесь Новы год!..
Вось і ўсё наваселле!..

*

Зімовае сонца.
Імкнуцца ўстаць
са снежнай пасцелі
цені.

*

Зіхоткая поўня —
акно,
з якога
глядзіць у душу нябыт.

*

Чакаем таксоўку ўначы:
чарга
пасунулася на адно месца —
і то весялей.

*

Зімовыя прыцемкі:
снег настае,
растае наваколле.

*

Вісяць між пупышак
замерзлыя кроплі —
таксама
вясны чакаюць?

*

Абудзіўся сярод суровых
зімовых палеткаў:
куды пацячэш,
ручай?!.

*

Які пахмурлівы небакрай!.
Адтуль
вясна надыходзіць.

*

Чырвоны дом на гары —
уволю
я ў ім нагутарыўся б
з цішынёй.

*

Бягуць ручаіны
у полі —
звівы
жвавай гаворкі.

*

Бярэзіна
і без лістоты,
шпакоўня
і без шпака —
пытанні, узнятыя ўгору:
ці не забыўся
пра іх сакавік.

*

Беляць у садзе вясновым
камлі —

галіны
самі пабеляцца неўзабаве.

*

Вісіць і не падае
у паветры
зялёны дождж:
ніцыя вербы зазелянелі.

*

Н е бойся цячы, ручай,
у яры і ў ямы:
рака
цябе не забудзе.

*

Вясновы самотны вечар.
Гуляе дзяўчынка
у хованкі з маладзіком.

*

Ля лазні
бярозы ў набраклых пупышках
і дзед-прадавец
з вязкай леташніх венікаў:
не спазніўся?!.

*

Гром загрымеў —
і адразу
аціхлі ўсе галасы:
нябёсы гавораць!

*

Першыя кроплі дажджу:
на плітах
азбука кропак.

*

Ладкуюць гнёзды гракі:
абламанае вецце

зноўку
вяртаецца дрэвам.

*

Здалечыні,
праз начную імглу
агеньчыкі замігцелі:
адзіны ва ўсім наваколлі дом,
што не спіць,—
бальніца.

*

Вішня наўскрай дарогі:
спяшайся
першаю расцвісці —
у пчол
абранніцай будзеш.

*

Кроплі дажджу
пастукаліся ў акно —
ці мо самі нябёсы?!.

*

Прарэзаліся на градках
стрэлкі цыбулі:
вачам дзівунак.

*

Ходзіць паважны грак
між квітнеючых сліў
па двары —
гаспадар,
што вярнуўся з замежжа.

*

«Даў Бог —
пражыла цэлы век,
а не ведаю,
у якім баку сэрца...» —
бабулі

ў царкоўным падворку.

*

Шчыміцца ў плот
цікаўная крапіва:
што тут,
у агародзе?

*

Вяду вясноваю вуліцаю
з бальніцы маці
сваю старую —
вяду
сваю старасць.
Бэзавы куст заквітнеў —
у доме
парасчыняліся вокны.

*

Крывенькая яблыня ў полі —
хоча ўцячы
з гэтага месца,
дзе пасадзілі?!.

*

Цвітуць на бальнічным двары
жоўтыя дзьмухаўцы —
уцеха
вачам чыімсьці.

*

Селяцца ў коміне хаты
вароны —
зрабіцца
чарнейшымі захацелі?!.

*

Калючы асот —
але вунь, глядзі:
пчала з ім сябруе.

*
Дом з каляровымі аканіцамі —
матылькі
разгарнулі крылцы?!.

*
Мокне на беразе возера
з вудай рыбак —
злоўлены язь
ловіць ротам дажджынкі.

*
Зона,
І як вы зайшлі,
бярозы,
туды — за калючы дрот?!.

*
Старыя дамы:
хацеў бы
зайсці ў кожны з іх,
у кожным
пажыць хвіліну.

*
Сеў матылёк на куст
квяцістага бэзу —
і ўбачылі ўсе адразу,
які фіялетавы бэз,
а матылёк — бялюткі!

*
Паўзлазілі дзеці на дрэва:
дом,
што дарослымі не заняты.

*
Ледзьве відаць яго —
а запоўніў
сабою ўсё паднябессе:
жаўрук спявае.

*
Бульба цвіце.
У рамонкаў
круглыя вочы.

*
Вадасцёкавая труба —
увага,
што скіравана адразу
у неба
і ўдол.

*
Бярэзіна ўсохла,
а ў вершаліне
красуе зялёная амяла:
пераможца лёсу?!.

*
Каля зялёнага дрэва
скульптура з дрэва:
маўклівая спрэчка
пра дасканаласць.

*
У вёсцы.
Як дзіўна зноўку пачуць
гаворку,
знаёмую з немаўленства,
ад незнаемых людзей.

*
Ускрай маладога жыта
сінія васількі —
сінія буквіцы
ў кнізе лета.

*
Сохнуць на плоце збанкі:
штыкеты
займелі галовы?!.

*

Хаваецца між дамоў
зіхатлівая поўня —
цыганка нябёсаў.

*

Вецер павеяў,
закалыхаўся зялёны чарот —
і ўзнікла
р а з м о в а.

*

Перасяляемся.
У кватэры
селіцца рэха,
у рэху –
пражыты час.

*

Усё ў ім галініцца,
усё разнастайваецца,
усё
няспыннае паўтарэнне:
дрэва — ці, можа, само жыццё?!.

*

Косяць —
але ні для кога:
такі твой лёс,
трава-гараджанка.

*

Не замінайце,
ветахі-ліхтары:
дзіўлюся на поўню.

*

Па-над запруджанай вуліцай
лётаюць жвавыя матылькі:
машыны гэтак
не могуць.

*

У горадзе бор —
ацалелы гурт
упорлівых абаронцаў.

*

Навеялася да весніц
хваля пяску —
хваля мёртвага часу.

*

Спахмурнела —
і глыбіня
вярнулася наваколлю.

*

Канчаецца дзень —
у дрэў
выраслі цені.

*

Пад плотам
пасохлы дзядоўнік
і дзед-жабрак:
пабрацімы?!.

*

Шчасліўцы-вербы:
такая сухмень —
а яны з ракою.

*

Бяроза каля царквы –
дзве белыя постаці
прыгажосці.

*

Дождж!.. Дождж!..
І дзе ты быў усё лета?! —
плачуць сады.

*

Падаюць дзічкі ў траву —
і адтуль цікуюць:
ці хто іх возьме?
Старая таполя
з парэпанаю карою —
цякуць
па ёй ручаінкі часу.

*

Такая празрыстая далячынь –
відаць
нядаўняе лета.

*

Зграбаюць жанчыны ў кучу
апалае лісце —
і вось ляжыць перад імі
яно, быццам дзіўны
упаляваны звер.

*

Марудныя доўгія чэргі —
яны адны
яднаюць усіх сягоння?

*

Дождж церусіцца —
дым
не бачыць, дзе неба.

*

Згусціўся туман —
і вокны дамоў
сталі вачамі прасторы.

*

Якая прагная гліна!..
І з жабрака
сцягвае боты.

*

На скрынцы для смецця
цярпліва
сядзіць крумкач.
Раніца ўвосень.

*

На небе туман, н
а зямлі слата:
н а ш а надвор'е?

*

Расклалі ля рынку
цяпельца
і грэюць рукі:
армяне ў Менску.

*

Ці калі-небудзь
сюды вярнуся?!.
За плынным акном
тасуюцца краявіды.

*

Снег усцілае зямлю,
на снег
сцелецца жоўта-барвовае лісце:
мастачка-восень.

*

Пад небам асеннім
калодзежны журавель:
скардзіцца, што не можа
лётаць?!.

*

Выйшла з аўтобуса
і азіраецца —
ці яе
гэты прыпынак:
старая перасяленка.

*

Над курганамі туман
ці дым
вогнішчаў старажытных?

*

Зіма ў лістападзе!.
У скутай рацэ
плаваюць качкі.

*

Убілася ў берагі
і заўзята
габлюе рачную плынь:
руплівіца-кладка.

*

У лужыну зазіраюць
познія дзьмухаўцы:
там — сонцы?!.
Вагаецца вецце
асенніх дрэў —
і вагае,
аплёўшы сваімі ценямі,
дом.

*

Адгарадзіўся ад наваколля
плотам з бярозаў і соснаў
і сам за імі
стаіўся:
лес.

*

Змяркаецца.
У парку крычаць вароны —
і крыкам намацваюцца,
што яны ёсць.

*

Такі прыгажун,

а зажураны:
неба не хоча
ужо ўсміхацца табе,
сланечнік?!.

*

Ветраны ранак.
З дрэў
цярушыцца лісце,
з вачэй
точацца слёзы.

*

Каменне ў затоцы,
сярод камення
шэрыя качкі:
восеньскі морак.

*

Лужына.
Захапіла
жоўты кляновы ліст
і зашклілася лёдам:
е й н ы!..

*

Зрываецца і ў нікуды
ляціць лістота —
дарогу
паказвае мне?!.

*

Вострыць і вострыць дзюбу
аб камень крумкач:
ну, ляці ўжо,
досыць!..

*

Тулю да грудзей абярэмак
паленаў скалелых:
і ў нас

будзе нарэшце свята!..

*

Цягнецца з коміна дым
па-над снежным бязмежжам:
адна
сцежка — і тая ў неба.

*

Як паніжэлі
платы і вароты!..
Завулак
у снежных гурбах.

*

Зімовыя прыцемкі.
Да старой
бярэзіны папрырасталі
вароны — скалелыя камякі.

*

Збягаюць з дарогі
і пад сумёты
хаваюцца жвава:
змоўшчыкі-ручаі.

*

Чысты чацвер.
У вокны
стукаецца ўвесь дзень
клапатлівае рэха.

*

Лётае над красавіцкім
голым палеткам
першаю краскаю
матылёк.

*

Падпіў —
і трымаецца што ёсць сілы

аберуч за бохан хлеба:
стары вясковец.

*

Чмялінае свята:
зацвіў
куст вербалозавы
у наваколлі.

*

Пакінуты дом.
Зазірае ў акно
галінка зялёнай вішні:
няўжо нікога?!.

*

Блукаю па Вільні.
На даўніх мурах
новыя назвы.

*

Схаваўся ў царкву ад дажджу:
знянацку
зірнулі знаўпроць святыя.

*

Дзе — старасць,
дзе — маладосць?!.
Зацвілі яблыні сёння.

*

Збягаюць струмкі з капяжа:
у асфальце
ямачкі-чаравічкі.

*

І гэта адзенне?!. —
здзіўляецца клён: касцёл
у леташніх рыштаваннях.

*

Свецяцца свечкі ў траве:
дзьмухаўцы
абступілі сцежку.
Спеў у нябёсах,
нябёсы ў спеве:
жаўрук.

*

Боязна,
што заўважаць
і што не заўважаць —
таксама...
Суніцы зачырванелі.

*

Сярод залатых дзьмухаўцоў
адзін серабрысты:
у німбе?!.

*

Якімі высокімі павырасталі
быльнік і лебяда:
быў бы малым —
схаваўся б!..

*

Вось ужо й скончыўся лівень!..
А ліст кляновы лісту
перадае ўсё кроплі.

*

Далёка ісці...
Смакчу
няспелую сліву.

*

Вецце спусціла
ў замерлы ставок
і сама замерла:
вярбіна ў спёку.

*

Вуліцу заняло
паважнае шэсце:
ідуць
з пашы каровы.

*

Убіўся ў самую багну
і ўгору
узняў булаву:
аеравыя ўладанні!..
Хочаш са мной
паблукаць па свеце? —
Да рукава
бадзяк прычапіўся.

*

Хаваецца дзень.
У кожным
акне па сонцы.

*

Акрылася жабурэннем —
і неба
схавала ў сабе,
і з ім
схавалася ад паверхні:
затока.

*

З рынка нясу на руцэ
капусную галаву.
Ці ведаеш ты,
капусная галава,
колькі «зайцоў» каштуеш?

*

У ржышчы жытнёвым
конік застракатаў:
яшчэ
нешта не зжата?!.

*
Шэпчуцца:
ці застацца
стаяць у вадзе,
ці выйсці
усё ж на сушу...
Азёрныя чараціны.

*
Гронкі рабіны
зачырванелі:
ўгару
горнецца позірк.

# ПАЭМЫ

## ПАЭМА ЖНІВА

Упала зерне —
і не ўзышло,
а што ўзышло — куколле заглушыла,
а што не заглушыла — выбіў град,
астатняе развеяў вецер...

Ці маеце што есці?..
Крумкачы
зляцеліся ад горада і вёскі,
нібы зацьменне, засланілі сонца —
і ў сэрца
учапіўся чорны цень,
і ў мозг пранік картавы і ўтрапёны
халдзейскі гоман: марная патрэба...
Ці маеце што есці?..
І звяры
з лясоў і нораў зграямі прыбеглі,
загойсалі ў дзівотнай пантаміме —
імпэт і хіжасць... хіжасць і пагоня...
Паветра нюхалі — прыспешвалі хаду,
разбойнымі зубамі ляскацелі
і скавыталі... —
халадзела кроў:
яна была ім і пітвом і хлебам...
Ці маеце што есці?.. -
Надышлі
з дарог вялікіх шумныя натоўпы,
бушуючы: відовішчаў і хлеба!..
І ўгору падымалі кулакі,
бы пагражалі невядомым страхам,
і калыхаліся —
як збажына пад ветрам...
Ці маеце што есці?..
Прыбрылі
з усіх бакоў нябогі і калекі —
жабрацкія палапленыя торбы
худой дзятвой чапляліся за шыі.
Надзённы хлеб ім быў недасягальны,
таму прасілі проста: што дасце...

Ці маеце што есці?..
Больш ніхто,
ніхто больш не прыйшоў...
Звяры і крумкачы,
натоўпы і нябогі атрымалі,
што прагнулі,
займелі, што хацелі...
А Сэнс усё пытаўся пра спажытак.

Народжаны ад хлеба, прагну хлеба.
Дзе затрымаўся сейбіт,
каб спытаць,
калі маё жніво пачацца мусіць
і што за доля вызначана мне.
Не ведаю —
гляджу і не знаходжу:
у іншых наліваюцца зярняты,
у іншых — плён, у іншых — моц і гонар,
бо неаддзельны хлеб ад чалавека,
і неаддзельнасць гэтая навек.
Мае палі найболей зараслі,
але — авохці — зараслі куколлем:
чаму куколлем і чаму мае?!.—
якая воля так наканавала
і знак які ^ўздзейнічаў на іх?..
Ніхто не скажа,
скажуць: адбылося,
што зробіш, адбылося, вось і ўсё...
Дзе затрымаўся,
дзе падзеўся сейбіт,
які б размежаваў і растлумачыў:
што мушу жаць, народжаны ад хлеба,
і што такое ўвогуле жніво...
А спелы вецер намаўляў: рыхтуйся,
а поўня нахілялася: рыхтуйся,
і камяні круціліся: рыхтуйся —
рыхтуйся неаслабна да жніва...
Нішто не гіне раптам і бяздонне,
заўсёды застаецца нейкі прынцып,
які сцвярджае жыта і зямля,
нат і тады, калі ўзрасло куколле.

Няма што жаць — а раздзімаю горан,
няма што жаць — а наразаю серп,
няма што жаць — рыхтуюся бяссонна
да выніку, да плёну,
да жніва...
Усё умеюць рукі,
а душа...—
рыхтую да жніва душу:
ў бязлітаснай надзеі выспяляю
і ў скрусе загартоўваю зямной...
Няма што жаць — а тэрмін як наступіць.
Будзь прывітаны сёння і заўжды,
будзь прывітаны блізкі і далёкі,
паглядаў не стае — убачыць,
і сэрца не стае — адведаць,
але цягнуся да цябе надзеяй,
адвечнай несмяротнаю надзеяй:
будзь прывітаны, час жніва.

Адкуль? куды я?..—
свеціць далягляд...
Адкуль? куды?..— вядзе мяне дарога...
Штовечару кладуся на зямлю,
шторанку падымаюся, каб неяк
прылегчы назусім і не падняцца:
падведзен вынік, скончана жніво...
Што зробіш, адбылося — скажуць людзі..
Пакуль жыву, хачу спасцігнуць сэнс
нябыту, і быцця, і прызначэння,
бо нездарма вяртаюцца шляхі —
нібы настаўнік паўтарае вучням:
твая дарога у табе самім.
Пасеюць мяне лішняга ў зямлю,
але калі што з асцюкоў паловых
усходзіла, каб жыць і каб жывіць?..
Дзе затрымаўся,
дзе падзеўся сейбіт,
які б нарэшце ўсім расплюшчыў вочы
і сэрца выбавіў з трывогі і тугі
і адказаў, якое зерне ўсходзіць?!.
Наперадзе і ззаду — невядомасць,

якая анічога не гаворыць,
як не гавораць тлен і пустата...
Дык для чаго ўсё цягнецца дарога,
дык для чаго і розум і вар'яцтва,
дык для чаго ствараць, і падымацца,
і разбураць, і плакаць для чаго?!.
Народжаны ад хлеба, прагну хлеба —
пакуль жыву, хачу спасцігнуць сэнс
дыханнем кожным, кожнаю крывінкай,
і позіркам, і крокам, і людзьмі.
З нічога паўстаюць не для нічога,
а для жніва — ці выспелю ўраджай?!
Я меркаваў: калі настане час...
А неабходна наставаць самому,
не жнец, а ніва — помню пра жніво...
Як цяжка падымацца ад зямлі,
чаму я не памер учора,
калі быў каля плену і ўраджаю...
Увышыні высока і бязважка
цякуць і не спыняюцца аблокі —
як цяжка падымацца ад зямлі...
Прайшлі учора па маім палетку,
па ніве, пабялелай да жніва,
прайшлі учора па прыспелай ніве
зноў тыя самыя, ўсё тыя жабракі.
Тут хлеб... тут хлеб мой...— я крычаў,
вы атрымалі ўжо сваё, вы атрымалі...
Яны не слухалі, ішлі і рвалі прагна
мае сцяблiны...
А пасля — натоўпы...
Прыбіліся,
брылі, нібы з палону,
кудысьці вінавата і бязладна
і мармыталі: наш надзённы хлеб,—
і каласы сашморгвалі у жмені...
Тады — звяры...
Панура і трывожна
па збажыне цягнуліся, як быццам
прыпаміналі кут, куды памерці
паспець ім трэба...
Зяпамі зрывалі

і елі зерне разам з асцюкамі...
Пасля нахлынуў грай —
і крумкачы,
нібы сатрэсеныя, ўпалі з-пад нябёсаў,
крычалі: трэба...— і вілі з саломы
нязграбныя затуленыя гнёзды...
Заўчасна агаліліся палі,
мой ураджай жніва не дачакаўся
і разабраны плён мой дзе-куды...
Як цяжка падымацца ад зямлі
і жыць наноў, наноў араць і сеяць,
любіць і спадзявацца — ўсё наноў...
Чаму я не памёр учора?..
Навошта чалавеку гэтак многа
адводзіцца і ўвагі і прастору? —
ступай, дзе хочаш, ды не пастурайся...
Настане вечар — стомлены кладзецца
заснуць і спаць і ўсё, што ёсць, забыць...
І спіць, і забывае,
                    але ўранку
яго абудзяць жыць выпрабаванні
і рыхтавацца плёнам да жніва...
Чаму жніво на мой плён не паспела,
паспее зараз — што я пакажу?..
Дзе затрымаўся,
дзе падзеўся сейбіт?..
Адно плывуць аблокі і маўчанне,
аблокі і шматзначнае маўчанне,
разгойданае крыкам крумкачоў,
выццём звяроў, усклікамі натоўпаў
і шэптам жабракоў...
А там, за ім —
як мог яго раней не заўважаць я,
чаму не заўважаў яго раней?!.—
святціўся незнішчальны голас Сэнсу
і падымаў з зямлі непераможна:
Я хлеб ваш... я ваш хлеб... я хлеб жыцця.,
вяртаючы наноў выпрабаванням,
надзеі,
          выспяванню
                    і жніву.

БЫЛО БАЛОТА

I
Як альшына мая — з-пад піл,
як вужака мая —
з-пад бота,
застагну,
упаду ў нахіл...
Напачатку было балота.

Не вядзьмарка — не ажыву:
як душа пакідае цела,
апантанасці і жніву
уступаю свае надзелы.

Па адстойніках і равах,
праз малыя і буйныя рэкі
паўтараецца даўні шлях,
мой апошні —
з вараг у грэкі.

Пераходзілі эры,
святло
пагасала,
і сутарэнні
нагрувашчваліся —
было:
першаснасць... першатварэнне.

Немаўленства сівой зямлі —
скамянее:
пасля спарону...
Навакольныя дрэвы знялі
свае велічныя кароны.

Бор далёкі вее бяду,
ахінаецца ў пыл і дрымоту...
Неспадобнае — адыду...
Напачатку было балота.

Вызначаючы цемру і бель

і жыццёвыя пуцявіны,
ўсцяж
        праносілася мадэль
жыццядайнай душы буслінай.

Разляцеліся ўсе буслы —
расцерушыліся абяцанкі:
што насілі,
                тым абняслі...
Бы кругі на вадзе — бусянкі.

Аднадзённы і хлеб, і век...
Нерухомее горада постаць...
На няўцямныя поспех і спех
наклікаецца цямная помста.

Наганяючы небыццё,
навастрыліся аэрадромы...
Хай вядома ўсім: леціце...—
залятаеце ў невядома...

З'явы звязваюцца ў чаргу,
надыходзяць
                нечпадзявана!..
Каб зыначыцца — не змагу,
выпадае: само не стану...

Далягляд, бы ў слязе, ў смузе.
Дзе шукаюць каровы напіцца —
хмара дольняя папаўзе...
Перасохлі мае крыніцы.

Разгубіліся пацеркі з рук —
журавіны...
Імшар сівее...
З раўнавагі — у збойны зрух:
прачынаюцца сухавеі.

Вымкне будучыня маной,
непадманная — засумуе...
Плача кнігаўка нада мной,

хто аплача яе самую?..

II
Баламуцячы сілу ліхую,
сінявокі, як дзень, валхвец —
у балоце глухім валхвуе
экскаватаршчык Абравец.

Нібы здані з дрыгвы паўсталі...
На гнілыя калоды, на мхі,
на паганыя воды ссылалі
дух нячысты і дух ліхі.

Індульгенцыя на памылкі:
прэч з абседжанага жытла...
Быццам скончаны тэрмін ссылкі
ці амністыя надышла.

Пойдзеш коса ці пойдзеш проста
не натрапяцца грэбля і гаць...
На усе навакольныя вёрсты
вокі чортавыя глядзяць.

Булькаценне... пасма рудая...
павуцінне... кшакі... брыжы...
Ноч настане —
ад небакраю
наварушваюцца міражы.

Чорным дымам душаць дыханне,
белай немаччу цвіляць кроў,
сутыкаюць,
нібы ў яднанні,
скрыгат сталі і рык звяроў.

У крутыя звіваюць завівы
непадобныя паясы,
адчыняюць нябесныя злівы
і падземныя галасы.

Патаемныя твораць чары

з чалавечых дзей і высноў...—
І ўстаюць —
тут і там —
пачвары:
грозны перад-і пасляслоў.

То не вочы цямнеюць — вачніцы,
целы круціць і торгае шал,
і вар'яцкая ўсмешка шчыміцца,
агінаючы рота правал...

Абравец, ты ўздыхаеш, нямы,
і нібы ад нуды заразнай,
не адробішся ад думы,
доўгай-доўгай і невыразнай.

І балота з табою ўздыхае,
непрытомныя сны снуе —
быццам маці, закалыхае,
быццам мачаха, апаўе.

Пракаветны балотны нораў —
не заб'ецца, не ўздыме бунт...
Рассцілаецца: у пакоры,
адымае — ў пакоры — грунт...

Прахапляешся незвычайна —
захлынаецца ў твані карэц,
экскаватар хрыпіць адчайна...
Абрываецца Абравец,
вырываецца...

А назаўтра —
тросы вытрымалі б хацяі —
экскаватар, як дыназаўра,
вынатужваць з небыцця.

Залучыла балота ўпотай —
ні двара ў цябе, ні кала.
Ды ўжо хутка:
было балота...—

і пра будучыню:
                              была...

III
Рай адняты —
будуем рай...
Каб усё ў адну долю звесці,
аблажыла балотны край
экскаватарнае нашэсце.

Стрэлы выцягнуліся здаля:
не дацягнуцца — сцягнуцца ніты:
ахне ўражаная зямля,
разарваная дынамітам.

Па сваіх законах цвіла,
стала мала такой карысці —
будзе служкаю ля стала:
ўрыхтавалі прыродзе выйсце.

Ўздоўж і ўшыр — ля нарэзу нарэз.
Па крамяных маіх світаннях
перасоўваецца прагрэс,
збалансоўваючы на сланях.

Безаглядна, як рэжа штых,
рассякаюцца краявіды,
выпрамляецца кожны штрых:
геаметрыя па Эўкліду.

Разлічылі —
                    куды падзець,
куды ўкласці імпэт і працу...
Захапляльна наўзбоч глядзець,
ды пакутліва азірацца.

Абравец, памарудзь... замры...—
цяжка ўеліся твае лукі
і ў цякучае цела зары,
і ў свінцова-газетныя друкі.

Твой здабытак табе чужы —
бы душу атачыла сажа...
Што адолена — адкажы...
Што знядолена — хто адкажа?..

...Ураўняліся яма і груд,
і дарога гудзе скразная...
Я прыеду ў знаёмы кут
і знаёмага — не пазнаю.

Буду доўга тлуміць брыво:
іншы голас...
іншыя людзі...
іншы вынік...—
а скажуць: было,
і пра сёння,
як некалі: будзе.

Ці хвалю яго, ці люблю —
ў ім бяссілле сваё і сіла...
У прызначаны час на зямлю
пераможнае
заступіла...

І саступіць...
Што на двары
усталюе назаўтра?., на потым?.
Што пакіне і што забярэ?

Напачатку
было
балота.

## ПАЭМА КАЛОДЗЕЖА

Д з я д а л
Ікар, спыніся!..
                    Беднае дзіця,
ляціш, уладай крыл апанаваны,
сугучны крылам — быццам цеціве
сугучная страла...
Ікар, спыніся!..
Як свет стаіць, ніхто не перайшоў
мяжу бязмежжа і бязмер'я меру,
якія адначасна тут і скрозь
і ўперадзе на ўзмах крыла заўсёды.
Ты згубішся ў нябесный вышыні,
зняможашся ў бязмэтным намаганні —
і ўсё адно не выбераш палёт,
і ўсё адно не вычарпаеш космас...
Цяпер спыніся...
                              Неба не для нас...
Пусты міраж бясплоднае пустыні,
вышэй за нас узносіць нас яно,
не памыліся...— ў гэтым небяспека.
Ці чуеш ты мяне?., ці пазнаеш?..
Не пазнае... не чуе...— ўвесь у крылах.
Куды яны нясуць яго?!. Нашто?!.
Далі багі мне ўменне дарагое
з драўніны... гліны... каменя ствараць
усё, што ні задумаю,
                              уменне
ўсялякія прылады вынаходзіць:
і вынайшаў я крылы — вось яны...
Яны ляцяць і сына майго зносяць...
А я, Дзядал, сачу яго палёт
і не магу палёту перашкодзіць,
нібы я быў — і вось ужо няма,
застаўся толькі сведка непатрэбны.
Што ён надумаў?..
Ён пра ўсё забыў:
ляцець услед — між небам і зямлёю,
між небам і зямлёй...
услед за мной...

Маё дзіця загубяць мае крылы...
О лепей бы нічога я не ўмеў,
О лепей бы не кратаўся нікуды:
бяссільны царскі гнеў мяне вярнуць,
а мой адчай — няшчаснага Ікара...
Яшчэ хвіліна — і растане воск,
І пер'е расцярушыцца...
Нясцерпна
мне пазіраць угору, дзе ніхто
не быў яшчэ дагэтуль, проці сонца
і проці сына —
беднае дзіця.

І к а р
Так і не так...
Мой аргумент — я сам...
Я жыў дагэтуль па чужых законах,
чужое ўмельства пераймаў бязмэтна,
турботаю чужою марнаваўся
і мудрасць, мне чужую, спазнаваў.
Цяпер я сам твару свой жыццяпіс,
дакладней, я жыву —
раней, здаецца,
я толькі прыстасоўваўся, згаджаўся
з агульным меркаваннем і тваім,
Дзядал, прыватна-падначаленым...
Калісьці
ты мне самому даў мяне — даруй,
што я і не падзякаваў ні разу:
няма ў нас звычкі дзякаваць бацькам
за тое, што мы ёсць і ёсць такія.
Даўно ўсе пагадзіліся маўчаць
і разумець: бацькі не адпаведны...
Таму даруй мне двойчы, бо цяпер
не за сябе зноў — дзякую за крылы,
за крылы, што дадаў ты да мяне...
Я большага за іх ужо не маю:
яны ўва мне — нясуць мяне, Дзядал...
Не за табой...— наводшыбе.
Я не ўмею
па абавязку жыць і паміраць,

адзіны абавязак мой — па праўдзе...
Я адчуваю: мы не ад сябе...
Забыліся: мы тут, але аднекуль...
Стараюся прыпомніць і амаль
намацваю прадаўняе: з палёту...
Нам тут не выжыць...
Высіцца — адсюль...
Дзівотны сон прымроіўся мне сёння,
у ноч перад палётам —
быццам я
хачу ляцець, а неба не існуе,
адно зямля, каменная зямля,
і я ў яе павінен падымацца.
Не крылы, а рыдлёўку мне Дзядал
дае і кажа: вось я што прыдумаў!..—
адменная прылада, ці не так?
Бяры, капай...—
і я зямлю капаю,
усё глыбей, усё больш неспатольна
і сам знікаю ў глыбіні зямной...
А зверху б'ецца цяжкі крык Дзядала:
навошта ты мінуў крынічны пласт?!.
Калодзеж мае быць куды плытчэйшы...
А мне здавалася: я пушчаны ляцець...
Затое ўжо цяпер не абуджуся
і гэты сон не дамся абарваць:
зямля — уменню, неба — над зямлёю...
Даруй, Дзядал, я долі не змяню —
занадта доўга жыў я нерухома,
занадта палка марыў ні аб чым,
каб зараз на сярэдзіне ўтрымацца...
Мне не хапае крыл ужо..,
Чакай...
Яшчэ не ўсё...
Не здрадзіў я палёту...

П е р ш ы г р а б а р
Спрачаюцца, даводзяць, наракаюць,
учора большы гэты, сёння той,
а праўда — быццам коўш — усё між імі,
а праўда — у няведанні: пры іх...

Не ведаю якраз і роўна столькі,
як гэта ведаю, а болей не магу
цяпер не ведаць,
                                        некалі, магчыма,
калі, напрыклад, коўш апаражню
або наадварот — калі напоўню,
змагу не ведаць болей...
                                                        А пакуль
апаражняць напоўненае мушу
і напаўняць парожняе...
                                                        Ні мне,
ні іншым не ўдаецца абысціся,
каб абысці замоўлены заказ...
Я мушу і хачу, хачу і мушу,
але — каму?.. Не ведаю каму...
Каму я п'ю, жыву, каму капаю
зацятую зямлю...
                                        Не мой адказ.
Ва ўсіх жыве няведанне, і ўсім
яно дарадца, ўсім і апраўданне,
яно ўсіх корміць, любіць, сцеражэ
і вучыць да калодзежа даходзіць...
А калі дойдзем — ён нас павядзе,
да самай праўды, праўды неаспрэчнай,
і праўдай станем мы:
                                        бо не сабой
пазначаны —
пазначыць нас калодзеж...
Іначшае — рыдлёўкі і пласты —
адвольныя ў сваім судачыненні,
і грабары адвольныя, бы крык,
які не апускаецца з нябёсаў,
або маўчанне, што, наадварот,
ляціць сюды...
                        Калодзеж — не адвольны...
І час прыходзіць піць з яго ваду,
калі ніхто нікуды не прыходзіць...
Каб свет вяршыўся, мусіць быць найперш
і найпасля калодзеж непарушны,
няведання калодзеж...
                                                        Чалавек

заўсёды памыляецца ўсё роўна —
калі мяркуе, і калі крычыць,
і калі ўжо нічога не гаворыць...
Няхай жыве няведанне — яно,
адно яно не ўмее памыляцца.
Нябёсы разлучыліся...
Чым стаць
спяшаецца адлучаная частка?..

Д р у г і   г р а б а р
Хачу вады...
Хачу вадою стаць...
Хачу вады...
Калодзежам глыбокім
спыніцца, дзе спыніліся цяпер
капаць яго...
Хто стане чалавекам?
Нас убіраюць нашыя сляды,
як быццам хтось пасоўваецца ззаду
і нам упадабняецца ўвесь час
і ўсё не аб'яўляецца на вочы...
Што ў чалавеку — сонца?., што вада?..
Нас хтосьці падмяняе... падмяняе...
і ўжо без нас тады-сяды жыве
і нават разважае аб рамёствах.
Як зберагчыся?..— сціснулі сляды...
А ў сонца і вады папераменна
застаўся эталон — кім трэба стаць:
хачу — вадой...
Хто стане чалавекам?
У нас — хаценне, а што хочам — дзесь,
але вядзе відушчае, бы рэкі,—
незразумела пальцам і вачам,—
даверцеся, нас нашае хаценне...
...І возьме, калыхнуўшыся, вада
і, ўзяўшы, абароніць ад падмены...
Не прыдаецца спадчына — гнятуць
і душаць крылы:
мроілася — ўзносяць...
Адрыньцеся — адрынуты сляды —
ад крыл і сноў —

апошняй перашкоды...
Калодзежам... вадою... будуць піць...
О, як імклíва, як перакanana
ляціць без крыл, хто меў іх кагадзе,—
ім не паспець...
Хто стане чалавекам?!.

**ПАЭМА РЭХА**

Адкуль слімакі — застаецца спрэчным і цьмяным. Дагэтуль не знойдзены іхні продак. Але, як пацвердзілі доследы, маецца ў іх надзвычайная функцыя: ўтойваць і помніць.

Ты сам сябе помніш толькі *такім* і размову, з якой ад цябе не хаваліся: сам зразумее, бо як яму растлумачыць?!. Сам зразумее найлепей, што ён *такі.* А маці, калі на цябе азірнулася, як напалохалася: ён усе разумее, што мы гаворым...

Зноў прыдаліся пляскатая трэска і круглы крапчасты камень — ты з імі гуляў, і табе было добра: *тое* ўжо не балела, бы некуды знікла, як знікла, калі ты аднойчы парэзаўся шкельцам, кроў на пальцы — сама, без цябе, без тваіх намаганняў...

Ні тая пляскатая трэска, ні крапчасты камень, ні матылёк, за якім ганяўся, ні вашы — як думаў — буслы на пуні нічога табе не сказалі: ні ў чым не было чужога.

Потым ты бавіўся з дзецьмі ў пульхным дарожным пяску — падкідвалі прыгаршчмі ўгору: а на каго ўпадзе?!. Падкідвалі і адбягалі, падкідвалі і крычалі: ...на каго бог — на таго і я... І ты адбягаў, і крычаў таксама, і не зважаў: на цябе найбольш...

Зграбалі пясчаныя кучы, усе ў цябе атрымлівалася, як і ў іншых, але калі паспрачаўся з-за кучы — хто большую кучу пяску нацёгаў,— суседскі хлапчук замест доказаў крыкнуў зламысна: Карпеч... І дзеці, паўскокваўшы, падхапілі: Карпеч...

Ты здранцвеў... разгубіўся... пабег дахаты, а ззаду крычалі адно і тое ж: Карпеч...— пачварнае, недарэчнае, несправядлівае слова, але гэтае слова было пра *тое.* Ты бег і не плакаў — да тых, што заступяцца: о тата!., о мама!..— да іх... Што выправяць, каб усе было добра, што абароняць... А каля ганка раптоўна спыніўся: прыпомніў іхнюю гутарку і штосьці зразумеў, і тады заплакаў, і плакаў, прыпаўшы да ганка... А слова, запаўшы ў цябе, узышло і намацала самую сутнасць — о дзіцячая правата і дзіцячая жорсткасць!..

Разглядаючы ракаўку, неабходна зважаць на ўсе ямкі і ўзгоркі. Няма ў ей нічога лішняга: як агульнаю формай, так самаю дробнаю зморшчынай — усё неабходнае. Па знойдзенай ракаўцы можна заўжды здагадацца, як называецца гаспадар...

Не цябе заўважалі — твой горб, не табой пагарджалі — горбам, а цябе шкадавалі: няшчасны лес, а ён жа яшчэ малое... І стаўся лёсам тваім горб, і лёс твой з ім стаўся... Твае аднагодкі ў лёс забаўляліся, а ён — калі непапраўна... калі незваротна... Калі адна кропля, каб разлілося, калі адзін момант, каб назаўсёды... Кім хочацца стаць вам? Таму — чэмпіёнам, таму — лесніком, а таму — генералам, але нікому — гарбатым... Ну, а ты не хацеў быць нікім, ты хацеў быць звычайным вучнем. І болей нічога... Нічога болей.

Раслі твае аднакласнікі і раслі аднакласніцы, а ў цябе рос горб — нібы жывая істота, цябе высмоктваючы, нібы рука штукара, камечачы і ўбіраючы... Ты адставаў: даганялі цябе маладзейшыя і адштурхоўвалі... адціралі... А спрабаваў бараніцца — не здолеў, толькі адчайна ўчаперваўся доўгімі гнуткімі пальцамі: яны вырываліся, апярэджваючы...

Ты быў ім усім апраўданнем у іхніх няўдачах і скрухах: ...у Карпяча яшчэ горш...— самы нявартасны, стаў ім апорай... З верхняга пазванка вырасла галава, а са спінных — горб, і ён, незаўважна ўсім, прыўзняў цябе над усімі... Ты стаў разумець, што і ты можаш мець перавагу, і меў тады перавагу: ва ўсім, але толькі не ў целе...

У кожнай частцы чалавечага цела паўтараецца ўвесь чалавек, царства жывёл паўтарае яго таксама... Галава паўтарыла тулава — што паўтарае горб?.. што адбіваецца ў горбе?.. Чым багацейшая ракаўка на прыкметы, тым болей адметны слімак.

Вабіла вельмі цябе — у чым сам быў ушчымлены — цела: мужчынскае і жаночае, стрункае, моцнае, круглае цела... Нібы звярок у аблозе, таіўся і цікаваў, як на пляжы пануе і множыцца цела: запаўняе ваду, і зямлю, і сонца, цябе выцясняючы, цела... Знаходзіў на беразе ракаўкі, трушчыў і назіраў: канае

жывое і слізкае... А дзе было пуста — думаў: куды дзяваюцца слімакі?.. Куды дзяваюцца слімакі з ракавак?..

З году ў год расце ракаўка — страшная пастка, якая сціскае, бязлітасна скручвае слімака і прымушае звівацца ў спіралях. Спіральная форма ракаўкі спачварыла слімака: яна не падпарадкоўваецца асноўнаму закону жывёльнага свету — двухбаковай сіметрыі...

У чым справядлівасць — што людзі жывуць або што паміраюць?.. У чым справядлівасць для іх і ў чым для цябе?.. Каб усе былі роўныя або гарбатыя — і справядлівасць была б аднолькавая, і ці можа быць не аднолькаваю справядлівасць?!.

Маці казала: ...ёсць рай і ёсць пекла. Хто на зямлі пакутуе — будзе ў раі... Але не сказала — якім... у якім аблічччы: гарбатым ці простым, з памяццю ці без памяці, сабою ці не... А ты забаяўся спытаць і паўтарыць пытанне: у чым справядлівасць?!. Калі гарбатым — у чым?.. І не гарбатым — у чым?..

Слімаку аднолькава шкодзяць і лішкі вады, і засуха. Таму і паводзіць ён, быццам капрызіць: то ўзлазіць на дрэва або сцяну, то поўзае па траве вільготнай — то Сцыла, а то Харыбда...

З памяці выраслі рукі твае — не з цела, доўгія рукі, і ты не па іх, а памяццю сталі вада і бераг і апусцелая ракаўка ў форме рэха...

Паўзе слімак па дарозе, якую сам пракладае: слізіць... слімачыць... Калі пакласці яго на попел — а слізь не бярэцца да попелу,— ён спыніцца, ўздыбіцца, а потым схаваецца роспачна ў ракаўцы і будзе чакаць пакорліва смерці... Па следзе сваім слімак знаходзіць дарогу да месца свайго жыхарства, нават калі запаўзе далёка...

Доўга ты бачыў адну толькі розніцу, жорсткую розніцу: быў ты, былі іншыя, быў ты і была дасканаласць, быў ты, і быў Бог, і была розніца ў падабенстве... Па чыім падабенстве ты вырас, па чыім падабенстве ты рос, па чыім падабенстве ты нарадзіўся?! У дасканаласці — форма рэха...

Ты ўзіраўся ў людзей... Ці адпаведныя людзі жыццю?.. Ці адпаведныя целы натурам?.. У каго не стае рукі, хто кульгае, хто кепска чуе, хто без вока — а разам калекі... Але ты і між іх незвычайны: у іх аднята, табе прыкладзена...

Неяк спаткалі вы Юлю, сляпую Юлю: самую ганьбаваную і занядбаную ў вёсцы, не прамінулі — смяяліся, а ты быў наперадзе... Адзіная ў вёсцы зямлянка — Юлі, адзіная, хто па хатах пабіраецца — Юля, у Юлі — два Кулічы, а ў іх ніводнага бацькі, і вока адно — у Юлі... Спынілася Юля і стала клясці вас — хваробай і смерцю, вы сумеліся і адступіліся, а яна ўсё крычала: ...вы горшыя за мяне, а Карпеч ад усіх найгоршы...

О, як ты пасля адцураў і сябе і сваіх сябрукоў — быццам смех той з цябе быў... Заможны Юлін сусед хадзіў у царкву акуратна, а Юля — калі-нікалі... І ён яе ганіў: паслаў Бог суседства... Ганіў, чаму не хадзіла, а чаму хадзіла — найболей, і проста так ганіў — бо Юля... Ягоныя дзеці выносілі словы з хаты, дражніліся з ёю і снег закідалі ў комін зямлянкі... Ніводную ў вёсцы дзяўчынку дасюль не назвалі Юляй і, пэўна, не назавуць: Юліна — Юлі, табе — Карпячовае і слімаковае — слімаку...

Па слімаковых рэштках можна дазнацца пра ўмовы іх існавання, прычыны ўзнікнення і гібелі. Незаменныя дзеля гэтага ракаўкі: яны добра захоўваюцца шмат мільёнаў гадоў.

Куды паміраюць людзі? Куды паміраюць людзі?.. Куды паміраюць людзі?!. Нават зямля не схавае і не папpавяць стагоддзі, што ты быў гарбаты... Часова — навечна: вечная памяць у форме рэха... Ты вырастаеш з памяці...

Ты вырастаеш са смерці: смерць — калі помніш. Што помніў вясковы фельчар: двойчы вымалі яго з пятлі, на трэці раз не ўсачылі?!. Што помніла Юля сваёй слепатой?! Што помняць людзі, калі смуткуюць?! Што помніш ты непазбыўна?! Смерць —калі помніш... І форма рэха...

Ты скончыўся не пачаўшыся — для роўнасці і для паўнаты... Пакарабачаная змястоўнасць, што ў

ёй засталося ўліўшыся, а што разлілося і разліваецца? Якім бы ты быў, каб не быў Карпячом?.. Якім бы ты быў?.. І калі не быў Карпячом, якім тады быў ты?.. Надтачылася думка твая: ты памёр і ўваскрос, быў нічым, а ўваскросшы, стаў нечым — стаў жывым, стаў гарбатым, стаў Карпячом... Калі быў жывым ад жывых, зайздросціў жывым і жыўшым — у іх усё добра і добра было, бо ўсе ў іх па-чалавечы, а стаўшы жывым ад мёртвых — раптам напоўніўся, што жывеш... Ты нараджаўся другі раз — праз рэха, а нараджалася рэха праз горб...

Што ні думаў пра горб — станавілася горбу вядома: калі змрочнае і варожае — адбівалася на табе, калі блізкае і шкадуючы — ён цябе шкадаваў узаемна... Ты ўхіляўся і тузаўся, не жадаючы гэткай прыязнасці, і ўсё думаў, як станеш хірургам, і пазбавішся ўрэшце ад горба, і адкажаш прыязнасцю на прыязнасць, і па прыязнасці жэнішся... А пра тое, што думаў горб, і ўявіць не рашаўся...

І прарочы есць тып... Як арган — новы орган... І калечыць, і мучыць, і функцыя дзіўная: прадвяшчаць, што з'яўляецца... прадвятячаць, што ўзнікае... прадвяшчаць новы тып: слімака... чалавека... і новую функцыю...

Абвастрылася думка — як скальпель... Што хацеў — у ёй адбывалася: ты ў ёй гінуў... у ёй быў зямлёй засыпаны, і магіла твая была трэцяй ад плота, і рос бэз, і былі агароды блізка... Ты ў ёй жыў і мяняўся: то дзёрзкім асілкам, то каханкам нястомным, а найчасцей слімаком прыбярэжным... Як бяссільны ты быў не ў думцы, але думка таксама пакуль што была бяссільная...

Хірург, ацаліся сам... Ты будзеш разрэзваць, і сшываць, і шукаць ва ўсіх горб і разгадваць сутнасць горба, адмаўляць і сцвярджаць — і нічога не зможаш адмовіць і сцвердзіць: усё далей і вышэй — о, вышэй і далей!..— перасоўвацца будуць парогі жыцця і твайго меркавання...

Адляталі буслы і вярталіся — быццам мелі ў прасторы сваю дарогу... А пашкоджваўся вусень — матылёк нараджаўся пашкоджаным... І назіраць

неба, і прадказваць вецер або навальніцу, і абставіны ўсемагчымыя, і знаходзіць зёлкі сабе ад хваробы... У руцэ нерухомага Шывы — пустая ракаўка...

Слімак ні на хвілю не можа расстацца з ракаўкай, хіба што — калі памірае... Куды слімакі паміраюць?!.

«Да ўвагі... На беразе N-скага возера нехта пакінуў адзенне з абуткам і споднім... Мяркуючы па адзенні, уладальнік яго быў гарбаты... Дакументаў не аказалася...Тамсама ляжалі круглы крапчасты камень і ракаўка слімака... Асобаў, якім што-небудзь вядома пра ўладальніка гэтых рэчаў, просім паведаміць у аддзяленне міліцыі...»

Куды дзяваюцца слімакі з ракавай..

Смерць — калі помніш...

## ПАЭМА РЫБІНЫ

I

Паехаў бацька, куды, не сказаў — паехаў: можа, ў Сашыцу, можа, ў Куроўшчыну, а можа, ў Нарутавічы, паехаў адранку бацька — вясковы анучнік, і яшчэ не вярнуўся.

Буду стаяць, расчыніўшы вароты, на апусцелым падворку, і пакуль зусім не сцямнее, буду сачыць праз платы ў два бакі вуліцы: адкуль выедзе воз віхляваты — на возе бацька, а гняды конь стомлена-шпаркі.

Яшчэ я заўважу, ці поўна ў драбінах: анучы, пакулле, косці, алюмініевыя чыгуны... Калі поўна — тады і бацька ў гуморы, калі не — не ўгадаю...

Уязджаючы ў двор, старахціць нешта гучнае воз... Рассупоню ўмомант каня, па спіне пагладжу — ці потны, а ён будзе цёпла мне дыхаць у твар і стаяць нецярпліва.

Пад паветку закіну дугу, і хамут, і лейцы... Бацька будзе гадаць-меркаваць, дзе пасвяцца коні: альбо за бродам, альбо ў альшыне, альбо яшчэ дзе — калі пераганалі за сёння. Здыме з воза бязмен і свой падарожны куфэрак — з ніткамі, грабянцамі, з парцяной і суконнай фарбай, губнымі гармонікамі ды хусцінкамі — і панясе ў хату.

А я той парой ухаплю пацёртае пута і ўскінуся на гнядога. Па вуліцы будуць утульна свяціцца вокны, і трохі відаць будзе — што там... Шчаслівы і неразборліва буду думаць-успамінаць, як напаю каня ў рэчцы, як заўтра ў школе спаткаю дзяўчынку — такую, бы веюць таполі, як, вярнуўшыся, зачыню вароты...

II

Смуга вечаровая — у смузе навакольныя вёскі, якія ты прамінуў, прамінаеш альбо яшчэ прамінеш.

Нечакана аціх дзень — і зверылася нечакана, што ўжо нікуды не дзенешся, будзеш ехаць, як ехалася, падзяляючы дзень з усімі, хто сустракаецца, з небам, з травой прыдарожнай, з канём гнядым.

Пра што пыталіся людзі, пра што гаварылі? — нібы і помніш, а ўсё прыпомніць ніяк не можаш: ва

ўсім было падабенства, у розным было адно — і ўжо смугою акрылася.

Увіваліся дзеці, мужчыны сыходзіліся дзеля размовы, зазіралі ў куфэрак з таварам кабеты — і неслі з двароў, што было ім калісьці патрэбна, а цяпер перастала, і ты забіраў: старое, нявартае, папсаванае...

Клікалі дзедам і не ўяўлялі, што й ты быў інакшы: быў горды ў слове і ў кроку і любіў казаць: потым... ва ўсім разбярэмся потым... І вось разбіраешся, і не горды, і воз калываецца па дарозе.

Адзін аргумент дадаецца, другі адымаецца, і ці апошні найбольш праўдзівы?!. Рахмана гняды тупаціць, а перад ім быў сівы: пашкадавалі на бойні — вывелі з-пад абуха, і быў яшчэ адзін сівы — з хворай панылай шыяй, і быў вараны, наравісты, а сёння апошні твой конь...

Да восені — і развітаемся...— вырашанае варушыш... І развітанне нязвыклае будзе, бо разам з гнядым развітаешся з імі ўсімі, і хто ведае: можа, якраз іхнія косці ты зараз вязеш на возе.

Яшчэ развітаешся з тым, што не сталася: яно і назвы сабе не мае — авохці, не сталася, і, як перад полем асеннім, перад сабой паглядзіш адкрыта.

І, можа, нарэшце прызнаешся, у чым нікому не прызнаваўся: усяляк выпадала, а выпала ўсё ж не гэтак... О як ты лёсу свайму пярэчыў, о як на яго спадзяваўся пярэчачы: вывезе... І біў нізавошта каня, і лютаваў у хаце...— Па незнаёмай мясціне цягнецца воз анучніка.

Які з цябе быў гаспадар — і над сабою не ўладны: то чорная скруха, то бесклапотнае блазнаванне, то непрабудныя п'яныя тыдні, калі ўсёй хаце балючы і невыносны, то хворы — не адарвешся ад ложка.

Умеў распачаць і не ўмеў давесці: застаўся на пляцы плот неацеслены, у хаце падлога наскора ўсланая, а на падворку падмурак да нейкай будовы, якой так ніхто і не ўбачыць.

І крыўду на маці сваю гадаваў як сабе апраўданне — бязлітаснае апраўданне, што ты такі... А на яе пахаванні начамі сядзеў не сплючы, лісты чытаў зберажоныя — у клетачку і ў лінейку, а там пра цябе

ўсё — пра мужа і бацьку... Нібы староннi, сябе перачытваў, а прачытаўшы, паліў і плакаў...

У маўтгазенаўскім крэматорыі згарэў твой нумар: незнаёмы нябожчык памёр за цябе таксама, і яго тайком пераняты нумар, нібы язык полымя, нібы пасма дыму, кранаў цябе да самага вызвалення, як зараз краналі лісты пра цябе...

Каму б ні прыйшлося, радзіў: і што казаць старшыні калгаса і што не казаць, радзіў, куды падавацца з рублём, а куды са скаргай — нібы пабываў усюды, і толькі сабе не нарадзіў нічога. Калі было шмат — не трымаў, і ні ў чым не ўтрымаўся, усё спахапляўся: нават з анучнікаў адлічалі — судом заступіўся, нават застолле не цешыла — цяжыла...

З кім ні раўняўся — не параўняўся: мяняліся шапкамі, але ўсё роўна сваю знаходзіў, і свае чобаты, і ватоўку, і рукавіцы, якія сам сабе шыў... А можа, нявартa было спахапляцца, а можа, нявартa было перайначваць час?!.

Дома цяпер амаль не трывожаць — скарыліся: дроў не хапае... сена не косіцца... гніе бярвенне і конь марнуецца стойма...— але сабралася пры табе і з табой вандруе трывога: чаго не хапіла ўсё-ткі?

Аднойчы згубіў ты ключы ад крамы — быў крамнікам, хадзілі шукаць іх усёю хатай: па розных баках, па розных закутках, дзе ты быў напярэдадні — і адшукалі... А як растлумачыш сёння, дзе быў і што страціў?

Прыгадваюцца аднавяскоўцы, якія памерлі, як і ты сам хацеў бы, раптоўна: адзін — калі вывеў калоць вепрука, другі — ідучы ў сябрыне, бы ён паслізнуўся...

А недзе — ужо за смугой — нязбытнае адчуванне: ты спіш у кусце чаромхавым, а на падворак прыйшлі па цябе з абрэзамі... Пытаюцца ў маці, шныраюць, а сонца пахнюткае і густое, і ты ні за якую справу яшчэ не браўся.

«Знайшлі б — зрасходавалі б»,— паабяцалі... Не паслізнуўся тады твой лес, тады не здзівіўся, а зараз дзівуешся, тады быў упэўнены: так і трэба, а зараз не ўпэўнены, тады больш адказваў, зараз — пытаешся...

Апраўдваўся — звінаваціўся, дамагаўся адменнага ладу — і простага не дамогся. Струхлела бярвенне — на дровы парэзалі, не ставала сена — кармілі хлебам скаціну.

Неабходна заворваць поле, неабходна разворваць, станеш іначыць — і прападзеш... О як табе — і не жадаўшы таго — іначылася: заўжды прападаў, шанцавала часам.

А прызнавалі — цешыўся. Доўга не мог нахваліцца і цяпер не дахвалішся, якую ўдалую вывеў печку: хадзіце, глядзіце, а нават не ведаў, што ўмею... А ад таго, што рупіла, што вымагала ўвагі, як назнарок адхіляўся ў неймаверны, ў далёкі клопат.

І прыпавесць нам расказваў аб рыбаках і рыбінах: усе лавілі звычайных і толькі адзін незвычайную, усе вярталіся з рыбаю, а ён ні з чым... Кпілі з яго, жартавалі з яго, а ён разлічыў найлепей: калі ёсць звычайная рыба, павінна быць незвычайная, і, значыць, хто ловіць яе, той зловіць.

Так ён лавіў, і састарыўся, і знямогся — і тады засмуціўся-засмуткаваў, бо тое, што ловіцца ў вечнасці,— яшчэ невядома, ці зловіцца ў век. Няхай недарэмна лавілася — ён сам дарэмны, ён сам без нічога... І думаў, што сёння і рыбіна тая не пераважыць яго надзей.

А яна прыплыла — па абавязку незразумелым... Як гутарылі — невядома, але вядома — сказаў ён: узнагародзь... А яна адказала: ты ўжо ўзнагароджаны. І калі ён ішоў дадому, з яго па-ранейшаму кпілі, бо ён быў ранейшы: у той жа ватоўцы, чобатах, шапцы, якую сам ён сабе пашыў... Але галоўнае ўжо адбылося, ўжо вестка яму далася, што ён недарэмна лавіў, што злавіў найбольш... Ва ўсёй акрузе ні ў кога нідзе не было такіх вагаў і мерак, якія змаглі б замераць яго штодзённую рыбу... О, наша штодзённая рыба, нямая рыба!..

Як неўзабаве сцямнела... І блажыцца... І ўжо не разгледзіш, куды забрылося... Што скажаш, гняды?.. Ты апускаеш пакорліва лейцы: куды-небудзь мусіць давезці апошні конь, куды — яму лепш вядома...

Калосіцца жыта... Абапал дарогі калосіцца жыта, знянацку заспетае — і вы грамадой каля жыта пад

аўтаматнымі рулямі, а ты асобна — ў бялізне: па вопратцы і паставе прызналі, што нетутэйшы, і ўсе разумеюць, што ты сапраўды ўжо амаль нетутэйшы...

Скруцілі табе тытуню ў цыгарку і неўпрыкмет падкінулі: аб роў абапёршыся — курыш... Магічна пасоўваецца паясок агністы, і ўсёю ўвагай, якую займалі такія розныя рэчы, цяпер яму аддаешся. Перасунецца ён дарэшты, і апынешся ты сам-насам перад нечым няўмольным і патаемным, з чым не ўмееў абыходзіцца, перад нечым відушчым і ведаючым, ад чаго засланяюцца людзі зямлёю, і целам, і ўсім жыццём і не адважацца засланіцца. Як затрымаць паясок, не згубіўшы?.. Не затрымаеш — курыш: то прагна зацягваешся, то марудзіш... І бяжыш апантана па жыце, а яно тузаецца пад нагамі, і па твары сцёбаюць узбураныя каласы...

Колькі разоў ты хацеў вярнуцца ў той чаромхавы сонечны куст, у той роў, дзе курыў і не мог накурыцца, у тое жыта, у той чэрвень... і жнівень... і люты...— а ўсё не ўдавалася, быццам тая відушчасць узнікла між вамі і знікаць не хацела...

Заносіла снегам хату, чырвонае сонца вісела цяжка і поўна, па шкле квітнелі марозныя ўзоры, і што было неабходнае, а што не? Ты грэў у печы цагліны, загортваў у рыззё і клаў нам у ногі нанач. І ўсё, што рабіў, было самым-самым, а што не рабіў, не было ніякім.

Курыў свае папяросы і памагаў нам ва ўроках: у сястры арыфметыка і ў мяне арыфметыка, але ў мяне задача аб рыбаках і рыбінах, і загадзя — адказ... Рашалася — не рашылася, і тады мы рашылі па-свойму, насупраць адказу — і незвычайная рыбіна была прыплыла да акна.

III

На самым світанні — і не пачулі — вярнуўся бацька, сам гнядога распрог, сам занёс пад паветку збрую, сам знайшоў, дзе пасвяцца коні, і яшчэ раз вярнуўся, і зачыніў вароты.

## ПАЭМА СЛАНЕЧНІКА

*Бо зямлёй завалодаюць...* І не зашчэплены дзверы, а ў хаце маўкліва і безгалоса — ау, Тэкля!.. Недзе блізка, мо побач, Тэкля і не чуе, што я прыехаў...

Так склалася і зацвердзілася: не прыкмячалася Тэкля сваёй прысутнасцю, адсутнасцю прыкмячалася... Хто стане здзіўляцца, што ў хаты ёсць дзверы, у поля — сланечнік, у неба — сонца?.. Здзівяцца, што няма. З Тэкляй было ўсё ўпору: сонца... сланечнік... дзверы...— а без яе пуста.

Пра каго ні язычылі ў вёсцы? Хоць якія, а ўвага і перамовы...— а пра Тэклю? А што пра Тэклю?.. Пацепнуць плячыма: Тэкля як Тэкля, нічога новага,— быццам жывою лічылася, а сапраўды не жыла...

Кожны нешта меў для сябе і бярог для сябе: хто маёмасць, хто грошы, хто ўборы, хто веды...— ашчаджаў, памнажаў, раўнаваў... Толькі Тэкля, штодня і заўсёды,— нічога: ашчаджала не для сябе, памнажала не для сябе, раўнавала не для сябе: проста так — для зямлі, для жывёлы, для птушкі, для дрэва, для хаты, для нас...

Каб згубіць што, здаецца, і то не мела б: чужая, прыйшла на чужое і пры чужым спынілася... Але каго, ідучы з пашы, пазнавала Красуля, каго абступалі куры, каму вяпрук падаваў голас і з чыіх рук падымаўся сланечнік?!. Як бы ўсё без яе абязроднела і пагубілася!..

Непараўнаная пайка Тэклі ў нашым жыцці супольным: усёй маёмасці стала б замала, каб з ёю разрахавацца... Іначыліся абставіны — і ўжо інакшыя: не Тэкля, а мы ў яе на ўтрыманні... І ўсе нібы разумелі гэта і забываліся адначасова, і на яе забываліся.

Не плацілі ёй ад пачатку: от, заплаціцца неяк адразу... Палічы, Тэкля, колькі вінны табе мы за ўсе гады. А Тэкля не надта лічыць умее: перачакаецца сёння — і ўжо забудзецца сёння — *бо іх каралеўства нябеснае* — і на сябе забывалася Тэкля таксама.

Што адбывалася ў гэтакі самы дзень летась, і пазалетась, і яшчэ раней?.. Промні доўжыліся і не вярталіся, а калі вярталіся — то зямлёй... Ні гадзінніка, ні календароў не існавала для Тэклі. Яе век быў пры ёй:

адна доўгая ноч за спіной і адзін доўгі дзень прад вачыма, адна зямля пад нагамі, а сонца — над галавой.

Ва ўсіх свае дзялкі, свае заняткі, свая самастойнасць — яна адно служкавала: зрабі, Тэкля, паглядзі, Тэкля, падай, Тэкля... Рабіла, глядзела і падавала, і меркавання свайго не мела.

Пагаджалася толькі... Скажа хто-небудзь: «Душу выкладай, старайся — а дзеці пабольшаюць і дзякуй не скажуць, можа...» (Нібы ад людзей залежала, ці нараджацца дзецям...) Але і дзяцей не было ў Тэклі. Каму не сталася маці, як чула, жыло неабдымна ў зямлі і свеце і прывячала здалёк, і гукала: ау, Тэкля!..

«...Бывай, выбачай, калі што і бясконцы дзякуй»,— сказалі на развітанне гаспадары-хутаранцы і выехалі ў Амерыку. Калі сваякам лютавалі, прыгадвалі Тэклю нязменна, і роднае сонца, і поле, і каля -хаты сланечнікі... А Васіль, што сказаў ей: чакай — наказаў ей чакаць — сам з вайны не вярнуўся. Але Тэкля чакала...

І, пэўна, не Васіля ўжо, тады — каго?!. Ніхто не знайшоўся, хто б наразуміў, дый не пыталася Тэкля ні ў кога пра тое, што плакала і спявала ў яе душы. Сама па сабе — *будуць бачыць*...— нібыта сама без сябе, дабрыню ў жыцці адкрывала і ёй адкрывалася: мабыць, сонца было ў дабрыні і, мабыць, яно, не распытваючы нічога, на ўсё адказвала.

І не ставала Тэклі, каб нешта злаўчыць ці скеміць... Лаўчылі астатнія, астатнія кемілі: во як патрэбна, вучыся, Тэкля...— астатнія ўзносіліся і ападалі, спяшаліся і віравалі, а ў Тэклі і розуму не было на гэта. Нейкі абсяг раўнюткі, нейкае поле жывое ў ёй зацялося і ўсю заняло. Ні пустазелля на ім, ні дзялак — адно высока, і сонечна, і задумна плывуць угару сланечнікі і падымаюць з сабою поле.

Не ўмела злосці таіць і нават злавацца не ўмела... Калі пакрыўдзіш жывёліну, птушку альбо расліну — як яны адзавуцца?!. Але паўставала — *пацешаны будуць* — за іх... Што за іх паўставала, пярэчыла і спыняла, і гаварыла за іх: не руш?!. Не руш, о, не рушце Тэклі!..

Вялікае і малое — усе называлі яе аднолькава: Тэкля. Яна не абразіцца, не загневаецца, але адкажа. А

называлі б інакш — і не паверыла б, пэўна, што гэта завуць яе.

Змяняліся ўборы, змяняліся грошы, змяняліся веды, змяняліся...— але дакуль?.. Усё супыняла настойліва самая большая змена і ўсё захоўвала смерць.

Як жывецца, як маецца? Што б ні здаралася — заўсёды казала адно: па-маленьку — быццам самаю меншай сябе ў жыцці адчувала, быццам самую меншую справу рабіла... Не казаць жа пра поле: што як непрытомная часам на ім застывала, не казаць жа, што рыкала ноччу карова, не казаць жа, што думаецца без думак, а пра што казаць — невядома. Як жывецца, як маецца, Тэкля?.. Хто яго ведае, як жывецца.

Дакаралі мяне — правінюся альбо насваволю — не дакарала Тэкля. Усе ведалі, дзеля чаго дакараюць, а Тэкля не ведала д з е л я ; усе бачылі адначасна цяпер і потым і бачылі параўнанне, а Тэкля мяне проста бачыла. Заўсёды дароўвала Тэкля — даруй і цяпер таксама.

Што я ў кнігах вычытваю, дагэтуль не вычытаўшы?.. Быццам ведаю, Тэкля, а мовы бракуе, быццам веданнем не сказаць. Памажы, калі можаш, няведаннем, бо цвітуць як раней, бо цвітуць залаціста, цвітуць пераможна — *названыя будуць* — сланечнікі... Ды няведанне Тэклі — яна сама.

Ніхто і ліста не прыслаў ей ні разу, хіба што аднойчы — калі пераблытала пошта вёскі... І то было ўцешна. Так доўга чакала лістоў і людской пяшчоты, а людзі чамусьці рашылі, што Тэкля абыдзецца і без іх.

Адно — ушчувалі: вучыся. Я спачатку тлуміў алфавітам — навучалася свайму прозвішчу: Лес, а зямля, як магніт, усё забірала, і зноў заставалася Тэкля без алфавіта, без прозвішча, без сябе. Накшталт солі — *насычаны будуць* — ва ўсім раствара лася, і ўсё было ёю змястоўна.

А ўсім надзіла неяк, каб Тэкля сабралася, ускрышталілася, каб была да абставінаў розных і выпадкаў... О якая падзея: Тэкля ўмее ўжо распісацца, і прыносіць ёй паштальёнка штомесяц сельсавецкую пенсію. І бянтэжылася сама, і здзіўлялася Тэкля сваім магчымасцям: а каб жа вучылася...

І ні казак, ні песень альбо пра сябе расказаць — не ўмела: ...нарадзілася ў цёмным лесе, гадавалася ў цёмным лесе, лес пасеклі, а я засталася цёмнаю... І засталося лясное прозвішча — а прозвішча не змяніла. Ды абяцала Тэкля: мы пойдзем далёка-далёка, за лес далёкі.

Лес адступаў за пазем — падступала пустка. Адступалі зямля і сонца: брук для хады і лямпачка для святла... І адступала кудысьці Тэкля — ау, Тэкля!.. Кожны раз усё роўна выходзіла Тэкля на голас, усміхалася і ўздыхала, і ўжо не казала: пойдзем далёка...

Адваротнасцю многая праўда, дабрыня — адваротнасцю... Можна цёмным сабе быць і можна — разумным, але добрым — *яны атрымаюць* — а добрым ужо не сабе, і нядобрае пахаваецца. Што падслухала Тэкля ў зямлі і сонца і пры сабе паўтарыла няўцямна?

Не па словах — хто што гаварыў на каго, не па хібах людскіх ці ўдачах, па іх асабіста Тэкля ставілася да людзей. Ёсць галоўная кніга, якую чытаем-пішам,— мы самі, і галоўнае поле, якое праз век выраблям,— самі... Хто пісьменны тут, а хто цёмны, навучы, Тэкля.

Слабеюць лёгкія рукі, цяжэюць ходкія ногі — зямля ўсё мацней прыцягвае... Амаль не хварэлася Тэклі ці, можа, так уяўлялася толькі — быццам і болю свайго, і хваробы не выпадала мець Тэклі.

Рухалася і знікала: гадаванне... паенне... сеянне...— бы ў ненажэрную прорву знікала жывое і дзеля жывога турботы. Зноў сустракаецца Тэкля — нібы ўпершыню — з зямлёю: не завершаная, о незавершаная зямля... Што дасюль не ўзяла — усё роўна возьме, што дасюль не вярнула — усё роўна не верне.

І зямля — у жыцця, і ў жыцця — людзі. Дык адкуль адхіленне ўзялося, нібы свае свайго не пазнала і разышлося бязрадасна?.. У якім адхіленні я, у якім адхіленні Тэкля і астатнія — у якім? Чаму пазнаюцца марудна людзі, бо, не пазнаўшыся,— трацяцца?

Бо яны атрымаюць... насычаны будуць... названыя будуць... пацешаны будуць і будуць бачыць... бо іх каралеўства нябеснае... бо зямлёй завалодаюць...—

гэтага, нават гэтага, быццам самую сябе, не ўгледзела і не распазнала.

Заменіцца кніга кнігай, хлеб — хлебам і поле — полем: прытомяць жыццём — падмацуюць жыццём, спытаюцца пра жыццё — і пра жыццё раскажуць.

А дзе ўзяць другую Тэклю?.. Не пакідай нас, Тэкля: у мяне адна мама — мама, другая — Тэкля... Ау, Тэкля!.. Ціха-ціха насустрач, павольна-павольна, паварочваецца сланечнік.

## ПЕРШАЯ ПАЭМА ШЛЯХУ

Канчаўся горад.
Я хацеў паспець.
У вышыню ўпіналіся званіцы,
і вартавыя вежы свой цяжар
трымалі змрочна: што яны вартуюць?
Панурыя муры...
прыцяты брук...
глухія камяніцы...—
што ні скажаш,
сам не пачуеш...
Што каму казаць —
я з горада яшчэ не выйшаў.
Ніводнай простай вуліцы — усе
з намекам нейкім, нейкім паваротам,
бязвыйсны час...
А я хацеў паспець,
хаця аднойчы трапіць не ў сутонне,
аднойчы паглядзець: ці дзе што ёсць..
Мяне стамляе горад непрытомны.

Я не паспеў. Сутонне надышло,
нібы правал:
ці ёсць што дзе — не бачыў,
нібы мяжа:
на ёй канчаўся свет,
нібы заклён:
што значыць гэты горад?!.
Я не вяртаўся — ў роспачы стаяў:
не чуў... не бачыў... моцы не ставала
сюды спяшацца, а назад брысці
між камянёў,
да камянёў туліцца,
самому камянець...
Я прападаў,
канала сэрца, думка западала —
і я ступіў наперад:
кім я ёсць?!.
І кім не ёсць?!.
Ступіў, куды — не бачыў.

Я голас чуў.
Не бачыў я сябе.
Мне голас гаварыў.
Яго не бачыў.
Быў у сутонні і з сутоння чуў...
Пытаўся голас: хто ты?!.
Я адказаў і сам сябе пачуў —
да слыху дакранулася маўленне,—
што ведаў і не ведаў: гэта я...
Так, гэта я...
А болей немагчыма
сказаць што-небудзь, я заўжды маўчаў
і голасу свайго не чуў ніколі.
Так, гэта я...
А хто я — не магу
цяпер сказаць, сказаў бы — памылюся..
Я сам сябе праз горад пазнаваў,
а ён мной ані разу не азваўся...
Так, гэта я...
Я горад пакідаў,
а ўсе не мог пакінуць, быццам нехта
яго прыснiў —
я ў нейчы трапіў сон:
як ні выходзь — сутонне напярэймы...
— Ступі далей,— мне голас загадаў...
І я ступіў...— убачылася ззянне;
пяшчотнае: нібы яно цвіло,
разумнае: не рэзала пагляду,
я разабраўся: голас быў адтуль...
Ён зноў пытаўся: хто ты?!, назавіся!..
І верад свой я ў словы пераклаў...
...Я голас выдзіраў з сябе:
бы плеўку,
нібы хваробу —
выдраў і шпурнуў,
а ён упаў і, ўпаўшы, варушыўся
і да мяне цягнуўся...
Я хацеў
сказаць, што ён дарэмны,— і не здолеў..
Так і цяпер...—
не здолею сказаць,

не здолею назвацца,
                                        бы дарэмны,
незразуметы ззяннем,— перад ім...
Я сам сабе не ведаю імёнаў.
— Ступі далей,— штурхнулася ў грудзях.
Я зноў ступіў — і ў ззянні апынуўся.
Ім ахінуты, сам сябе не меў,
бы раставала цела безбалесна...
Пытаўся голас...
                                Што я мог сказаць,
што мог я сцвердзіць?
Гэта быў мой голас...
Ён ува мне быў, ён пытаўся мной
і мной чакаў.
                                Я адказаў па-свойму:
ты ведаеш, кім ёсць я,
                                        кім не ёсць,
сам назаві мне ўсе мае імёны,
адно імя,
якое мушу мець
                                перад адзіным.
Я не адзінокі,
я адпаведны...
Прагучаў здалёк
і адвярнуўся голас: назавіся...

Прыкуты да зямлі, на ланцугу,
вялікая зямля — а я нявольны,
гладжу перад сабой —
                                        прасторны зрок:
у ім я сустракаюся з прасторай;
і думаю: што значыць мой палон,
калі сінее неба неабсяжна,
калі вада хавае глыбіню,
калі зямля не месціцца ў палоне?!
Сябе не адчуваў тады, бы сам
і небам і вадою станавіўся,
не часткай іхняй, але ўсім, і ўсёй,
і ўсёй зямлёй:
яна мяне гаіла...
І звон — не ланцуговы — наплываў...

Ланцуг быў лішні, але ўсё на месцы.
А ці на месцы я?!.
У цёмны час —
не мог супрацiўляцца iм i бачыць
я iх не мог —
адгэтуль i адтуль
дзве цёмныя iстоты адначасна
прыходзiлi...
Штоночы памiраць
наканавана целу:
раздзiралi —
яно крычала моўчкi...
Хто яны?..
Што пра мяне вядома iм?!.
Зiхоткi
мне голас быў: скажы, што ты свiння!..
I быў другi: скажы, што ты сабака!..
А я маўчаў — не здолеў гаварыць...
Пакута пераконвала ў iнакшым,
пакута адкрывала: кожны раз
ты здолееш сказаць так — гэта мала.
Яшчэ не час, для большага трывай!!!
I я трываў.
Я той, хто неназваны...
Яны знiкалi з цемраю.
Зямля
мяне гаiла.
Дзiўныя iстоты —
што iм патрэбна: мучылi мяне,
нiбы такi я быў недастатковы.
Хто мае цела — ходзiць па зямлi,
а я iшоў праз цела, нерухомы:
яно мой шлях,
бязмежнае яно...
I адчуваў, што некуды выходжу.

Я пасярэдзiне —
валочыцца ланцуг,
як напамiнак, што цяпер я вольны,—
а па баках сабака i свiння,
у белым днi:

таемныя істоты.
Яны суправаджаюць і вядуць...
Пясок сыпучы трэцца пад нагамі,
сінее неба,
мора-акіян
бяжыць у нерухомасці.
Нічога
ніхто не кажа, нібы ўсё і так —
настане час — і стане зразумела.
А ўжо раскалыхаліся пяскі,
скрануліся і рынуліся ў неба,
і застагнаў-хіснуўся акіян...
Хто быў са мной — прапалі вокамгненна.
Нарвалася віхура —
я ўжо ў ей...
Над гібельнай вадой ужо —
я гіну...
Я падаю, бы камень...
Прагучаў:
скажы, што ты свіння!..—
ў той момант голас.
I я паспеў: я той, хто не свіння...
я той, хто не свіння...—
паспеў прамовіць
і закруціўся, згінуў...
I туды,
адкуль узяўся, ўпаў, як непрытомны...

Стаяў сабака побач — ён чакаў.
Другое не было,
я азірнуўся:
а дзе свіння?..
— А я ўжо не свіння,—
пачулася ў паветры непарушным.
Ідзем далей.
Удвух цяпер.
Ланцуг
назад распасціраецца, бы хоча
вярнуцца да ранейшага, калі
ён быў пры ўжытку зразумелым...
Віхура — зноў...

І зноў я над вадой —
над пашчай ненасытнай...
Быццам камень...
Не камянямі пашчу насычаць...
Як мне бездапаможна!..
Я не помніў:
я ёсць або не ёсць...
Пачуўся зноў,
зноў голас быў: скажы, што ты сабака!..
І зноў я адказаў наадварот:
я той, хто не сабака...
І на бераг,
бы сэрца абарвалася, упаў...
Нікога не застаў.
Я ачуняў.
Пайшоў адзін, але не адзінокі.
Адным канцом нявольны,
а другі
я падабраў, ім звольнены...
Самохаць
нясу ланцуг — выходжу з ланцуга.
А не данёс... не выйшаў...
На пясок,
уражаны, прыпаў...
Рухомы вір,
бы нечакана, вырас у прасторы
і, ўкручваючы неба і зямлю
ў сябе самога, у знішчальны танец,
у скон, у бездань,
рухаўся сюды...
Жахаўся я глядзець:
безабаронны
мой кругабег, які мяне сцвярджаў
і адмаўляў...
Я ўрынуты ў віхуру...
Зіхнула ззянне, быццам апякло...
І голас адазваўся, бы напоўніў
да самай рэшты...
Я хацеў паспець...
Ён спапяляў...
Кім быў я?!.

Назавіся!..
Сарваны з месца,
падаў акіян,
і мільгацелі вобліскі і ўсхліпы...
Растурзаны:
...я той, хто не свіння...
Блукалі сны:
...я той, хто не сабака...
Вада і жахі тыцкаліся ў твар
я ў многіх тварах
гіну не сказаўшы
трапляю ў горад
з горада іду
іду не я
пытаюся я хто ты
за шыю абдымаў ланцуг
я быў
сабака і свіння яны сцвярджалі
яшчэ трывай
яшчэ ступі далей
па-за табой сустрэча немагчыма
я быццам плеўку голас выдзіраў
і адшпурляў а голас варушыўся
ён гэта я
мяне ўжо не было
а словы гаварыліся пачута:
я той хто шлях і хто па ім ідзе...

Ачнуўся я...
Мне чуўся ціхі звон...
Я прахапіўся:
гэта быў *мой* горад,
далёкі горад...
Ён нібыта плыў,
ён азываўся —
я пайшоў насустрач.

## ПАЭМА ГАРАЧАГА ЛІСЦЯ

Ты назвалася *амяла:*
мая мілая —
не людская...
Зорка горкая нас вяла,
прывяла ўжо:
крывёй сцякае.

Ты *назвалася...*
Назаві —
засяроджаныя аўтапілоты —
ненароджанае...
Лезавы
наш прасцяг...
Не настане потым.

Неразгорнутых кніг тамы...
Што самое сябе баіцца?
Азіраешся:
«Гэта мы?..»
Гэта — бальніца.

Мы адно аднаго аддаём.
Цемра цяжкая, нібы дзёгаць.
Апынулася неба дном:
дом —
у ім табе дапамогуць.

Голас голы:
не гавары...
Допыт ранішні і вячорны.
Гукі белыя —
павадыры.
Паскідаюць халаты —
чорна.

Я прарок твой:
цябе выглядаў,
я выходзіў да плота маліцца...
Смяг табою і галадаў...

А разгледзеў:
прыйшла бальніца.

Ноччу зыркаю, вешчавой
што абвесціцца? —
лезавое...
Херувімчык —
пазнаеш:
твой —
нахіляецца над слязою.

Твары цьмяныя насупор
узіраюцца:
смерці збыцца...
Запытаешся:
«Гэта сабор?..»
Гэта — бальніца.

Што настане?..
Услед пайсці —
бы напнецца паветра —
не ўпусціць...
Ты ў гарачым маім лісці.
Я адцяты ад нас:
у пустцы.

Мозг раздрапвае вастрыё.
Урастае ў зямлю зямное,
а нябеснае не мае:
як замок —
прада мной... за мною...

Жыў Іполь...
Бы сцвярджаў абрад —
атуляў жываплотам поле...
Прывітаецца:
«Ты мне брат».
Развітаецца:
«Сні Іполя».

Я з вужакаю і савой...

Гавару сябе, як цытату...
Ды ўсёй боскасцю —
сам не свой —
адчуваю, што я адцяты.
Выбіралі:
куды ісці?..
Усё роўна з дарогі збіцца.
ТЫ У ГАРАЧЫМ МАІМ ЛІСЦІ...
Гэта — бальніца.

Я далоні складу замком.
Замыкаецца блізкасць збоем.
Безнадзейнасць глядзіць з вакон.
Нахіляешся:
што з табою?!

Уладар твой —
                    на дабрабыт
зараблялася:
раб вантробаў...
Ты мне рада...
сабе забрыд:
зарабляецца на хваробу.

Дні -
          стракатае шкамуццё.
Ці скажу каму:
будзь мне братам...
Забівае мяне жыццё.
Выжываюць дэ-
                              генераты.

Нам няпроста.
Працяг крывы,
і пранізана блізкасць болем.
Іншароднае — у крыві.
Зорка цёмная
над Іполем.

(Перашэптваюцца жрацы...)
Ўваскрэшу —

дзе ўзяць жменьку тлену?!.
Гай
            святой
                        *АМЯЛЫ...*
На шпрыцы
панаторкваліся антэны.

Рэжуць парасткі прастаты.
Бачу мозг свой:
мне ў ім адбіцца...
Перахрысцішся:
«Гэта ты?!.»
Гэта — бальніца.

ТЫ НАЗВАЛАСЯ...
Гледачы
разглядаюць сябе:
відоўня...
Ненароджанае —
ўначы.
Бы савіныя вочы —
поўня.

Адбіраецца мова:
                        смяг,
галадаў ёй,
а ўздых кароткі...
Нам няпроста:
крывы прасцяг...
Адцінаюцца ў цемру продкі.

Шлях — панылая кавяла.
Смерць наклікаеная
зайздросцей.
ТЫ НАЗВАЛАСЯ *АМЯЛА...*
Выжываюць імхі і бросня.
Іншароднею —

не грашу...
Забываю,
            з якога роду...

...ШТО З ТАБОЮ?!.—
ў маю душу
ужыўляюцца электроды.

Замарожвае словы лёд.
Зоркі цэляцца,
                    як байніцы.
Здагадаюся:
«Гэта палёт...»
Гэта — бальніца.

Бы вужака ўзбуджаецца —
ртуць...
Будзе мозг мой хвароба жэрці
не жыхар,
затужу вярнуць
не сябе ўжо,
а нас ад смерці.

Што мільгала
                    ў душы і ўваччу
уваскрэсіцца да драбніцы...
Ашаломлены,
прашапчу...
А пачуе мяне — бальніца.

Не світала —
зноў вечарэць:
час адцяты...
сляпыя кадры...
Адчаканена ў профіль смерць:
выліваецца квадра ў квадру.

Сон —
          скамечаная прасціна.
Цемра торгаецца ў задусе.
Ўсе названа...
Ўсяму цана...
Я пад імем тваім кладуся.

Твар прыцемнены

                        у вакне:
дзева-маці!..
А сэрцу біцца
у замкнёнае:
не адамкне...
Гэта — бальніца.

Азіраешся:
не мая...
Клікаць буду цябе —
людскую...
*Я* на скальпелі вастрыя.
*Што*
     *ў гарачым*
                        *лісці*
                                   *цікуе?!.*
ТЫ НАЗВАЛАСЯ *АМЯЛА...*
1977

## ПАЭМА ЗАПАЛЕНЫХ СВЕЧАК

Круціўся хмыз.
Бяссувязны язык
хваліў жыццё.
Заблытаныя сьвяты.
Празрэнні апярэджвалі разлік.
А людзі разумелі:
блазнаваты.

Клаў вогнішчы.
Сам побач клаўся.
Дым
шукаў сваё.
Шаптала штосьці лета.
А над шурпатым розумам тваім
згушчаліся зіхоткія сусветы.

У полымя апранутыя —
сніў,—
крычалі птахі:
бацька твой галодны.
А адыходзіў —
вогнішчы гасіў.
Каб адысці — пагаснуць неабходна.

Узбоч жыцця пазначацца крыжы.
Чым захапляўся —
тое наракае.
Прыручаныя рухі.
Адкажы,
куды ідзеш?..
Ішоў да небакраю.

Усюды — ты:
крывая іпастась.
Каб распрастацца —
мкнуцца да экстазу
пытанні,
што не ўмеюць папытаць,
што адказаць не здолеюць,

адказы.

З-пад рук — пясок.
Жывое — спарышы.
Паруш ваду —
патайнае парушыш.
А бацька гаварыў:
не церушы —
у матчыныя вочы нацярушыш.

Чароды сноў.
Празрэнні — з чарады:
ўдрукуюцца ў цябе,
нібы ў вашчыну,—
зайсці у неймавернае туды,
адкуль ужо вярнуцца немагчыма.

Круціліся сцяжыны:
дзе чыя?
Жыццё разгаліноўваецца
ў спробы.
Аголенае
сэрца
ручая.
А рэчы ацярушваюць аздобу.

Хто сустракаўся —
ўжо той не чужы.
Праточыцца сутонне пад павейкі.
Прад чалавекам зоркі і крыжы.
Куды? — пытаўся. —
Усім было данекуль.

Падзел яднае.
Адкрыццё — на раз.
Жыццё перабірае іпастасі.
Змяркаецца
прыручаны
абраз.
А бацькава вячэра засталася.

Напружваюцца пільна зрэнкі з'яў.
Што набываў —
адхіліцца ў прапажу.
Куды жывеш?
                              імёны называў,
якія ўспамінаў:
жыццё пакажа.

Дзе ў немачы,
дзе ў моцы — пазначай.
Празрэнні адмаўляюцца ад ежы.
Да сэрца
дакранаецца
ручай.
Я не сабе —
                              сваё шукаў —
належу.

У зрэнкі зазіраюць груганы.
І лёс
                 свае дарункі
                                            забірае.
А бацька прыўзнімаецца з труны:
удзень і ўноч ідзі да небакраю.

Праточваўся пясок.
                                            Да нейкіх меж
ты набліжаўся.
У сабе не ўжыцца.
Дагэтуль — ты.
                              Прачнешся і заснеш.
А ўвечары падыдзеш да бажніцы.

Пытанні
                 рассяроджаныя
                                                          ў днях.
Вышэптвае
сутонне
запаветы.
І будзе бразгатаць падзёрты дах
і — зазіраць у сэрца іншасветы.

О думка неўтаймоўная, бяжы!..
Я — небакрай.
У немачы знайдзіся.
Ія — хада:
усюды па мяжы.
А бацька патрабуе:
нарадзіся.
Дыханне свечак.
Смутак абразоў.
Зіхоткасцю аздобленыя строі.
Адшукваўся сцяжынамі разоў.
А сам ужо апрануты ў старое.

Груган
            наскрозь
                        твой розум
                                    прадзяўбе.
Назваць збіраўся,
ў пераліках спробных,
без імені,
адгэтуль ты,
сябе —
апошні між усіх аднаасобнік.

Я чалавек:
я смягну і тужу.
У разважанні ўблыталіся рэчы.
Што пра сябе —
                        спытае хто —
                                    скажу?
У пустцы прызначаюцца сустрэчы.
Адлікі апярэджвае хада.
У розум удрукоўваецца нешта.
Сабе і бацьку.
Горкая вада.
Вандроўнікі
                        натоляцца
                                    дарэшты.
Што з некім адбылося,
што з табой,—
адрозніваў.

Пясчаны пошап смагі.
Над размаітай памяццю былой
заззяюць пакручастыя працягі.

Распростанае свята
зацвіце.
Імёны пазнаёмяцца нанова.
Сам без сябе,
                    ў шурпатай пустаце.
А рэчы рэпеціруюць прамову.
Людскія — лесы.
Скрыцце — ў адкрыцці.
Ужо бездапаможныя,
                              калені
укліняцца ў пясок —
пераўзысці
зацверджаныя межы і ўяўленні.

Захопліваюць рухі пустату.
І думкі адхіляюцца ад спрэчкі.
У іншасвеце
                  хмызам
                              прарасту.
Ад вогнішча
запальваюцца
свечкі.

## ПАЭМА ЧЫРВОНЫХ ВЯРОВАК

Жаўцела лотаць.
Вецер ею пах,
і хваляваў,
і вабіў у вандроўкі,
і абяцаў, што там...
А на слупах
вагаліся чырвоныя вяроўкі.

Замкнёны ў год
зламаўся краявід
і паказаў таемнае.
На зломе
увасабляўся тварамі нябыт
і ўсё наўкол,
кім ёсць яно,
знаёміў.

На часткі — шмат:
распалася шкала.
Чаго хто варт? —
пыталіся тавары.
Наступнасць адступалася.
З-за шкла
глядзелі перакуленыя твары.

Далёкае і блізкае
ўпрытык
і ломячы сустрэчаю
значэнні,
сыходзіліся:
позірк не прывык
і вынаходзіў розум
тлумачэнні.

Рос недарод.
Стаяў квадратны год:
стагоддзі абаперліся —
падрубы.
На ўсіх пляцах

аб'яўлены ўзыход
вёў патаемна
у глыбіні згубы.

Мяне спынялі:
нельга націяньі.
Аблытаны чырвонымі
сцяжкамі,
я жыў нідзе,
нікому.
Пацукі
адважна верашчалі за мяшкамі.

Сціскалася прастора,
як сіло.
Час абяцаў:
не пашкадуе плёну.
Употайкі —
пакуль не рассвіло —
усе наўкол
закопвалі імёны.

Каб разам быць:
відушчы ці сляпы —
ніхто не можа
мець з жыцця карысці.
А рассвіце —
падымуцца слупы.
Мы пра нябёсы
марылі калісьці.

Свае імёны:
аддзялялі — кроў.
Ёсць я і ты.
Але ты плачаш з жалю.
Парадкавыя твары
ў нумароў.
Чаго хто варт —
па іх распазнавалі.

Не тоячы ні радасці,

ні слёз,
ты мной жыла.
І лотаць — для адвару.
Ёсць ты і я,
а паміж намі — лбе,
і ў лесу
пераменлівыя твары.

Акрэсліваўся ўчынкамі.
Цякло
жыццё далей.
Я прыпыняўся нечым.
І краявід накрэсліваў
на шкло:
каб ён застаўся —
вечнае нявечыў.

Страх краўся ўслед.
Хаваў, як запавет,
імя свае ўнутры сябе.
Вяснова
мне не цвісці, як лотаці.
Паэт
агучваў перакуленыя словы.

Пакінуты
разгляду і суду:
пад нумарамі
вартасці і вады,—
я з сутнасцю
аднойчы супаду.
А пацукі захоплівалі ўладу.

Ашукваецца розум
спадцішка.
Пасылкі назапашаны
ў каморах.
Хто ні ішоў —
твар унутры мяшка:
павыгрызаны дзіркі
ў некаторых.

Пытаўся:
хто вы?
Быў адказ:
мільён.
Знадворны плот
з унутранага плота
ўзнікаў і паўтараўся.
Плен — палон,
калі ён аддзяляе
ад палёту.

Хто вёў — спыняў.
Пад позіркам касым
дзялілася, што ёсць,
на шмат і мала.
А што было ўнутры —
на дзіва ўсім,—
нібыта не было яго,
маўчала.

Наўкол казалі:
«Радуемся дню».
Не ведалі:
пахмуры альбо зыркі,
ён у вяроўках —
нібы ўвышыню,
скруціўшыся,
выцягваліся дзіркі.

Шукаў цябе.
Мо адгукнешся, мо?..
Мяшкі — каб ашукаць:
ад недароду.
І сам змаўкаў:
мо спраўдзіцца само?..
Ратунак абяцалі перашкоды.

Не гэткія,
ці ўспомнімся:
свае.
Адбіткі з твару —

можна кратаць:
блізка.
Каб разам быць —
душа не пазнае.
Дзе ты,
дзе я —
знаходзілі па спіску.

Цікавіліся:
нумар — для арэн.
І цікавалі:
радуюся сховам.
І быў адзіны змест
у перамен:
як апынуцца ў целе
пацуковым.

Упісаныя ў пляц,
нібы ў квадрат,
у век наступны
слаліся пасылкі.
Утоптваючы грунт,
ішоў атрад.
Патыліцы прадбачылі
памылкі.

Я мыюся
слатою і жарствой.
Зламаны год —
ці змыюцца пячаткі,
накрэсленыя ім?
Я ўжо не той,
кім краявіду
бачыўся спачатку.

Сам перашкодай стаўшы
насланню,
я перашкоду
адсланю вачыма,
каб хоць здалёк
убачыць светлыню —

дзе апынуся некалі —
айчыны.

Страх адступаўся.
Вецер ёю пах:
каб мелі шчасце
ўваскрасаць і лётаць,
усходзіла
ў дзіравых чарапах,
паволі распускаючыся,
лотаць.

## ГЛІНА

**1**
Ніцма ляжыш
І ў глыбокім сненні
Хаваеш сваю душу.

Загавару з табою —
Адкажаш,
Але не пачуеш.

Рукою цябе крану —
Запомніш,
Але не ўбачыш.

Ты ў самым пачатку часу,
Дзе Бог
Разрознівае-разасабляе
Свае раўнаісныя іпастасі —
Жыццё і Смерць.

**2**
Няма ні набытку,
Ні страты.

Насенне чакае
Сваёй пары —
Замкнёнае ў сховішчах сэнсу.

І не спяшаецца прыгажосць
Сабрацца
У келіху кветкі.

Магчымасць шукае сябе,
Даючы
Гліне
Свае найменні.

**3**
Чакае,
Што з ею нешта адбудзецца,

Але не ведае —
Што.

Хоча,
Каб тое,
Чаго чакае яна,
Адбылося,
Але не можа даўмецца,
Адкуль яно можа ўзяцца,
Калі няма яго ў ей
Цяпер.

Што ні трапляецца ёй,
Адпускаецца неахвотна.
Раствораны ў ёй
Магічная сіла,
У ёй
Прадугадваецца жанчына.

**4**
Усе пакідаюць у ёй
Свой след —
Нібы пазначаюць месца,
Куды вярнуцца.

Але не вяртаюцца.

Гліна:

Адзіная спадарожніца,
Для якой
Ніхто не бывае мінулы.

**5**
Не хоча,
Каб яе бачылі
І разумелі,
Але сама хоча бачыць
І разумець.

Яшчэ ўсё магчыма —

Яшчэ
Сіла не варагуе з сілай
І не смуткуе па смерці.

Яшчэ
Слова само сябе чуе,
А вобраз —
Бачыць.

Размова пра н е ш т а ,
Што доўжыцца з веку ў век,
Але не можа ні скончыцца,
Ні пачацца.

**6**
З радовішча сну
Абуджаецца,
Каб нарэшце
Прачнуцца нечым

Альбо сабой.

Вада забірае,
Агонь збірае,
І думка знаходзіць у ёй
Сваё падабенства.

Цяпер сцеражыся,
Каб не памерці

Раптам.

**7**
Захоўваешся ў цяні
Усіх рэчаў
І ўсіх істот
І ў сабе
Захоўваеш сэнс,
Ім яшчэ не вядомы.

Каб насампраўдзе

Прысутнічаць кожны раз тут,
Даецца,
Быццам сляпому доказ,
Сама сабе
Ў рэчах і ў постацях
Рэчаіснасць.

А гліна
Усё пераконвае ўсіх,
Што можна
Бачыць не гэтак,
Што можа
Усё быць інакш.

**8**
Нешта сабралася
І разышлося,
Але засталося ў памяці

Разам.

Нібыта і ёсць яна
І нібыта
Яе няма.

З іншага часу
І з іншай прасторы:

Калі да яе набліжаешся —
Адступае,
Калі адступаешся ад яе —
Трымае.

Памяць,
Якая нікому ўжо не належыць,
Але якой належаць
Усе.

**9**
Паволі альбо раптоўна
Мы адхіляемся

Ад задум,
Якія хацелі
Спраўдзіцца намі,
Калі не чуем,
Ці адгукаецца наваколле.

А самае простае,
На што не звярталася ўвагі,
Спраўджваецца цяпер
І застаецца заўсёды.

Блукае,
Шукаючы павадыра,
У гліне навобмацак

Сонца.

**10**
Упісаная ў прастору,
Абжытую ўсімі,
І ўсім свая,
Усталёўваешся ў адлегласць,
Якой немагчыма парушыць,
Каб апынуцца
З далёкім побач,
А з блізкім яшчэ бліжэй.

Безліч нераспазнаных
Сузор'яў
Спластоўваецца ў табе
І раствараецца мноства
Млечных Шляхоў
Невядомых.

Ціхмяна ляжыш,
Утуліўшыся ў глыбіню,
Галактыка
Іншага вымярэння.

**11**
Пад чорнай карою глебы

Белы хлеб плоці.

Не памятае,
Ці, як зерне,
Апала яна з вышыні,
Ці ўзышла з глыбіні,
Ці проста
Тут затрымалася выпадкова.

Дух,
Што стаў плоццю,
Але перастаў быць
Духам.

**12**
Любіць,
Каб яе лашчылі,
Песцілі,
Бралі ў рукі.

Тады яна ажывае,
Тады яна робіцца
Чуйнай і паслухмянай
І вучыцца разумець
Чалавека.

Можа, чакае,
Што ён
Вылепіць з яе тое,
Чым сам дагэтуль
Яшчэ не здолеў зрабіцца,

Ці, можа,
Наадварот,
Вернецца ў яе лона —

І свет
Нанава стане райскім.

**13**
Галеча

Цябе ачышчае,
Спакой прасвятляе.

Аблокі
Спыняюцца над табой,
Ручаі
Хочуць завесці
З табой размову.

Празрыстая для сябе,
Зацемненая для староннх,
Яднаеш
Выток і суток,
А сама
Застаешся на месцы
Сам-насам з усімі —

Выйсце,
Замкнёнае нацянькі.

**14**
Перацякаеш
З самое сябе
У сябе самую.

Няспынны кругазварот
Унутры
Адсутнай прасторы,
Дзе думка,
Калі яна пранікае
Ў прычыну
І асягае вынік,

Знаходзіць, што страчваецца,
Рэчаіснасць.

А рэчаіснасць
Распазнае, што яна
Насампраўдзе ёсць

У несупыннай сустрэчы

З сабою

Іншай.

**15**
У нетрах зямлі
Вы сняваеш паволі.
Чакаючы,
Што ў чалавеку
Выспее думка,
Якая цябе зразумее.

А ён
Жыве нараджэннем і сконам
І тужыць,
Што гэта —

Усе жыццё.

**16**
Злучае
І прымушае трымацца
Разам,
Нібы слепата — сляпых,
Постаці рухаў
І думак.

Навобмацак,
Але мякка,
Нібы знутры
Звыклых паводзінаў
Імі кіруе
Не бачны ім павадыр.

Такі неймаверна далёкі
Заблытаны шлях
Да мэты,

Якая заўсёды
Тут.

**17**
Выводзіш
Свой самы вялікі твор —
Чалавека —
Увесь яго век
З нятоеснага вымярэння.

Табе пярэчаць
Найменні і вобразы,
Што чалавек
І адпаведны ім,
І вядомы.

А ён,

Жадаючы жыць,
Пакідае
І ўсё не пакіне ніяк
Сваю заўчасную вечнасць.

**18**
Маланка
Стараецца рассвятліць
Тваю сутонлівую светлыню
І выклікаць сілу,
Якая ў табе пагасае,
На спрэчку.

Пярун
Уладарна загадвае,
Каб ты ўклала
Сваю нямую душу
У споведзь.

А дождж
Прытуляецца да цябе
І просіць,

Каб ты даравала
Маланцы
Яе слепату,

А моцна

А перуну — безразважнасць,

І не
Дазволіла свету
Знікнуць.

**19**
У спратах зямлі:

Бярэшся
І ўсё адно
Пакідаешся без увагі.

Неба
То прасвятляецца,
То хмурнее.

Сцежкі
Сыходзяцца разам
І зноў
Разыходзяцца па паверхні.

Ты зазіраеш
Мне ў памяць —
І ў ей
Знаходзіш утоенае
І ад мяне самога.

Адвечны скарб —
Які ўсім відаць,
А нікім
Знайсціся не можа.

**20**
Нібы абсяг
Рэчаіснасці нераспазнанай
Паказвае думцы,
Кудою думаць
І як разумець,—

Увесь час

Забараняюць
І дазваляюць
Нам акалічнасці нешта.

У намаганнях
Гартуецца моц
І, каб дзейнічалі,
Вымагае.

А тое,
Што мусіць адбыцца з намі,
Само настае
І само вытлумачваецца,

Як гліна
У кожным дні.

**21**
Рэчы ўкарэньваюдца
У карысць
І, што паўтараецца тут,
Вартуюць.

Усіхняя і нічыя,
Не рупішся аб ураджаі
І не адрозніваеш,
Дзе — восень,
А дзе — вясна.

Адпаўшы ад неба,
Але не супаўшы з зямлёю,
Вучышся быць паслухмянай таму,
Што не мае
Абгрунтавання.

**22**
Бясконцая колькасць
Абліччаў
З цябе вынікае,
А ты
Не супадаеш з ніводным.

Ні з кім не ваюеш,
Не хаўрусуеш
І не адстойваеш сваёй праўды.

Але звяртаюцца да цябе,
Урэшце,
Усе абліччы
Па канчатковае высвятленне:

Што значаць яны,
Калі яны ёсць,
І што яны будуць значыць,
Калі іх не стане?

**23**
Бесперастанку
Вяртаецца да цябе
Наваколле,
Як рэха,
Якое акрэсліла круг
І ўвабрала, што ў крузе,—

І постаці дрэў,
І турму будынкаў,
І ўвесь краявід,—
Але ўжо не можа,
Вяртаючыся, знайсці,
Адкуль яно ўзнікла
І з кім
Мае супасці...

Далучаная да наваколля,
Шукаеш з ім разам
Нешта —
Што не адшукваецца,
А ёсць.

**24**
Імгла:
Ні святло, ні цемра.

Замкнуліся вочы,
Што бачылі
І разумелі ўначы,
А вочы,
Што бачаць удзень,
Не спяшаюцца адамкнуцца

Такая наша пара —
Між колішнім
І наступным.
І самай відушчай
У гэтай пары
Абвяшчаецца гліна.

**25**
Рухавая,
Як вада,
І непарушная, нібы камень
Ці толькі яшчэ
Падаешся да небакраю,
Ці ўжо вярнулася —
І небакрай
Ператварыла ў сваю прыкмету

Вандрueш са стану ў стан
І, што пакідаеш,
Маеш
Сваім набыткам.

**26**
У гліне сляды:

Не лучацца між сабою
Нічым,
Апроч гліны.

Хіба распазнае сябе
Той, хто ідзе,
У сваіх слядах?
А той, хто жыве,
У тым, кім ён жыве?

Але зноў і зноўку
Упісваюцца сляды
У вечную гліну,
А гліна —
У нявечнага чалавека,

**27**
Не піў —
А яе паіў малаком,
Не еў —
А яе карміў хлебам,

Каб абудзілася,
Каб ажыла
І сказала с л о в а ,
Якое людзі згубілі,
Калі захацелі ўзысці
Нацянькі да Бога.

Ела мой хлеб,
Піла маё малако,
Але каб сказаць —
Не сказала нічога.

Зноўку замкнулася ад мяне,
Зноў адхінулася —
Ці то ў здзіўленні,
Ці то ў расчараванні,—

Нібы яна
Мне прызналася ў нечым,
А я не здолеў пачуць.

**28**
Не прадаецца —
Бы золата,
І не купляецца —
Нібы срэбра.

Усюды знаёмая ўсім,
Ні ў кога

Не выклікае ні зайздрасці,
Ні захаплення.

Хінуся да гліны:
Не купіць
І не прадасць,
Але навучыць справе.

**29**
З таго боку часу
Доўжышся да мяжы
Гэтага дня
І хвіліны гэтай.

І запаўняеш сабою
Усе прагалы,
Разломы,
Разрывы,
Расколіны,
Што раз'ядналі
Адказ і пытанне,
Прычыну і вынік,—
І з цягам часу
Нас прысвячаеш

У шлях.

**30**
Бы пераможаная,
Ляжыш пад нагамі
У кожнага ваяра,
У кожнага заваёўцы.

Бурацца вежы,
Руйнуюцца гарады,
Гінуць дзяржавы,
Якія былі аздобай
І гонарам свету —

І ты іх бярэш
У сваё бязмежжа,

Але не становішся
Ні знакамітай,
Ні зруйнаванай.

І гэтак
Заўжды.

**31**
Разломіцца раптам
Зямная кара —
І ў разломе
З'явіцца голае цела
Гліны.

Нібыта ўва мне самім
Убачылі вочы нешта,
Што забаронена бачыць

Уражваюся,
Што я ёсць
І бачны
Зоркам і гліне.

**32**
Наносішся кропкамі,
Рысамі
І кругамі
На рукі,
На твар,
На грудзі.

Датвораеш,
Дамалёўваеш чалавека,
Упэўніваеш яго,
Што ён дужы,
Разумны,
Прыгожы
І блаславёны Богам.

Але калі ты сціраешся —
Чалавек

Губляецца ў акалічнасцях
І ўяўленнях

І скардзіцца Богу,
Што той
Ад яго адступіўся.

**33**
За курганамі
Свеціцца і не блякне
Далечыня.

Сцежкі знайшлі,
Куды слацца,
І болей не ўводзяць у зман
Вандроўцаў,

Мінуў
Спякотлівы дзень,
А вечар
Не надышоў.

Пара
Знаходзіць паразуменне
З глінай.

**34**
Пусцеюць радовішчы,
Рэкі
Спрабуюць цячы назад.

Безгалоса
Выстройваюцца тысячагоддзі
Адно за адным,
Ды нічым
Не могуць дапамагчы
І парадзіць нічым не могуць
Гэтаму крайняму дню,
Гэтаму крайняму году.

І толькі гліна

Бярэцца правесці
Па-над прадоннем
Сваёю дарогай
Пакінутага чалавека.

**35**
Ты дазваляеш
Рабіць з сабою
Усё,
Што надумае чалавек
І што здолее,—

Нават Бога.

Ужываешся ў вобраз,
Якім чалавек надзяляе
Таго,
Хто мусіць яго зразумець
Глыбей, чым ён сам.

Услухоўваешся ў таямніцы,
У якіх чалавек адкрывае
Сябе перад тым,
Хто сам
Найвялікшая таямніца.

І застаешся ўсё роўна
Сабой —
Спрадвечнай магчымасцю
Быць інакшай.

**36**
Па рэках крыві
Цячэш
У інакшыя далячыні.

І, прысвячаючы чалавека
У немінучую смерць,
Прысвячаеш
У немінучую неўміручасць.

Апошняй праводзіш
І сустракаеш

Першай.

**37**
Збочваем:

З бальшакоў
На патайныя сцежкі,
Каб забароненае забрала
У нас нямогласць,
А даравала моц.

Гліну,
Якая адольваецца,
Мяняем
На гліну,
Якая паволі,
Але няўхільна,
Адольвае нас.

**38**
Накрэсліваю на гліне
Знакі,
Узоры,
Вобразы —
І яны
З яе выпаўзаюць,
З яе вылятаюць,
З яе выходзяць,
Яе пакідаючы,
І пачынаюць
Адно за адным паляваць.

Калі сустракаюся з імі
У наваколлі,
Яны пужаюцца,
Уцякаюць,
Злуюць,

Быццам яны
Насампраўдзе жывыя,
Быццам яны
Насампраўдзе —

Я н ы.

**39**
Змена,
Што ўсе перайначвае,
А сама
Застаецца нязменнай.

Сабранае траціцца,
І рэчаіснасць
Разгортваецца ў здагадку,
Каб адшукацца
З таго боку слоў.

Вяртаюся ў заўтра,
Дзе гліна значыць
Болей,
Чым постаці
Уздоўж перыметру
Сцен.

**40**
Штодня сустракаемся
І штодня
Марым аб нейкай іншай
Тут немагчымай —
Сустрэчы.

Дрэвы
Нас памятаюць,
А гліна
Вядзе да свайго небакраю,
Дзе Бог
Не будзе адрозніваццa
Ад чалавека

І жыццё —
Ад жыцця.

**41**
У глыбіні — пласты,

А тут,
На паверхні,
Звініць сцюдзёны ручай
І вецер
Вагае галіны дрэў,
І прастора
Не мае мяжы...

Але апынаецца паступова
Тое, што мучыць і радуе,
Вабіць і засмучае,
У мінулым,

І апынаецца ўсё бліжэй
Чалавек ля гліны.

**42**
Нібы ўбіваюцца ўглыб
Апоры,
Калі будуецца дом,
З глыбіні
Праступаюць задумы,
Каб неўзабаве
Звязацца ў цэласны тэкст,

Як гліна.
Прысутнічаеш незаўважна
У кожнай развазе,
А заўважаешся —
І прастора
Страчвае рыштаванні:

К у д ы  і  а д к у л ь .

**43**
Прыклейваешся да чаравікаў,
Да рук,
Да слоў,

І як бы далека
Хто ні заходзіў,
Не дазваляеш яму
Адысці назусім
І зрабіцца
Староннім,
Чужым,
Абыякавым да мясціны,
Табою асвечанай.

Нават
Не думаючы пра цябе,
Табе прысягаюць людзі,
Што будуць памятаць пра цябе
Да скону.

**44**
Моцай,
Якую ўкладаем у рэчы,
Каб імі валодаць,
Рэчы
Трымаюць нас.

Між сабой
Згаджаемся,
Узгадняемся
І вітаем
Адзін аднаго пры сустрэчы.

Але глыбіня
Ад нас адступаецца
І закрываецца
Тоўшчай паверхні.

І толькі гліна —
Каб мы не згубілі сябе дарэшты

Свеціцца,

Як ліхтар.

**45**
Знаходзіць сама ў сабе
Безліч рэчаў,
Але самую сябе
Губляе.

Згадвае мноства імёнаў,
Якія даюцца ўсяму,
Што ўзнікае,
Але сваё забывае.

Калі настае —
Мінае,
Калі становіцца нечым —
Перастае быць

Н і ч ы м .

І тады
У рыбін і птушак
Выпытвае шлях
Дадому.

**46**
Прысутнае вабіць
Вока
І вокам засвойваецца:

Адлегласць
Між тым, што знадворку,
І тым,
Што ўнутры.

Прамень
Напружанага спасціжэння
Прыцягвае і адпускае
Прадмет —

І прадмет
Пачынае распазнаваць
Адлегласць,
А ў ёй
Прысутную гліну.

**47**
Збан зберагае,
Што маецца ў ім,
І, што маецца ў ім,
Спаражняе.

Нібыта завязь у плод —
Няўзнак
Будучыня перайшла
У мінулае:
Ува што
Пярэйдзе мінулае?

Тут нас ужо няма,

Але ўжл
паявілася гліна.

**48**
Што ні здараецца з намі,
Здараецца як бы не з намі
А з некім.

Спяваюць раніцай птушкі
І дрэвы
Шапочуць лістотаю,
І бялее
Так блізка,
Але к у д ы нам ужо
Немагчыма патрапіць,

Гліна.

Нас перайначвае вынік,
Аднак заўсёды

Мы застаёмся прысутнічаць
Некім ці нечым
Побач з мінулым,
Якое было

Ц я п е р .

**49**
Не намагаешся спрасавацца
У крамянёвую моц
Ці рассыпацца ў пыл...

Мудрацы
Табе давяраюць
Свае развагі —

Не для таго,
Каб з імі
Застацца ў вяках,
А каб высветліць праз вякі,
Дзе думка
Распазнавала праўду,
А дзе памылялася...

Доўжышся, як жыццё,
Нікому не прыналежная,
І ўсё роўна

Усім свая.

**50**
Не хочаш
Дужаю быць
І не можаш слабою.

Ты не пярэчыш Богу,
А свет
Табе не пярэчыць.
На шалях
Унутранай раўнавагі
Узважваеш Гіаражнечу

І Паўнату
І нікому
Не прызнаешся, чаму
Не пераважвае шаля
Шалі.

**51**
Паставай,
Якой аб'яўляюся тут,
Шукаю сябе самога...

Ці месца,
Каб спраўдзіцца?..

Гліна
Тлумачыць пісьмёны
Забытых стагоддзяў,

А я і маё
Засвойваюць сінтаксіс
Паразумення.

Нямое,
Нікім не адмененае,
Змаганне
Паміж паверхняй
І глыбінёй.

**52**
Нашча:

Рыхтуешся да пары,
Калі сэнс табе скажа:
«Збудзься!..»

Страшыць
І кліча адначасова
Нязнанае прызначэнне.

Штораз
Ахвяруеш сабой —

І гэтак
Наноў заваёўваеш
Свет.

**53**
Сведчыш пра цэласнасць,
Да якой
Нічога нельга дадаць
І адняць ад якой
Гэтаксама нічога нельга.

А мы
Разумеем паглядам
І думаем дотыкам
І адкладаем на потым сябе,
Каб зноў
Бясконцае мноства разоў

Вяртацца.

**54**
Творыцца паступова
У целе гліны
Цела быцця,
А ў ім,
Калі яно створыцца,—
Цела думкі,
А ў ім,
Як яго сарцавіна,—
Цела святла:

Драбіна,
Якая вядзе
Да Бога.

Пільнуеш свой час
І сама
Няўзнак здымаешся,

Але ўсе роўна
Заўсёднай апораю

Застаешся.

**55**
Тоесны
Нечаму іншаму,
Чым таму,
Кім існую,
Ад рэчаў
Скіроўваюся да гліны —

Жывы,
Але мёртвы,
Да мёртвай,
Але жывой.
І болей нікога няма
І нічога няма:

Адно перад тым
Як сустрэцца —
Р о с т а н ь ,
Адно перад тым
Як расстацца —
С у с т р э ч а .

**56**
Перамагаеш
Без перамогі,
Дзейнічаеш
Без учынку,
Жывеш
Без жыцця.

Паміж назоўнікам і дзеясловам
Сутонішся ў спраўджаным
І світа еш
У тым, што спрабуе
Стацца сабой,—

Часціна
Інакшай мовы,
Што не засвойваецца,

Як назоўнік
І як дзеяслоў.

**57**

Паклікала —
Але не назвалася.

Уначы,
У цьмянай размове
З нераспазнаным,
Я ўпэўніўся,
Што не памру,
А памяняюся месцам
З нераспазнаным.
І стаў чакаць,
Калі развіднее,
А развіднела —
Убачыў мертвую гліну
І прачытаў уголас
Яе імя.

**58**

Калі дакранаюся да яе,
Яна
Нешта інакшае ўжо,
Чым гліна.
Усё,
Што збылося,—
Знікла.
І што не збылося —
Знікла.

Няма ні жывых,
Ні мертвых,
Ні пераможаных,
Ні пераможцаў.

І толькі страла
У нерухомай прасторы гліны
Ляціць
З пачатку ў канец.

# ВЭРСЭТЫ

## ДАРЭШТЫ

У левую руку мне даюць паразу, але ў правую я паспяваю ўзяць перамогу.

Тады ў правую руку мне даюць радасць, але я працягваю левую руку і бяру скруху...

У мяне пытаюцца: хто ты? — і хочуць спыніць.

Я не адказваю і не спыняюся.

Засяроджанаю душою я намацваю дрогкую лінію сэнсу, па якой мушу ісці дарэшты.

**ЗБРОЯ**

Настае дзень, калі я бяру меч і бяру шчыт...

Цяпер я ўзброены, цяпер я здольны абараняццаі нападаць, ітыялюдзі, якія ўчора штурхалі мяне локцямі, цяпер пачціва вітаюць мяне.

З цягам часу меч урастае ў маю правую руку, шчыт — у левую, і я адчуваю іх як сваё цела.

Але... Але няўжо яны — тэта я, няўжо да самага скону я мушу рабіць тое, што раблю цяпер,— укладацца ў зброю?!.

І гады пастулова я пачынаю адымаць яе ад сябе — вызваляцца.

Не адзін тыдзень, пэўна, міне, перш чым гэта адбудзецца: надта шчыльна зраслася зброя з маім целам, з маёй сутнасцю.

Аднак, перамогшы слабасць, я мушу перамагчы і сілу.

**АПОРА**

Нам няма на што абаперціся.

Крышталі пэўнасці, на якія мы ўскладалі такія вялікія спадзяванні, нечакана пераўтвараюцца ў ластавак і шпакоў і імкліва адлятаюць ад нас.

У вырай,— збянтэжана разводзім мы рукамі.

І мы нічога не можам зрабіць з гэтым неспасціжным выраем,

не можам яму запярэчыць.

Мы жывём у свеце, дзе вечар змяняецца раніцай, вясна — восенню, жыццё — смерцю,

дзе час рухаецца ў адзін бок,

дзе адзіная адвечна ўстойлівая апора — гэта страчванне яе:

в ы р а й.

**ПЯРЭЧАННЕ**

Яшчэ здольны балець,
яшчэ здольны пакутаваць,
яшчэ здольны памерці,
я разбіваю душу і рукі аб камяні і сцены, якія мяне абступаюць.

Я парываюся з мінулага ў сёння, з бяспекі ў свабоду.

Але мы твая абарона,— пярэчаць мне камяні і сцены,— мы тваё вонкавае цела,
мы ратуем цябе ад спёкі і сцюжы, ад агню і вады, ад кулі і шаблі,

бо ты яшчэ не здольны не балець,
бо ты яшчэ не здольны не пакутаваць,
бо ты яшчэ не здольны не памерці.

**ПАДЗЕЛ**

Я аддзяліў слодыч ад горычы, асалоду ад пакуты, рай ад пекла —

і кветкі сталі мяне паіць толькі салодкім нектарам, а дрэвы частаваць толькі райскімі яблыкамі.

Але чым далей, тым з усё большай трывогай я ўслухоўваюся ў тую другую палову падзеленага мною свету.

«Яшчэ не позна,— мне шэпчуць нейчыя галасы,— выпі кубак горычы, якою перапоўніліся кветкі,— і яна ацэліць цябе, саступі ў пекла — і яно цябе выратуе...»

Я вагаюся, тулюся ў сваю палову і не адважваюся зразумець, што я ўжо асуджаны.

## НАВОБМАЦАК

Мы рухаемся навобмацак.

Калі настае дзень — мы заўважаем, што нам светла,

калі настае ноч — заўважаем, што цёмна,

калі адхіляемся з дарогі, калі забягаем наперад альбо калі адстаём — тады непазбежна вяртаемся на ранейшае месца.

Мы рухаемся з адной цяперашнасці ў другую і як сваю долю прымаем тое, што ёсць.

Наша дарога праходзіць праз нашы сэрцы,

кожны наш крок — гэта крок за небакрай,

і ў кожным нашым імгненні змяшчаецца ўвесь час.

## СПАДЧЫНА

Калі яна цяжар — тады яна крылы,
калі яна вярэдзіць — тады яна гоіць,
калі яна знясільвае — тады дае сілу...

— Аднак з гэтаю ношкаю ты не здолееш уступіць на неба,— перасцерагае мяне першы анёл.

— А без яе зноў упадзеш у мінулае,— перасцерагае другі.

Я іх абодвух разумею.
Пісягі і апёкі на маім целе.
Віхуры клічуць мяне падужацца.
Зямля — частка мяне.
І агністыя мечы анёлаў пільна ўзіраюцца ў маю душу.

**АПОШНІ ЧАС**

Зоркі перакульваюцца і выліваюць на нашы палеткі смалу і серу,
перуны выбухаюць над нашымі гарадам!,
хістаецца сонца...

Нам боязна, нам неспакойна,
мы яшчэ шчыльней прыпадаем да зямлі,
яшчэ мацней учаперваемся ў нашы заняткі і рэчы
і не адважваемся паглядзець вышэй за сябе
і зразумець, што ратунак перашкаджае...

А сонца расхіствае нашы дні,
а зоркі ўрываюцца ў нашы развагі,
а перуны заглушаюць нашу размову.

І ўсё настае, і ўсё ніяк не можа настаць той час, той адзіны час, які для нас існуе *сапраўды*,— апошні.

## ШЫЛЬДАЧКІ

**На дрэвах — шыльдачкі.**

На іх напісана, колькі якому дрэву гадоў, як яно называецца, якая яго таўшчыня і вышыня.

Людзі праходзяць міма дрэў, не заўважаючы іх, — яны чытаюць шыльдачкі...

А сведчанні дрэў так і застаюцца непачутыя,

а пісьмёны дрэў так і застаюцца непрачытаныя.

**ЗДАРЭННІ**

З неба на мяне падаюць вогненныя жарыны, манеты старажытных княстваў, жабы і рыбіны, рознакаляровыя камяні;

зямля пад маімі нагамі перакідваецца то ў багну, то ў пясчаную пустэльню, то ў могілкі дыназаўраў;

а калі мы праходзім паўз вёскі, то на платы ўскокваюць галасістыя пеўні, а з-пад платоў да мяне сігаюць куслівыя сабакі і гусакі.

Здараецца, я смяюся ад захаплення, здараецца, плачу ад болю і крыўды. Але ззаду за мною неадступна рухаюцца два мае пастухі — манекены, якія бароняць мяне ад незлічоных неспадзяванак.

— Мы можам памяняцца месцамі,— прапануюць мне манекены,— і тады нічога не будзе здарацца.

Я адмаўляюся.

Я па-ранейшаму ўсё сустракаю першы, і па-ранейшаму свет размаўляе са мною на мове здарэнняў.

**АБСЯГ**

Дакуль дасягае мой слых і зрок — датуль мой абсяг. Ён мае прадаўжэнне, мой поступ, мая заваёва.

Я вынаходжу ўсё больш магутныя тэлескопы, усё больш чуйныя гукапрыёмнікі — я ўвесь час пашыраю свой абсяг. Ён ужо займае не толькі зямлю, а велізарныя галактыкі і сусветы.

Аднак часам я чую, як на межах майго абсягу перагаворваюцца галасы:

“...Небарака, ён яшчэ ўсё на месцы...

Ён яшчэ ўсё ніяк не можа пераступіць свой абсяг...”

## БЯЗМЕЖЖА

Палову жыцця падаюся ў свет, палову — варочаюся са свету,
палову жыцця пішу на дарозе свае імёны,
палову — закрэсліваю напісанае,
палову жыцця расту ад зямлі, палову — расту з зямлёю:

і ўсё менш ува мне мяне, і ўсё больш бязмежжа.

**МЭТА**

Перада мной паўстаюць аснежаныя горы, цякуць стромістыя рэкі, рассцілаюцца пагібельныя балоты...—

колькі я іх адолеў?!.

Колькі мушу адольваць зноў?!.

І няўжо на самой справе мушу?!.

Я спрабую паразумецца са сваімі жаданнямі, пераправерыць мэту, удакладніць шлях —

і заўважаю, як неўпрыкмет, паступова пачынае мяняцца воблік мясціны,

як у залежнасці ад маіх жаданняў, ад мэты, якую я выбіраю, перастаўляюцца горы, знікаюць балоты, паварочваюцца рэчышчы рэк...

...Я — мэта, што тоесна перашкодзе.

## НА ГЭТАЙ ЗЯМЛІ

Хто пытаецца ў мяне дарогу на ўсход, хто — дарогу на захад...

Нібы раздарожжа, я паказваю ўсім, куды ісці, а сам застаюся на месцы — на гэтай зямлі, пад гэтым небам,

занадта лёгкі для глыбіні,
занадта цяжкі для вышыні,
занадта цэласны, каб падавацца ў які-небудзь бок...

Вось мая левая рука, вось — правая...
Я кладу зерне ў дол - і яно вырастае ў дрэва:
на адной галіне ў яго сонца,
на другой — месяц,
рознагалосыя птушкі з усіх канцоў свету спяваюць на ім свае песні і ладзяць гнёзды...

Тут мой захад, і тут — усход.

## ПТАХ

Вялізны хцівы птах пагойдваецца нада мною. Я ведаю: ён чакае маёй загубы. Тады ён з галодным хрыплым крыкам апусціцца на маё цела і цвёрдай глюгай ударыць мне ў твар.

Я напінаю лук і выпускаю стралу. Страла, не даляцеўшы да птаха, падае долу. Я падбіраю яе і зноў прыладжваю да лука: зараз я паспрабую стрэліць вышэй...

Але на ранейшым месцы птаха ўжо не аказваецца. Нібы нешта надумаўшы, ён пераля-тае наперад — туды, куды іду я.

Бяскрайні стэп.

І мы двое: я і птах — мой пракаветны вораг.

Ён адзін суправаджае мяне на маёй жыццёвай дарозе.

Дый, урэшце, як бы я ведаў, куды мне ісці, калі б ён час ад часу не залятаў наперад?!.

## ВУЧАНЬ ЧАРАЎНІКА

Не ўтрываўшы, я адгарнуў наступную старонку...

«Ліхнаэль, Весмалон, Гермашур, Мэмрагай...» — я чытаю, спяшаючыся, няўцямныя словы-імёны той старой таямнічай кнігі, якую на часіну даверыў мне мой настаўнік...

А на дварэ раптам цямнее, як пры змярканні. Чароды птушак запалоньваюць двор і з гучным пранізлівым крыкам абрушваюцца ў дзверы і вокны.

Спалатнелы, я не паспяваю што-небудзь зрабіць, куды-небудзь падзецца, як у хату ўбягае ўгневаны чараўнік, выхоплівае кнігу, шэпча...

Ужо не вучань, я ўсё далей адыходжу ад чараўніковай сядзібы.

Аднак словы, тыя забароненыя словы імёны, якія я вычытаў у кнізе...—

я мучуся, я намагаюся не ўспамінаць іх, не дапусціць іх да свайго розуму, не застацца з імі сам-насам...

Я баюся таго, што ведаю.

За вокнамі маёй свядомасці цёмныя крыкі.

## ЗАЦЬМЕННЕ

Прыставіўшы да вачэй замглёныя шкліны, людзі глядзяць угору: цяпер яны бачаць, як сонца ззяе і як зацьміцца сонца...

Што, дрэва, што, камень, што, воблака — няўжо мы бачым вас толькі таму, што і вы ў зацьменні?!.

А чыстыя сутнасці свету для нас яшчэ ўсё застаюцца закрытым!?!.

І мы ні разу ні з чым яшчэ не былі сам-насам?!.

...За вёскаю — рэчка, за рэчкаю — горка, за горкаю — поле, на полі — камень, а на тым камені-валуне стаіць-зіхаціць залатая карона...

Ды варта мне толькі зірнуць на яе сваімі вачыма — усё прападае...

Бачу праз перашкоду.
Думаю праз перашкоду.
Праз перашкоду жыву.

І стала сонца зямлёй.
І стала зацьменне целам.

**У КРУЗЕ**

Свет бязмоўна дапытваецца ў мяне, куды я іду.

Але хіба я ведаю сваю канчатковую мэту? Я толькі спраўджваю тое, на што здатны, што вымагае ад мяне жыццё:

засмяглы — п'ю ваду,
галодны — ем хлеб,
зняможаны — адпачываю,
адпачыўшы, імкнуся наперад — і апынаюся на сваіх слядах.

Я ў крузе, дзе слова шукае Слова, а чалавек — Чалавека.

## ГАВОРКА САША

Мой аднагодак Гаворка Саша, задумаўшыся глыбока, сядзіць каля груды жалезнага лому, у жоўтай пожні:
кашуля расхрысталася на ім,
ля скроні кроў запяклася...

— Саша,— я клічу яго,— хадзем разам з усімі, з намі!..

А ён не адказвае анічога,
а ён застаецца на тым самым месцы,
а ён застаецца ў тым самым часе,
а ён застаецца на тым свеце,

дзівячыся на дарогу, па якой адыходзяць усё далей яго аднагодкі.

## ЗАВЕЯ

У завеі — зямля, у завеі — дрэвы, людзі, якія жылі і якія яшчэ не жылі,у завеі,

і я таксама ў завеі...

Дзе яно, мінулае?!.

Дзе яна, будучыня?!.

Дзе яно, сёння?!.

Болей няма на каго наракаць,

болей няма каму дзякаваць — за ўсё што давалася і адымалася, радавала засмучала,

і болей няма каму ведаць, які я добры альбо благі, брыдкі альбо пры гожы, стары альбо малады...

Адступіў ад мяне белы свет, абсту піла мяне белае беспрасвецце.

## СІНІЯ ЛЮДЗІ

Крышыцца пад нагамі зашэрхлы снег.

Цямнеюць ямы з вадою.

Сакавіцкая ноч: хаты, і вокны, і вуліцы, ды — без нікога.

Бязлюддзе ў маёй душы, бязлюддзе — у свеце.

І толькі хістаюцца нада мною прадвесная дрэвы,

і толькі бягуць па небе аблокі,

і толькі імчыць кудысьці месяца сіні човен, а ў ім сядзяць сінія людзі.

## ЧОРНЫ АБРАЗ

У маіх руках абраз, на якім няма ніякай выявы, ніякіх рысаў,— чорны драўляны абраз.

Я трымаю яго перад сабою і разам з ім павольна ўзлятаю па-над падворкамі, па-над жоўтымі асеннімі дрэвамі, па-над прасторлівaю зямлёй...

Я ведаю, на што здатны мае мажлівасці — яны маюць свой колер, свае аблiччы і свае межы, але мяжа маёй немажлівасці, дзе яна?!.

І ці ёсць яна?!.

Чорны абраз.

І нямыя прадонні космасу, дзе гараць, не згараючы, сонцы.

* * *

Дзве мэты, якія пярэчаць адна адной, ува мне супадаюць: мэта — усё займець, і мэта — ўсяго пазбыцца.

Што я адваёўваю ў дня — у мяне забірае ноч, што я аддаю раздарожжу — вяртае мне скрыжаванне.

І не хапае мне дня, каб усюды паспець, і не хапае начы, каб адусюль вярнуцца,
і не хапае жыцця, каб жыць,
і, каб не жыць, не хапае смерці...

Я маю — усё, і не маю — усё.
Дзіўлюся на цені ўдзень, і на зоркі — ноччу.
У вёсцы далёкай гарланяць пеўні.
Цьмен і палын абступаюць маю дарогу.
Сэрца сусвету б'ецца ўва мне.

## СЛЯДЫ

Ты ўжо мінуў,— гаворыць мне вечар.
Ты яшчэ не настаў,— гаворыць мне ранак.
Я мінаю і настаю, і неадступна мае сляды цягнуцца ўслед за мною.

Ці ёсць паміж днямі прадонні, а паміж хвілямі — ямы?!.
Калі я спыняюся — паміраю,
калі ажываю — перамяшчаюся па паверхні, і час адлучае мяне ад мяне, і месцы перамяшчэння ўсё нешта маюць наўвазе...

Ты зноў узыходзіш, сонца!..
Ты зноў паміраеш, ветах!..
Такі ў чалавека клопат, такое выйсце:
сабою — дапытвацца,
сабою — адказваць,
сабой — спалучаць пачатак і завяршэнне.

Дзівіцца, выйшаўшы з хаты, стары мой бацька на дрэвы — якія цвітуць...
На вуліцы хлапчаня клянецца перад сябрамі: «Каб мне не сысці з таго месца...»

Я ведаю шмат, не ведаю аднаго.
Мой цень пільнуе мяне.
Змяркаецца ранак, світае вечар.
І набракаюць крывёю мае сляды.

**МЯЖА**

З левага боку — поле, і з правага — поле, а проста — мяжа:

на ёй божыя слёзкі, на ёй сівец,

і бацька, панурыўшы галаву, стаіць на мяжы з касою.

Даўно ўжо стаіць — заржавела яго каса,

счарнела касільна,

праз скошаную траву прарасла маладая...

І чуць ён не чуе, як б'е капытамі зямлю і гучна іржэ на двары буланы,

і бачыць не бачыць, як ззяе на небе адразу два месяцы — ветах і маладзік.

## МАЛАНКА

Тады, калі я ўвайшоў у бажніцу і, зачыніўшы дзверы, стаў гутарыць з небам, з неба раптоўна ўпала маланка і раскалола бажніцу надвое.

Людзі, якія прыйшлі на світанні, адбудавалі з адной яе палавіны бажніцу світання,

а людзі, якія прыйшлі на змярканні, адбудавалі з другой палавіны бажніцу змяркання.

— Хадзі да нас,— заклікаюць мяне адны,— гэта жтвая бажніца: ты зноў тут зможаш казаць свае словы да неба...

— Хадзі да нас,— пераймаюць мяне другія,— гэта твая бажніца: ты зноўку тут зможаш слухаць, што кажа неба...

А я ўсё стаю на тым самым месцы,
здранцвелы,
уражаны,
праяснёны,
не маючы мовы, каб гаварыць,—
з маланкаю ў сэрцы.

## РАЗАМ З ТРАВОЙ

Лёгшы ў траву, забываюся, як мяне зваць і навошта я ў гэтым свеце.

Шчыльна мяне абступае трава.

Гэта — наша сустрэча, тэта — наша паразуменне: колькі разоў я намерваўся, але ні разу дагэтуль яшчэ не сустрэўся з травой, усё замінала нешта, усё нешта аказвалася бліжэй.

Чую: здалечыні мяне клічуцьгукаюць клопаты і абавязкі, якім прызначаў я на сёння сустрэчу.

Я голасу не падаю, я ляжу ў зялёнай траве і ўпершыню разумею, што я адначасна ёсць і не ёсць, што я адначасна прысутны й адсутны, усюды і тут...

Быццам воблака, мяняючыся на вачах, кудысьці сплывае мае аблічча, якое ўмела так шмат: гневацца і разважаць, засяроджвацца і ўсміхацца, прасіць прабачэння і пагарджаць, нідзе не знаходзіць сабе прытулку і ўпісвацца ў розныя асяродкі.

Дыхаю разам з травой;

слухаю разам з травой, як наплывае ціша;

разам з травой назіраю, як сціраецца растае ў чыстым небе той цень, тое воблачка, тая кропка, якая ўсё парушала сабой і ўсё дзяліла надвое...

І няма ў мяне сёння іншага клопату, іншага абавязку, як проста быць — разам з травой.

## ПАВЕРХНЯ

Паверхня раскрэслена на трохкутнікі, ромбы, кругі...

Каб трапіць у глыбіню, я набіраю паветра ў грудзі і бяру ў рукі камень.

Але глыбіня ўхіляецца ад мяне. Самае большае, што я магу дасягнуць,— гэта новай паверхні: дна.

Няўжо такая мая ўласцівасць, такі мой знак: усё, што асвойтваю, усё, што кранаю,— пераўтвараць у паверхню?!.

Жыву на паверхні зямлі, і вады, і агню, і паветра,

і цела — паверхня майго жыцця, і розум — паверхня цела.

Паверхняю — разважаю, паверхняю — разумею, паверхняю — мераю глыбіню...

Ледзьве жывы, выбіраюся я на бераг.

Мяне абступаюць знаёмыя трохкутнікі, ромбы, кругі...

Цяпер я ў бяспецы, цяпер я дома...

Апе вагаецца ўва мне неспасціжная глыбіня і прымушае вагацца паверхню.

## КАМЯНІ

Што ты скажаш цяпер? — пытаюцца ў мяне камяні, калі мяне спасцігае якая няўдача, калі здараецца са мною якая неспадзяванка.

Яны пытаюцца, яны цешацца, яны ганарацца сабой, яны цяпер адчуваюць сябе мудрэйшымі за ўсе мае аргументы, якія я ім прыводзіў, за ўсе мае ўчынкі, якімі даводзіў, што быць людзьмі лепш...

Я пастаянна казаў, што меў,
я пастаянна кажу, што маю,
нічога не ўтойваючы,
нічога не пакідаючы на чорны дзень;
мае канчатковыя аргументы тут — у кожнай хвіліне, у кожным дні, ва ўсім маім існаванні.

А камяні мяркуюць, што я жабрак, што я жыўлюся чужым, шго нічога свайго не маю...
Яны закрываюцца ад мяне:
у іхняй закрытасці — іхняя моц,
у іхняй закрытасці — іх каменнасць.

Я вучу камяні быць людзьмі.
Я іх прасвятляю сабою.
Дзень, калі яны адкрываюцца мне,— мой скарб.
Дзень, калі яны закрываюцца ад мяне,— чорны.

## СЫНЫ ІОВА

Мае браты збіраюцца разам — на святы, нарады, справы, што тычацца нас усіх.

Але я сцярожка сачу наўкола.
Я ўхіляюся ад сумесных сустрэч.
Калі ўсе прысутнічаюць, нехта, хоць бы адзін, адсутнічаць мусіць.

Я вартаўнік лёсу.
Я не магу яму давэрыцца.
Я памятаю пра сыноў Іова: яны загінулі, калі сабраліся пад адною страхой усе разам.

## ТРАНСМУТАЦЫЯ

Рукамі абмацваю твар: аднымі часткамі цела адчуваю другія часткі.

— На каго ты падобны?!.— кажа сястра.

Не ведаю, на каго:
хто кажа — на камень,
хто кажа — на птушку,
хто кажа — на дрэва,
хто — на самога сябе...

Блізка Вялікдзень.
У паветры разліты салодкі і горкі водар.
Падсыхаюць груды.
Цвітуць кацяхі вербалозу.
Прадвесціцца шчасце.
Сонца запальваецца ў грудзях.
З песняй і плачам кудысьці ідуць натоўпы.

## У СТАРОЙ ХАЦЕ

У той старой хаце з сябрынаю за сталом сядзіць невясёлы бацька:

што было есці — паелі,
што было піць — папілі,
а ўсё адно не хапіла.

У акно зазірае ясная восень.
Гудуць далёкія цягнікі.

Бацька дае мне грошы і кажа: «Ідзі і купі дзе-небудзь яды і пітва, а купіш — тады вяртайся...»

Я праходжу каля глыбокіх чыстых азёр, у якіх залацяцца ўрачыстыя дрэвы і цямнеюць аблокі,

саджуся ў імклівыя цягнікі,

але сёння вялікі выходны:
усё заняла сабою гэтая восень,
усё заняло сабою гэтае чараванне,
усё заняло сабою гэтае хараство,
усё заняў сабой тэты дзень,

на ўскрайку якога ў старой сутонлівай хаце сядзіць па-ранейшаму за сталом з сябрынай сваёю бацька і ўсё чакае, калі я вярнуся.

## НА ДРУГІ ГОД ВАЙНЫ

На другі год вайны не вырасла жыта на полі, не вырасла бульба, а вырaслі лозы.

Узяўся я дзерці з лозаў кару — а яны з жалеза,
узяўся сякераю секчы лозы — стала з іх сыпацца на зямлю жалезнае зерне,
узяўся выкопваць лозы рыдлёўкай — стала выкопвацца з-пад каранёў жалезная бульба.

Хто будзе есці жалезнае зерне?
Хто будзе есці жалезную бульбу?

Кажа бабуля: вайна.

А я спрабую сам разгрызці тыя зярняты,
спрабую сам угрызці бульбіны тыя,
каб самому зрабіцца жалезным, нібы вайна, і павыдзіраць жалезныя лозы з поля.

## СІНІ ТУМАН

Ізноў вясна.

Я стаю каля сваей хаты.

Ціха ў дварах: не бразгаюць вёдры, не размаўляюць людзі, не брэшуць сабакі і не сакочуць куры.

А ў канцы вуліцы, быццам спусціліся на зямлю нябёсы, сінее туман:

у ім я бачу аднавяскоўцаў, бачу сваіх сяброў, бачу сябе самога...

Я думаю — не надумваюся, і няма ў каго папытацца, як гэта так адбылося, што я не з усімі, што я падзяліўся надвое, што я не ў вясне і ў вясне...

Тужыць і радуецца мае сэрца.
Цвіце ў канцы вуліцы сіні туман.

## ПАЛЁТ

Дакуль мне яшчэ трываць?

Птах, з якім я лячу праз імглістую бездань часу, з няволі — у вызваленне, са скрухі — у радасць, з цемры — у светлыню, паварочвае да мяне галаву і кажа:

датуль, пакуль хопіць часу,
датуль, пакуль хопіць цябе самога,
датуль, пакуль хопіць нас...

Я кармлю птаха сваім целам,
паю сваёю крывёю
і перастаю ўжо адрозніваць, дзе ён, а дзе я, а дзе час...

Усё загойваецца на мне мае цела,
усё аджывае ўва мне мая кроў,
усё патрабуе птах сабе новай ежы,

і ўсё доўжыцца праз стагоддзі наш нерухомы палёт.

## СТАРЫ ГОРАД

На ацішэлых падворках, ля гонты і чарапіцы, квітнее ружовы і белы бэз і асвятляе сваім цвіценнем, сваім разуменнем горад, што паглыбляецца ў даўніну.

Кашлаты дзядоўнік натоўпіцца каля паркана:
кожная лапушына — шаля,
кожная лапушына — голас,
кожная лапушына — далонь:
наноў разважае зялёнае веча, наноў узважвае думнае веча кошт смерці і кошт жыцця...

Пакінулі апошнія жыхары свае дамы-муранкі, свае драўляныя хаты з аканіцамі і ліштвой і ўсё, што мелі, што нажывалі, што памяталі, што снілі, пабралі ў пярэбары, у перасяленне, у новы кут...

Ды нехта ўсё роўна сюды вяртаецца неадольна,
нешта ўсё роўна тут, быццам калісь, жыве:
тут раптам зазвоняць званы трывожна,
зацокаюць раптам падковы па бруку,
раптам дзіця заплача,
раптам некага нехта пакліча, і той адгукнецца ў адказ...

Тут пласт на пласце, на падмурку — падмурак.

Тут свае таямніцы, свой радавод, свой лад.

Тут нешта тоіцца, нешта хаваецца, нешта ўхіляецца ад разгляду...

Падводзіцца да старога горада вузкакалейка.

Па старым горадзе ходзяць узброеныя патрулі.

**ДАЛЕЧЫНЯ**

Далечыня падступае і адступае, і ўсюды замест яе застаю сутонлівую зямлю, засяроджаную ваду, шурпатыя дрэвы.

Я ў іх дапытваюся пра далечыню.

Кажа зямля: гэта — мой слых.
Кажа вада: гэта — мой зрок.
Кажуць дрэвы: гэта — наша дыхание.

Я паварочваюся наўкола.
Я магу быць адначасова толькі тут, дзе стаю, дзе ўжо ёсць.

Далечыня — мой страчаны рай: ён адлюстроўваецца снамі і міражамі.

Я разаслаў удалечыню па розных кірунках стрэлы, а стрэлы вяртаюцца, цэлячыся ў мяне.

**ПРЫКМЕТЫ**

Каб адгарадзіцца ад выпадку, мы абгарадзілі сябе каменнай сцяною,

забрукавалі дол,

паставілі громаадводы,

уклалі законы,

распланавалі сваё жыццё далёка наперад — на дзесяцігоддзі, стагоддзі, але...

Але на самым пачатку лета зажоўкла бярэзіна ў скверы,

але каля самае ратушы раптам, з палёту, упала мёртвая птушка,

але загарчэла вада ў студнях,

але старыя людзі спыняюцца на дарозе і кажуць: «Мы чуем, як плачуць нашы бацькі...»

## ДРУГОЕ СОНЦА

Запальваецца ў небе другое сонца.

Я хаваюся ад яго за старую кашлатую дзічку, але сонца прасвечвае яе наскрозь;

хаваюся за сцяну хлява, але цень ад яе празрысты, як дзень;

хаваюся за валун, што ляжыць каля студні, але ён як сіта;

хаваюся ў хату, а ў хаце звыклы спакой, а ў хаце ні цёмна, ні светла...

У хаце сядзяць, бы на свяце нейкім, бацькі,
у хаце сядзяць сваякі,
і так мне шкада, што я ўжо не з імі...

А маці — наўздзіў маладая — гладзіць мяне рукою па галаве, дзьмухае мне на твар...

— Вось і ўсё добра,— кажа яна.— Я пагасіла другое сонца.

## ЗМЕІ

Бацька разворвае поле.

Па баразне, ўслед за плугам, пхнуцца гурмою куры і дзяўбуць дажджавых чарвякоў.

Іх шмат у раллі. Але сярод іх вылучаюцца два велізарныя чарвякі, ад якіх у спалоху куры ўцякаюць.

Ды гэта не чарвякі, а бялёсыя слізкія змеі. Яны сыкаюць — джалы выстромліваюцца з іхніх пашчаў.

З копашкаю ў руках да іх бяжыць Тэкля. Шпаркімі ўзмахамі яна сячэзабівае адну змяю, але другая тым часам кудысьці знікае...

— Там, пад зямлёю, у іх гняздо,— паказвае копашкай Тэкля.

А бацька варочае ўжо каня з таго канца поля ў гэты канец

і новаю баразною заворвае, што ўзараў перад гэтым —

і дажджавых чарвякоў, і тую змяю, якую Тэкля пасекла, і тую, якая схавалася пад зямлю.

## ІВАН ГУГОВІЧ

Колішні брыгадзір паляводчай брыгады Іван Шаўкаловіч, па-вулічнаму Гуговіч, казаў, што ён пражыве семдзесят два гады.

Столькі разоў адстукаў яму ў часы яго маладосці, яшчэ пры Польшчы, на адным спірытычным сеансе драўляны столік.

І з ім, і вакол яго ўсё мянялася неаднаразова, і ў чужых землях, і ў сваёй зямлі гінулі аднавяскоўцы, а Іван Гуговіч, нібы зарок, насіў у сабе тую звестку, якая прыйшла да яго з яго канца...

І калі па вёсцы блукалі ўпартыя чуткі: будзе вайна, і ў ёй аніхто не ўцалее, а ў краме бралі мяшкамі запалкі, мыла і соль, я не згаджаўся: не будзе — Івану Гуговічу яшчэ далека да сямідзесяці двух гадоў.

Загінуў ён неяк дзіўна. Паехаў на возе ў лес, а перад мостам чамусьці збочыў, паехаў папльіткаму — уброд, праз раку...

Там і знайшлі яго: на беразе ходзіць конь, воз у вадзе, а пад возам Іван Гуговіч, адно вытыркаецца, у кола ўчаперыўшыся, рука...

Рознае меркавалі пра выпадак гэты. А я прыгадаў ягоны расказ, якому і сам ён здзіўляўся, нібы не верачы, як гэта можа быць...

Ён не дажыў паўгода да тэрміну, што яму тады налічыўся,— мабыць, апошні раз столік стукнуў цішэй.

* * *

На маёй дарозе ўзгоркі і ўпадзіны.

Але гэта **мая** дарога: яна рухаецца, яна разважае, яна размаўляе, яна ўдакладняе маю хаду.

Побач, непадалёку,— асфальтаваныятрасы: на іх усё роўна, на іхусёпэўна, пра іх усё наперад вядома: адкуль яны і дакуль...

Па іх імчацца аўтобусы і аўтамабілі, абапал іх пешаходы ўпэўнена крочаць, але самі трасы стаяць.

Я апускаюся ў новую ўпадзіну — і мяне апаноўвае змрок, якога няма яшчэ на зямлі,

уздымаюся на новы ўзгорак — і сустракаю яшчэ раз сонца, што ўжо на зямлі зайшло.

## РАСКОЛІНА

Дарога, якая мяне вяла, павярнулася папярок і стала расколінай.

Калі не бяру яе пад увагу — яе нібыта нідзе няма,

калі намерваюся перабрацца на той, на другі, на адрынуты бок жыцця — яна пашыраецца на ўсё наваколле.

Я пераходжу трыдзевяць зямель,

адольваю рэкі, пустыні, горы,

ды сутнасць у тым безумоўным, у тым канчатковым, у тым адным кроку, які мне дазволіць **п е р а с т у п і ц ь . . .**

— Скокні,— мне раіць адзін мой сябрук,— і ты пераскочыш, магчыма, на той бок расколіны.

— Спыніся,— стрымлівае другі,— і, мажліва, яна сама ад цябе адступіць.

Настае ноч — сябрукі засынаюць.

Сціхае вецер.

Сутоняцца хаты, дрэвы, платы.

А пад зямлёю, унізе, вясёлая музыка грае,

а ўверсе, па-над зямлёю, зораць вогненныя масты.

## ЛЕСВІЦА

Па крутой, стромкай лесвіцы я ўздымаюся ўсё вышэй і вышэй, каб дасягнуць нарэшце той апошняй, той завяршальнай прыступкі, з якой можна было б рынуцца ў неабсяжнасць —

і апярэдзіць самое жыццё,

і апярздзіць самую смерць...

Колькі прыступак я ўжо мінуў?!.

Здаецца, іх утварае сама хада, сам рух, само мае падыманне ўгору, само мае спадзяванне, што там, вышэй, я стану мацнейшы, чым быў дагэтуль, і змагу тое, чаго не магу цяпер...

Яны адна з адной вынікаюць, яны адна другую прадбачаць, яны перашкода, яны і апора, яны спыняюць, яны і вядуць.

Вышэйшы за дрэвы, вышэйшы за гнёзды, вышэйшы за воблакі, вышэйшы за вышыню,— я слухаю-чую, як мне паўтарае ўпарта мой пакінуты ўнізе двайнік:

«Вяртайся!..

Прыступка апошняя тут.

У неабсяжнасць трэба ўздымацца адгэтуль».

**БУДУЧЫНЯ**

Не бачу яе — прадбачу,
не чую — а прадчуваю,
не ведаю — а прадведваю...

Зямля запяклася, як чорная кроў.
Шчэрацца ззаду здані.

Боязь засцерагае: у будучыні — смерць!..
Адвага натхняе: у будучыні — неўміручасць!..

Мы аддзіраем сябе ад зямлі.
Мы ацярушваем ад глухаты свой слых, адтуляем ад слепаты свой зрок, з няўцямнасці выплаўляем сваё разумение.

Гэта — паўстанне.
Насупраць нас — неабсяжнасць.
Цяжар вызвалення распроствае нашы паставы.
Мы становімся тым, кім яшчэ не былі.
Спрадвечныя зоры вандруюць праз нашы лёсы.

## ШЭРАНЬ

Я чую шмат слоў.

Бачу мноства людзей.

Усе яны кажуць, што трэба адрозніваць няшчырасць ад шчырасці, уяўнасць ад праўды, намер ад здзяйснення, клопат пра аднаго сябе ад клопату пра ўсіх іншых...

Але цяпер зіма.

І словы, і людзі, і ўсё наваколле захутаны ў шэрань.

І сухадрэвіны не адрозніваюцца ад дрэў.

## ЛЯСНАЯ ДАРОГА

Едзем на возе з Хведаркам Барадатым па даўняй лясной дарозе.

Павыступалі з зямлі вузлаватыя карані, быццам чыесьці крыкі і нараканні.

Апавядае Хведарка Барадаты, як шмат тут чаго за вякі адбылося:

як людзі людзьмі пераймаліся,
як людзі людзьмі рабаваліся,
як забіваліся людзі людзьмі...

— Я ведаю,— кажа ён,— толькі трохі, ды ўсё, што было тут, да самых апошніх драбніц, адкрыецца на судзе, на тым страшным судзе, дзе ўзважвацца будуць людскія душы.

Просяцца ў нас, каб падвезлі, каго даганяем: дзядзькі, дзецюкі, маладзіцы, падлеткі, жанкі, старыя,— і мы іх бяром, бо ўсе, хто ні ёсць на гэтай дарозе, ужо не староннія нам, не чужыя, ужо, нейкім чынам, **с в а е .**

Зыбаецца воз па пяску, ляскоча воз па карэнні,

Хведарка Барадаты махае лейцамі і паганяе каня...

Цесна пасеўшы, усім хаўрусам едзем па даўняй лясной — па людской!..— дарозе, едзем на страшны суд.

## СТУДНЯ

Прагну вады.

Але каля студні сядзіць вартаўнік і не дае мне напіцца.

Ён зазірае ў студню і кажа: «Дзівіся!..» Студня глыбокая-глыбачэзная, і светлая ў ёй вада, і яна — мне здаецца — уздрыгвае, быццам сэрца, і падымаецца да паверхні.

— У ёй відаць твая смага,— кажа мне вартаўнік.— Як толькі яна ў табе дойдзе да самага краю, усё пераменіцца ўвачавідкі: вада перальецца праз верх, і ты тады зможаш напіцца ўволю, але дагэтуль — не...

Я веру вартаўніку,

я веру студні,

я веру свайму нераспазнанаму прызначэнню —

і гатовы трываць, колькі трэба трываць,

і гатовы гарэць на нябачным вогнішчы смагі, колькі трэба гарэць. каб споўніць, што мушу і што магу...

Над студняй стаю, і сам я падобны да дзіўнай студні, што ўсёю сваёю істотаю прагне вады, а глыбінёю апошняю — смагі.

## СХОВЫ

Падамся самаю простаю сцежкай, але пярэймуць крывыя,

намацаю самую важкую думку, але староннія зоймуць увагу,

памкнуся спаткацца сам-насам са смерцю, але апынуся ў сховах...

З запаленымі ліхтарамі ў руках і з павязкамі-плеўкамі на вачах прыходзяць і адыходзяць людзі.

Яны мне даюць гэткі самы ліхтар і гэткую самую плеўку-павязку.

— Ты адшукаўся,— кажуць яны.— Ты цяпер зноўку з намі.

— Навошта мне гэты ліхтар? — пытаюся ў іх.

— Каб бачыць у цёмным змроку,— адказваюць мне адны.

— Навошта мне гэтая плеўкапавязка?

— Каб бачыць у яркім бляску,— тлумачаць другія.

А мне хочацца глядзець проста,
а мне хочацца разумець проста
і проста жыць —
і бачыць светлае светлым,
і бачыць цёмнае цёмным,
праўдзівым — праўдзівае,
крывое — крывым...

...На белай, на чорнай, на шэрай зямлі малюю, сціраю і зноўку малюю сваё аблічча.

**ДРЭВЫ**

Блукаю па веснавых гарадскіх завулках:
спыняюся каля кожнай сядзібы,
вітаю кожнае дрэва...

Дрэвы — страчаныя мае браты,
дрэвы — страчаныя мае сёстры.

Якія магілы ляглі між намі?
Якія адлегласці і небасхілы?

Нічога не ўтойваюць дрэвы: як загаворыць да іх наваколле, так яны адгукнуцца: улетку — па-летняму, зімой — па-зімоваму і па-веснавому — вясной.

Іх загароджваюць людзі, прысвойваюць сабе людзі, але яны не належаць нікому, належаць ягады і садавіна, належыць драўніна, а дрэвы — не...

Не перастаю ўсё нанова вяртацца ў наступныя вёсны,

не перастаю ўсё нанова пытацца, што ведаюць дрэвы пра наш, чалавечы, лес...

Прыходзіць у сон мой балесны маці і дастае з-за пазухі яблык: «Калі будзеш есці — ён будзе горкі, а калі з'есца — стане салодкі, у ім разуменне: бяры, каштуй...»

**ЛАНЦУГ**

На панадворку сабакі: на ланцугу.

Яны адважныя — дакуль дазваляе ланцуг,
куслівыя — дакуль дазваляе ланцуг,
брахлівыя — дакуль дазваляе ланцуг,
і злуюцца яны на ланцуг таксама — дакуль дазваляе ланцуг.

Наводдалі, вакол іх, блукаюць ваўчыныя зграі.

Яны прынюхваюцца да сабак, прыслухоўваюцца да сабак, але бліжэй усё роўна не падступаюць:

не дазваляе ланцуг.

## ТАНЕЦ З ВУЖАКАМІ

Змаганне захоплівае мяне: яно разнявольвае ўсе мае здольнасці, яно абуджае ўсе мае сілы, яно становіцца танцам, яно становіцца святкаваннем, яно тчэ з маіх рухаў свой непаўторны ўзор.

Я ашчаджаюся ад яго. І чакаю яго.

А з мора ўжо вынырнулі дзве вужакі — дзве нестатольныя пометы.

Яны апантана накідваюцца на мяне, абкручваюць слізкімі шчыльнымі звівамі, пстрыкаюць джаламі ў самы твар...

Я аддзіраю іх ад сябе, я душу іх рукамі, тапчу нагамі, кручуся, уюся, крычу...

Навокал, з усіх бакоў, збіраюцца гараджане.

Нібыта прыцягнутыя магнітам, яны глядзяць на мой адчайны міжбой, на мае пагібельныя вымогі...

— Якое відовішча!..— у захапленні, я чую, гамоняць яны.—

Мы першы раз назіраем такі напружаны рытм,

мы першы раз бачым такі выкшталцоны танец.

## ПАСТКІ

Каб не баяцца хадзіць у лес, панастаўлялі аднавяскоўцы ў лесе ўсялякіх пастак: на рысь, на ваўка, на дзіка, на мядзведзя...

Пайшоў Сымон паглядзець, што трапіла ў яго самаловы,— трапіў у нейчы сам,

пайшоў Тарас паглядзець, што трапіла ў яго петлі,— заблытаўся сам у нейчай,

пайшоў Дамінік паглядзець, што трапіла ў яго ямы,— нібы скрозь зямлю праваліўся, кудысьці прапаў...

І пачалі яшчэ горай людзі баяцца лесу:
водзяцца там ваўкі,
водзяцца там дзікі,
мядзведзі,
рысі
і — пасткі.

## ДУБОВЫ ПЛОТ

Я рухаюся ўздоўж плота — і плот рухаецца ўздоўж мяне,

спыняюся перад плотам — і плот спыняецца перада мной...

Ён побач, але калі я спрабую ступіць да яго бліжэй — адступае.

З таго боку плота ў доўгай зрэбнай кашулі ходзіць мой дзед. Ён па-змоўніцку мне махае рукою: «Хадзі сюды — я адкрыю табе таямніцу жыцця...»

Але паміж намі дубовы плот.

На кожнай штакеціне плота — бязмоўная дзедава галава.

* * *

Што прымушае нас незаўважна пераходзіць з гадзіны ў гадзіну, з дня ў дзень, з года ў год і не дазваляе спыніцца?

Рэчка цячэ — і знаходзіць дарогу да мора,

дрэва расце, урастаючы ў час і прастору,

і адкрывае ў сабе, жывучы, чалавек неабсяжнасць, дзе свеціць новае сонца і новы сэнс.

Нешта глядзіць на мяне маімі вачамі,

слухае, што я кажу, маім слыхам,

думае пра жыццё маёй думкай...

А на драўляным парозе сядзіць нядужы стары чалавек, яму ўжо цяжка выходзіць з хаты і ў хату вяртацца — цела ўвабрала ў сябе свой шлях і стала само парогам: што чалавеку дапамагае, урэшце, пераступіць і праз тэты парог?!.

Паспелі зярняты — і адшукалі глебу, а паспявалі — туліліся да сцяблiны.

Крычу — адгукаецца рэха.

Маўчу — адгукаецца ціша.

Заходзіць сонца ў мой сон.

І час, як рэльеф невядомай мясціны, сведчыць, дзе ёсць мы і дзе нас няма.

## ПАДАРУНАК ХРОСНАЙ МАЦІ

Хросная маці аддае мне свой падарунак. Гэта люстэрка. Я спрабую ўгледзець у ім сябе, але дарэмна. Яго паверхня зморшчаная і цьмяная, быццам чыясьці далонь.

— У ім жыве Бог,— кажа хросная маці,— і некалі ты яго ўбачыш...

Здараецца, люстэрка яснее, зморшчыны разгладжваюцца — і тады мне відаць то птушка, якая ляціць, то паставы людзей, то абрысы незразумелых рэчаў...

Я губляюся ў меркаваннях: магчыма, я ўжо бачу Бога, ды толькі не ведаю, што гэта ён.

**АСКЕПКІ**

Люстэрка, у якое я бачыў сябе, расцялася на аскепкі —
і кожны аскепак расказвае мне пра сваё,
і кожны гаворыць са мной па-свойму...

У адным — сціскаючы шчыт і меч, я ваюю на полі бою,
сяджу на ўзбярэжжы вялікай ракі — у другім,
у трэцім — кляновай сахою ару палетак,
праз урвішчы і кустоўе ўцякаю ад насцігачоў — у чацвёртым,
у пятым — схіляючыся ля горна, сплаўляю серу і ртуць...

Я спрабую злучыць аскепкі ў адно, але пярэчаць сколы, спрабую ўсіх гэтых — такіх разнаісных — людзей пазнаёміць паміж сабой, але не дазваляюць краі...

Ты, загнаны ўцякач, за кім небяспека цікуе хціва,
ты, засяроджаны ў позе лотасу ёг,
ты, руплівы ратай,
ты, рымлянін ваяўнічы,
і ты, чарадзей-алхімік,
хіба вы нічога-нічога не ведаеце пра мяне?!.

Я той, хто стаіць проці вас, і ўзважвае вашы жыцці, і пераходзіць з аскепка ў аскепак, не ранячыся аб краі.

## ЧАРАВІКІ

Мы ўцяклі: адзін са сваёй рэчаіснасці, другі — са сваёй, а ў часе ўцёкаў сустрэліся.

— Давай памяняемся чаравікамі,— прапануе мне мой хаўруснік.— Калі нас будуць лавіць, то зловяць якраз не таго, каго хочуць.

Ён абувае мае чаравікі, а я — яго, і мы, хто — куды, разыходзімся.

У жоўтай глёўкай зямлі застаюцца сляды ад маіх чаравікаў і ад яго чаравікаў.

Ні цемра, ні светлыня.

Стаіць нерухомая постаць часу.

На небасхіле ўспыхваюць бліскаўкі небяспекі.

За мной — крок у крок — ідуць чужыя сляды.

Я не магу ад іх анідзе падзецца.

Куды нас імкнуць уцёкі?!.

Ён ловіць мяне, я — яго.

* * *

Абуджаюся і засынаю, а ўсё няпоўны мой сон, усё няпоўнае абуджэнне...

А па вуліцы туды-сюды пахаджае, бы штосьці яна шукае, жанчына:

у плюшавым каптане, у паркалёвай хустцы, з абломкам сярпа ў руках...

Усе на яе азіраюцца,

усе ёй здзіўляюцца,

усе стараюцца распазнаць, хто яна,

і ўсе страшацца, што сапраўды распазнаюць.

**ЛАБАРАТОРЫЯ**

У лабараторыі зачынены шчыльна дзверы і занавешаны вокны — сюды не праходзяць староннія людзі, староннія гукі, староннi час...

Тут у гліняных вазонах красуюць ружы, ляжыць на стале наламаны кавалкамі хлеб, плаваюць у вадзе сярод водарасцяў зялёных рыбы,

а ў празрыстай шкляной абалонцы стаіць шаравая маланка, нібы паланёны, увесь з суцэльнага вока, звер...

У лабараторыі, усе на месцах, знаходзяцца пэўныя лвддзі.

Тут дзейсніцца беслерастанна адзін і той самы дослед, праводзіцца адзін і той самы эксперымент:

ці дастаткова вазоны — вазоны, ці дастаткова ружы — ружы, ці дастаткова стол — стол, ці дастаткова рыбы — рыбы, ці дастаткова вада — вада, ці дастаткова маланка — маланка, ці дастаткова хлеб — хлеб, і людзі, якія праводзяць дослед,— ці дастаткова людзі...

Яны сумняваюцца ва ўсіх рэчах,

яны сумняваюцца ва ўсіх з'явах,

яны сумняваюцца ў адчуваннях, у думках і нат у сваіх сумненнях,

а вынікі доследу настойліва адкрываюць ва ўсім, што ні ёсць тут, адно і тое ж:

н і ш т о.

## ВАНДРОЎНЫ ГОРАД

Шумяць вяршаліны дрэў.
Неба зацягваецца смугою.
Усчынаецца дождж.

Я не хаваюся ад дажджу, не зважаю на дождж, я гляджу за Вялікае Поле, дзе бурштынава-жоўтаю светлынёю зорыцца небасхіл,— на адзіна празрысты шматок сярод хмурнай сінечы.

Там, быццам мачты дзівоснага карабля, акрэсліліся званіцы, спічастыя дахі, вежы, акрэсліўся горад —
які я шукаю па ўсёй зямлі,
горад, што выплыў з людской надзеі...

Хіба ўвесь шлях чалавека абмежаваўся зямлёй?!.
Хіба ўвесь сэнс чалавека замкнуўся наўколлем?!.
Хіба мае моц і вагу адно толькі тая думка, якая засціць?!.

Дождж прыбівае дарожны пыл, хвошча па дрэвах, траве, будынках, руччамі цурчыць па равах...

А за Вялікім Полем ззяе бурштынава-жоўтая светлыня і, быццам кагосьці чакае, узвышаецца горад — горад, якога няма на зямлі, горад, які вандруе.

**АДЛІГА**

Жоўтыя ліхтары.
Туман.
Гракаюць гракі ў парку,
і дрэвы гатовы паверыць, што ўжо не будзе зімы.

Нешта скранулася ў наваколлі, нешта адтала.
І намагацца ўжо дужа не трэба,
і засцерагацца дужа не трэба,
сталі спрыяць акалічнасці неспадзявана,
зрабілася ўсё бліжэй,
зрабілася ўсё прасцей,
жыццё пачало атрымлівацца само сабою.

Пятая пара года — адліга. Што забіралі ўсе іншыя поры, яна вяртае:
і зноў магчыма сустрэча,
і зноў магчымае шчасце,
і зноў магчымая неўміручасць.

Распаліся жорсткія сковы, што замацоўвалі ўсіх на адным і тым самым месцы, у адных і тых самых паставах — і пачал! адкрывацца нанова, якскарбы, людзі.

Высачы момант — і азірніся, і ў гэты кароткі прамежак ты ўбачыш сябе, што не паспеў яшчэ стаць мінулым.

Гукаюць нейчыя галасы.
Кранаюць нейчыя лёсы.
Адліга.
Туман.
Жоўтыя ліхтары.

## АДГЭТУЛЬ

Крэсліць вакол мяне доля свае заклёны-кругі.
Груган сядзіць на вяршаліне дуба.
Складаюцца зоркі ў знакі нераспазнанай карты.
Аспрэчвае мэта, што ёсць.
Сны зберагаюць, што трачу.
Ці самы апошні круг — небакрай?

За мною, удалечыні, зноў зелянеюць лясы, зноў палавее жыта, зноў белымі, сінімі, жоўтымі кветкамі ўпрыгожваюцца лугі...

Але не магу я вярнуцца туды, дзе ўжо быў,— проці сваіх слядоў,
і не магу затрымацца тут, дзе знаходжуся сёння.

Мая прастора — мяжа.
Мой час — вастрыё.
Мой шлях — шлях агню: адгэтуль.

**ПАРОГ**

Парог урос у зямлю, струхлеў...

Я б'ю па парозе нагою — з яго сыплецца парахня.

Але гэткі ён толькі зверху, далей ён трывалы, далей ён моцны — і шашаль яго не стачыў, і цвіль яго не збуцвіла,

— О, яму безліч гадоў,— кажа брат.— І высечаны ён з дрэва, якога цяпер няма ўжо,— са шчырага дрэва, і высечаны людзьмі, якіх гэтаксама няма...

Мы не ўваходзім у хату: у ёй жылі нашы дзяды, у ёй жылі прадзеды нашы, а мы стаім на парозе, на шчырым парозе, і адчуваем, што мы гэтаксама парог, да якога — няма нас, і пасля якога — няма...

Ёсць месца ў набытку і месца ў страты.
Дзе растлумачыцца чалавеку, хто ён такі?
Хаты чакаюць, што вернуцца людзі.
Пыл ацярушваецца на парозе.
Калі мы са светам — мы супраць свету,
калі мы з прыродай — мы супраць прыроды,
калі мы з родам — мы супраць роду...
Мінулае тоіцца ў змроку, будучыня — у светлыні.

**СНЕГ**

Такое маўчанне ў снезе,
такая далеч,
такая бель —
што замірае душа: не ўмее яна яшчэ быць такой.

Шастае шорсткая асака.
Сінеюць самотныя лозы.
У вёсцы запальваюцца агні.

У снега позірк маіх надзей,
у снега маіх летуценняў голас.

Снег, ты з бясконцасці? ты з дасканаласці? ты са скону?

Усё, што буяла, цвіло, красавала, усё, што стала мінулым, усё, што стала ўспамінам, усё, што вярнуцца назад не можа,— вярнулася ў белы снег.

У наваколлі яшчэ адно наваколле,
у адвячорку яшчэ адзін адвячорак,
у долі яшчэ адна доля:

снег.

Свет спавядаецца перад снегам. Кранаю далонню снег.

## КРАТЫ

Як здрадлівы лёд, пад намі правальваецца зямля,
самі сабою зрушваюцца са сваіх месцаў нашы бажніцы, астрогі, музеі, крамы...

— Не трэба звяртаць на ўсё гэта ўвагі,— нам раяць аднекуль зверху,— гэта капаюць краты свае норы, усяго-наўсяго краты...

Мы і так не звяртаем даўно ўжо на шмат што ўвагі,
нават на тое, што мы ўжо не надта і мы,
што мы падкапаны ў саміх сваіх думках, учынках, словах,
што — невядома кім — ашуканы, што — невядома як — страцілі грунт...

Мы чуем спаднізу штуршкі — быццам там, пад зямлёй, устае на ногі палонны волат,
адною сваёю часткай палохаемся, і радуемся — другой,
адважваемся і марудзім, чакаем і вырашаем, як быць, што цяпер нам рабіць усё-ткі:

ці слухаць не тое, што чуем, бачыць не тое, што бачым, казаць не тое, што разумеем,
ці напярэймы кратам капаць пад сабой — разам з імі — зямлю.

## ДЗІЧКА

Дзічка-дзічка, чаму ты не груша?

Вось і піла ўжо зубіцца на цябе, і вострыцца ўжо сякера.

Але хіба ведае дзічка, чаму яна дзічка?

Але хіба ведае горкі палын, чаму ён горкі палын?

І хіба ведаюць людзі, чаму яны людзі?

Нешта пагасла ў свеце, нешта замоўкла, нешта асірацела.

Не ўсё, што расце, расце для яды, і ўсё, што расце, расце не адною ядою.

Прыходзіць з мінуўшчыны на апусцелае месца сівы дзядуля.

З будучыні выблісквае ў нашы вочы пажар.

— Яны не мелі таго, што мы сёння маем,— расказваюць сваякі пра людзей, што жылі калісьці,— але жылі яны лепш.

Ці ведае чалавек урэшце, што яму лепш, а што горш,
што — страта, а што — набытак,
што — немач, а што — здароўе,
што — мала, што — шмат?

Усё вырашае па-свойму розум, ды нешта ў жыцці не згаджаецца з ім.

Пад вечар запаліцца ў печы.

І загаворыць — апошні раз — з намі дзічка на самай відушчай мове — на мове агню.

## ВІДУШЧЫ КАМЕНЬ

З веку ў век ляжаў ля гасцінца камень.
З веку ў век ішлі па гасцінцы людзі.

Людзі глядзелі на камень, камень глядзеў на людзей, глядзеў-прыглядаўся і ўрэшце зрабіўся відушчым.

І стала яго відушчасць праменіцца на гасцінец і абпраменьваць кожнага, хто па гасцінцы ішоў.

І сталі рабіцца відушчымі людзі, і стаў кожны ў кожнага бачыць думкі — пярэстыя, простыя, пакручастыя, белыя, шэрыя, чорныя, каляровыя, і стаў кожны кожнага без слоў разумець.

Спачатку ўсе ўзрадаваліся, а потым палохацца сталі гэтага свайго разумення, відушчасці гэтай нязвыклай сваёй.

Накінуліся грамадой на камень — і саштурхнулі яго ў глыбокую яму, але на трэці дзень стала свяціцца яма,

укінулі камень у мора — на шосты дзень стала свяціцца мора,

закінулі камень высока ў нябёсы — камень адно ўсміхнуўся і стаў, быццам новы месяц, кружыцца і ззяць над усёю зямлёй.

Так скончыўся колішні свет і настаў — відушчы.

## АПОШНІ АРГУМЕНТ

Перад тым, як пачнецца бітва, бяссонныя звездары развважаюць-гадаюць, чым яна скончыцца, на чый бок схіліцца перамога.

Я таксама ўзіраюся ў зоркі,
слухаю, як шамацяць лісты,
сачу, як дзьме вецер і як пальмнее агонь...—
усё заўважаю, усё ўлічваю і вырашаю ўхіліцца ад заўтрашняй бітвы:
акалічнасці складваюцца супраць нас.

— Аднак ты забыўся ўлічыць яшчэ адзін аргумент — апошні,— кажа галоўны звяздар,— той аргумент, што ўвесь час засланяецца ад цябе табою.

Я гляджу на яго — і разумею яго.

Кладу руку на агонь — і агонь, які перад гэтым кусаўся люта, ліжа маю далонь.

Мой апошні, непераможны, утоены і ад мяне аргумент,— я сам.

## КАРОНА

Уранні карона знайшлася, а ўдзень яе ўкралі.

Яна была залатая — і злыя суседзі зайздросцілі нашай хаце: за што ім даецца гэткае шчасце — яны такія ж, як мы.

Маўчаць платы і вароты.

Перамяшчаюцца ўпотай цені.

Бацькі не знаходзяць ад роспачы месца: і хто мог падумаць, што за каронай сочаць. .

Я пералажу праз плот у суседскі, зарослы травой, падворак, дзе жылі калісьці брат і сястра.

Былі б яны сёння тут — я расказаў бы ім пра сваё няшчасце, якое магло стаць шчасцем,

я расказаў бы ім пра карону, якую не ўпільнаваў.

Але падворак глухі: няма ні сястры, ні брата.

Дзесьці, дзе зараз яны жывуць, таксама няма і мяне для іх.

Брат мае сястру, сястра мае брата, а я маю тое, кім ёсць.

Аўжо гукаюць-шукаюць мяне бацькі па сядзібе нашай.

«Знайшлася ў другі раз карона,— кажуць яны.— Тая была залатая, а гэтая модная, але ўсё роўна карона, і зноў на тым самым месцы — у лебядзе... Золата ўкрасці зладзеі ўкралі, а ўкрасці карону саму не здолелі: вось яна...»

## МЫ, ЛЮДЗІ

На даляглядзе, у самым канцы пакручастай доўгай дарогі,— сонца,

а на дарозе, ва ўсю яе даўжыню,— мы, людзі...

Калі мы лічым адно аднаго па пальцах — нас шмат,

калі мы лічым адно аднаго па душах — нас мала:

нам яшчэ трэба ўбачыць у іншых сябе, у сабе — нябёсы, у нябёсах — сонца, а ў сонцы — сонцалюдзей.

Спыніўшыся на дарозе, адны з нас будуюць на ёй жытло. Мы ўжо знайшлі,— яны кажуць,— месца сваё пад сонцам.

Другія, збаяўшыся, што іх у канцы не стане, падаюцца назад, ва ўсё большы цень.

Трэція, аддаўшы дарозе, што іх затрымлівала і цямніла, увaходзяць, быццам у браму новага свету, у сонца, і самі становяцца сонцам, і ў людзях зямлі прадбачаць сонцалюдзей.

**ГОСЦІ**

Госці прыйшлі ў мой дом.

Пытаюся, што ім трэба.
Адказваюць госці: мы хочам узяць свой скарб.

Пытаюся, хто яны.
Адказваюць госці: гаспадары.

Відаць, памыліліся госці і забрылі не ў той дом. Я жыву тут ад нараджэння і ведаю ўсё да апошняй драбніцы: вунь — столь, вунь — падлога, вунь — рэчы, бо ўсё, што ні ёсць тут,— яно мае.

Ды госці ўзрываюць маснічыны — і дастаюць з-пад іх куфар,
вымаюць пару цаглін са сцяны — і ўжо трымаюць шкатулку ў руках,
лезуць пад столь — і выцягваюць з нейкай шчыліны нейкі скрутак...

І вось я стаю ў сваім доме — госць.

**ПАЛЁТ СТРАЛЫ**

Напружваецца цеціва: паўакружнасць лука ўраўнаважваецца паўакружнасцю цецівы.

Упарцься, лук!
Супрацьдзейнічай, цеціва!
Вы ўтрымліваеце ў сабе звышвыйсце: палёт стралы.

Я ў хаты ўваходзіў і з хат выходзіў, уваходзіў у гарады і выходзіў з іх — і ўсё адно апынаўся то ў паўакружнасці дня, то ў паўакружнасці ночы, самім сваім існаваннем дзелячы свет надвое і з'ядноўваючы ў адно.

Пакуль я жыву, я абкружаны небакраем,
пакуль я жыву, не магу дасягнуць небакраю:
ён — там, дзе спынюся,
ён — там, дзе ўпаду.

Жыццё ідзе кругам, вяртаючыся да пачатку,
смерць — нацянькі.

І ляціць нацянькі страла, вынікаючы безупынна з сябе самое, вызваляючыся ад сябе самое, каб зрэшты зрабіцца палётам самім.

**ЛУЖЫНЫ**

Збіраюцца парушэнні.
Мяшаюцца поры года.
Як дым, па наўколлі паўзе трывога.

У лужынах млее вада — а людзі не вераць вадзе,

у лужынах грае сонца — а людзі не вераць сонцу,

у лужынах плёхкаюцца аблокі — а людзі не вераць аблокам.

Яны пазіраюць, куды ўжо зайсці немагчыма,— удалечыню.

Там, па дарозе, па лузе, ад лужы да лужы, пасля дажджу, бягуць басаногай чародкаю дзеці, смяюцца, нагамі намацваюць неба, вясёлку, плыты аблок і не баяцца нічога.

Гэта было да таго, як выпаў аднаго разу шкляны дождж,

гэта было да таго, як павыступалі з зямлі нажы і іголкі,

гэта было да таго, як свет стаў раптам дарослым.

## РЫБІНА

Заплыўшы ў затоку, лягу-замру між карчоў кашлатых.

Будуць закідваць рыбакі ў затоку блешні, кручкі, запускаць браднікі, бучы, будуць выцягваць рыбакі з затокі падманутых рыб...

Старая мудрая рыбіна, я прадчуваю ў сабе чалавека, і разважаю пра сэнс жыцця, і пытаюся ў сэнсу, чаму ў сваім рыбіным целе не можа быць рыбіна чалавекам, і не паддаюся на хітрыкі рыбакоў.

Некалі, ужо нежывы, я выплыву на паверхню затокі — і ўсе рыбакі, што ўбачаць мяне, пашкадуюць уголас: авох!..

Такая вялікая рыбіна — і прапала!..

Такая вялікая рыбіна — і не дасталася анікому!..

І я гэтаксама тады пашкадую пра гэта сэнсам, агульным для рыбін і для людзей.

* * *

Прымаю тое, што ёсць, і не прымаю таго, што ёсць.

Перашкодаю, што ўва мне, наштурхоўваюся на перашкоду, што прада мною.

А за маімі плячамі стаіць мая неадольная абарона — смерць —

і кажа: змагайся,

і кажа: перамагай.

Што можа ўва мне паражацца, бярэ параза.

Бярэ, што можа ўва мне памерці, смерць.

Знаходжу выйсце ў бязвыйсці. Пакуль не шукаю ратунку — не маю страты.

Пакуль не турбуюся аб сабе — магутнейшы за сябе.

П'ю з кубка нябёсаў нектар, п'ю з кубка зямлі атруту.

Зычу сабе асалоды і зычу сабе пакуты, зычу дабра і зычу таксама зла.

А прад маімі вачамі цвіце і хаваецца за сябе самое, і разнастайваецца жыццё — мая неадольная перашкода —

і кажа: змагайся,

і кажа: перамагай.

## ПАСТУХІ

Яшчэ з лагчын не сышла вада, а тут, дзе гарыць цяпельца, ужо досыць суха.

Прысеўшы каля цяпельца, чакаю, калі ад далёкага статка прыйдзе мой даўні сябра, з якім я не бачыўся шмат гадоў.

Тут стойбішча пастухоў: хто падыходзіць сюды, а хто адыходзіць, хто прышывае да світкі латку, хто самакрутку няспешна курыць, хто дастае з торбы харч...

«Калі сабраліся ў іхнім двары, каб рэзаць тую карову,— апавядае стары пастух пра аднаго з пастушкоў,— ён раптам збялеў быццам смерць, заплакаў, схапіў, што было пад рукою,— шкліну і кінуўся з ёй на людзей.

Моцна сабе ён тады тою шклінай руку параніў, а крыкам, апостальскім нейкім крыкам: нельга рэзаць кароў!..— параніў людзей...»

Я ведаю: колішні той пастушок — гэта ён, мой сябра.

Гляджу на знаёмую вёску, дзе між драўляных хацін паўсталі гіганты-дамы,

гляджу ў агонь пастухоўскі, што супакойвае і непакоіць,

і ў неба, усё тое ж неба, дзе сярод белых аблокаў блукаюць разам душы апосталаў і кароў.

## РОЛІ

Той, хто ідзе па гэтай дарозе, выконвае ролю, якую дае дарога:
воін ваюе,
музыка грае,
купец гандлюе,
лепіць гаршкі ганчар...

Але калі прыходзяць яны ў канец, канчаюцца іхнія ролі: воін ужо не воін, музыка ўжо не музыка, ганчар ужо не ганчар, і не купец — купец, а ўсё гэта толькі ўмовы, толькі няпростасці той дарогі, якую яны — усе па-свойму — прайшлі.

Хіба, каб адолець дарогу спаўна, канчаткова, дарэшты, трэба спаткнуцца аб кожны камень, зваліцца ў кожную яму, патрапіць у кожны след?!.

Хіба трэба кожнаму быць адразу і гэтым, і тым, і вось тым, і вось гэтым?!.

Альбо наогул не быць нікім?!.

Нічога нікому не хоча тлумачыць дарога, зноў раздае яна новыя ролі, зноў запалоньвае ўсіх сабой...

Зноў будзе музыка натхняцца, што ён музыка,
купец — ганарыцца, што ён купец,
воін — даказваць, што ён воін,
ганчар — пераконвацца, што ён ганчар...

Зноў яны будуць здзіўляцца, што людзі — людзі і што неўзабаве — канец.

## СЯРГЕЙ ЦЫГАН

Сябра майго маленства Сяргей Цыган стаіць на крутым пясчаным пагорку і з левай рукі шпурляе ўгору каменне.

Каменне, што мы кідаем заўзята, з падвойнаю моцай вяртаецца зноўку на дол, прымушаючы нас разбягацца, хавацца, ўхіляцца...

Але Сяргей Цыган не сыходзіць з месца: яму няма ад чаго ўхіляцца, яму няма чаго асцерагацца,— каменне, што ён зашпурнуў угору, і застаецца там.

— На тое ён і Цыган,— мы захапляемся і зайздросцім.— На тое ў яго такая рука...

Мы пакідаем потым пагоркі,
мы выпраўляемся потым дахаты,
кіруючыся на той двор, дзе жыве разам з маці і меншай сястрою Сяргей Цыган — сярэдзіна нашай сябрыны.

А ўвышыні, над зямлёю, плывуць кудысьці вялізныя хмары, і ў іх пагрозліва грукаюць камяні, якія пазакідаў на неба Сяргей Цыган са сваёй левай — шчаслівай сваёй — рукі.

**ПЛЫНЬ**

Ноччу прыйшла вада — і аддзяліла цела ад цела, слова ад слова, сушу ад сушы, жытло ад жытла,

і ператварыла вуліцы ў рэкі.

Тулячыся да платоў, мы ідзём і ідзём уздоўж плыні і адыходзім кудысьці далека, дзе плынь замірае на месцы, а мы пачынаем плысці, як дагэтуль яна сама,—

усё незваротней, усё непазбежней, хаця адзінае, што нам трэба, дык тэта — перайсці на той бок.

## ПЛАНЕТА МЕТАМАРФОЗАЎ

Зайшло сонца — і ў небе ўзышла тая загадкавая планета, якая займае наш розум,
якая прыцягвае нашы пагляды,—
планета метамарфозаў.

Па прыхаманлівых нейкіх законах, нібыта яна выпраменьвае свае ўспаміны ці сны, на ёй час ад часу ўзнікаюць постаці наскіх, знаёмых істотаў:
льва,
чалавека,
птаха,
быка.

Што яны азначаюць?
Чаму іх стolькі?
Можа, яны нешта сведчаць пра нас, што кевядома і нам самім?

Мы нацэльваем на тую планету свае тэлескопы,
шлём да яе сваіх астранаўтаў —
і зблізку, адлегласць адолеўшы, расчароўваемся-распазнаём:
гэта не бык — а зямля,
гэта агонь — а не леў,
гэта не птах — а паветра,
не чалавек — а вада.

Але запаноўвае ноч — і знікае асвойтаная адлегласць, і ў нашым няўзброеным зроку зноўку ўзнікаюць яны — постаці льва, чалавека, быка і птаха, змушаючы нас разумець больш, чым бачым, і бачыць болей, чым разумеем цяпер.

* * *

Гавару, услухоўваючыся ў саму гаворку: што ў ёй?!.

Гляджу, углядаючыся ў само ўгляданне: што ў ім?!.

Думаю, удумваючыся ў самі думкі: што ў іх?!.

Побач са мной, леваруч, ступае драпежны звер, праваруч — непахібны робат,

наперадзе ззяе сонца,

ззаду чарнее цень.

Чым больш я адзіны, тым больш усіхні,

чым больш непаўторны, тым больш увабраў у сябе паўтораў,

чым больш неўміручы, тым болей адкрыты смерці,

чым больш старажытны, тым больш малады.

Мерае чалавека меркай адною зямля, адваротнаю — неба, і меркай двайною сам сябе чалавек.

Звер зыркае на мяне сваім грозным вокам, а робат адну за адной называе лічбы, то адымаючы ад мяне, то прыкладаючы да мяне суму звера і суму сябе...

Я — слова, што вучыцца гаварыць,
думка — што вучыцца думаць,
жыццё — што вучыцца жыць.

## ЯНЫ

Людзі, што мне сустрэліся ўчора і пазаўчора і што сустракаюцца сёння...— уваходзяць яны ў мой лес, быццам яны гэта я таксама.

Нават калі я адводжу вочы — яны ўсё адно глядзяць на мяне,
нават калі не растульваю вуснаў — яны ўсё адно ўступаюць са мною ў размову.

Вось яны, вось: то хаваюцца ў цёмныя нетры майго забыцця, то аб'яўляюцца на белым полі маёй увагі.

Але чаму з разнастайнага мноства якраз яны?
Чаму менавіта яны — **я н ы ?**

**У ЛЕСЕ**

У лесе дрэвы і людзі: той, хто стаіць нерухома на месцы,— дрэвы, той, хто блукае,— людзі.

Збочвае поле ў лес, і збочвае ў лес лагчына.

Быццам заклятае дрэва, ляжыць каля ног маіх цень.

Сцежкі, якія ўва мне, упадаюць у сцежкі, якія ў лесе.

Каб адшукацца, трэба спярша згубіцца.

А таямніца ў самай сярэдзіне нетраў трымае відушчы ліхтар.

Куды б ні ішоў — я вяду за сабою лес.

Дзе б я ні быў — застаюся ў лесе.

А словы складаюцца разам і паўтараюцца бесперастанку: лес — лес.

## З КЛЮЧОМ У РУЦЭ

— Ты не ўсё яшчэ ўзяў з сабою,— кажа мне стражнік, калі я спрабую выйсці з падземнага замка.

Я вяртаюся і аглядаю яшчэ раз рэчы, сабраныя тут.

Я не ведаю іхняга сэнсу і прызначэння, і таму наўздагад бяру сабе тое, што нагадвае мне пэўным чынам мяне самога: бронзавага чалавечка з ключом у руцэ.

Аднак і на гэты раз мне не ўдаецца выйсці.— Ты не ўсё яшчэ тут пакінуў,— кажа мне стражнік, але не тлумачыць — што.

І зноў я вяртаюся ў залы падземнага замка, дзе я і вязень, і валадар, і стаўлю свайго чалавечка на тое месца, дзе ён стаяў.

Што мушу я ўзяць у падземным замку і што ў ім пакінуць?

Я бяру й пакідаю, пакідаю й бяру — і апынаюся кожны раз то ў нястачы, то ў лішку.

**АТАВА**

Кашу траву, якую касіў перад гэтым,— атаву.

Дыхае восень.

Туманіцца лета.

Кранае званы далячыняў туга.

Незаўважна расце трава, незаўважна мяняюцца поры года.

З аднаго канца лугавіны скіроўваюся ў другі канец лугавіны.

Час, як траву, мяне росціць і час, як траву, мяне косіць, і смерць становіцца нараджэннем, якое нічога не памятае пра тое, што было перад ім.

Спяшайся расці, трава,

спяшайся, адна палова імгнення, злучыцца з другою паловай,—

каб спраўдзіўся некалі цуд, каб паспелі ўсе нарадзіцца і не паспела смерць анікога скасіць касой.

## ГЛІНЯНЫЯ ЧАЛАВЕЧКІ

Зайшоўшы на загуменне, накопваю гліны, мяшаю яе са сваёю слінаю і ляплю, што хоча ляпіцца само,— чалавечкаў.

Гэта — сусед Іван,
гэта — сусед Багдан,
гэта — бацька,
а гэта — маці,
а гэта — я...

Прыходзіць на загуменне сусед Іван, прыходзіць сусед Багдан, прыходзіць бацька, прыходзіць маці і дзіву даюцца, што я іх так добра зляпіў.

— Аднак мы самі,— кажуць яны,— жывыя, а вось **яны** нежывыя, і калі ты іх не ажывіш, мы гэтаксама з часам станем такія ж, як і **яны...**

Я стаўлю сваіх чалавечкаў на ногі,
адхукваю іх, бы яны заклякді,
упрошваю іх, каб яны ажылі...

Але не чуюць мяне гліняныя чалавечкі і не намерваюцца ажываць.

Пойдуць суседзі, пойдуць бацькі, а я паранейшаму буду сядзець на тым загуменні,
і думаць,
і мучыцца,
і шкадаваць, нашто я наогул звязваўся з глінай.

* * *

Вобразы вабяць услед за сабою, але памкнуся за імі — і іх растворыць прастора: магчыма, яны проста птушкі, якія адводзяць таго, хто ідзе, ад сваіх затоеных гнёздаў.

Заблытаны сцежкі, якія вядуць і на ўсход, і на захад, але на кожным кроку, усюды, ад іх падымаецца стромкая вышыня, і, падымаючыся над сабою, становіцца розумам цела, і, падымаючыся над сабою, розум становіцца ўсёразуменнем, якое, нібы ваданосныя жылы, сабой насычае і жывіць кожнае слова і кожны крок.

Чалавек — гэта два чалавекі, як дзве далоні, што лепяць суладна снежку ці перакідваюць, каб утрымаць, жарыну: адзін **з** іх — пачатак, другі — завяршэнне, адзін з іх — выток, і другі — суток, адзін з іх — прычына, другі з іх — вынік, адзін з іх — пытанне, другі — адказ, а паміж імі цякуць, вынікаючы з іх і ўпадаючы ў іх, сусветы.

Усё, што кранае мяне, падобнае на мяне.
Не скончаны дзень тварэння: зноўку і зноў вылеплівае чалавек сваю лепшую долю.
Дзеліць мяне прастора, з'ядноўвае час.
Калі чалавек сустрэнецца з чалавекам?
У бездані памяці мгліцца бяссонны ліхтар.

Пачакай, памарудзь, адпусці жаданне — і ты перастанеш быць часткай, нацэленай супраць усіх, і вернуцца да цябе тыя птушкі, якія не ловяцца, калі іх ловіш, якія хаваюцца, калі іх шукаеш, і ты пачуеш: у кожнай птушкі — твой голас, і ўбачыш: у кожнай птушкі — твой твар.

## ТЫГР

На рыжай ссохлай траве спіць тыгр.

Раптам стаў небяспечным час і пагрознай — знаёмая балацінка.

Прывязаныя позіркамі да таго, што бачым, мы паварочваем з Тэкляй назад — да знямелых далёкіх людскіх сяліб, але мляўкія сцежкі расслізгваюцца пад нагамі,

і — абуджаецца тыгр.

## У КАМОРЫ

У каморы, на ўслоне, я заўважаю поўныя ночвы фарбы: белай, чырвонай, зялёнай, сіняй...

Яна не змешваецца між сабой, і вабіць мой позірк, і выклікае вялікую Прагу — хоць і не ведаю, што — маляваць.

Я адчыняю шуфляды, заваленыя рознаю драбязою, і калі выпадкова знаходжу ў адной з іх стары, але спраўны, яшчэ не ўжываны пэндзаль, радуюся, што ўсё атрымліваецца акурат.

Аднак фарбы — ці яны перастоялі, ці перасохлі — насуперак маім спробам не хочуць брацца да пэндзля і, быццам гумовыя, сцягваюцца назад.

Ну не, я ўсё роўна не адступлюся, ну не, я ўсё роўна зраблю па-свойму, я намалюю ўсё роўна сваю карціну і, запусціўшы пэндзаль на ўсю даўжыню дзяржальна ў глыб фарбаў, пачынаю іх перамешваць-варушыць.

І вось уся маса ў ночвах устрывожылася, заварушылася, захадзіла, і знутры яе пачалі выварочвацца, падымацца наверх, паўзці — быццам жывыя яны!.. — вантробы, з белай, чырвонаю, сіняю афарбоўкай — мне на здзіўленне і мне на жах.

Я адкідаю пэндзаль і, спатыкаючыся аб начынне, зваленае на падлозе, уцякаю з каморы прэч — ад моташных гэтых ночваў і ад карціны, якую намерваўся намаляваць.

## СТАРАЯ ХРЫСЦІЯНКА

Яна выходзіць следам за мною з дому.

Зжоўк яе твар, валасы ссівелі, і на ўсім свеце не засталося ніводнага чалавека, хто з ёю дзяліў бы яе дні і ночы, апроч нерухомага, мёртвага, распятага на крыжы Ісуса Хрыста,

Яна доўга дзівуецца, дзе я падзеўся, і, бы разважае з собою ўголас, раз-пораз нягучна кліча мяне, аднак я маўчу, я не хачу ёй трапляцца на вочы, і гаварыць з ёй аб мёртвых рэчах, і прымушаць сябе быць такім, як яна.

Я хаваюся ў жоўтым асеннім тразрыстым кустоўі і з ім станаўлюся адзіным суцэльным зрокам, адзінай суцэльнай душой.

Не ведаю, дзеля чаго, але яна мяне любіць, не ведаю, ад чаго, але яна стараецца выратаваць маю душу.

Пазіраючы па баках, праходзіць яна цяпер зусім побач са мною і — дзіўна — не распазнае, што я тут.

Яна паволі вяртаецца ў дом, а я застаюся ў садзе, дзе кожнае дрэва, дзе кожны куст свецяцца, як на свяце, і бачаць, і разумеюць мяне да самых глыбокіх куткоў маёй чалавечай, не ўратаванай — як Бог на крыжы — душы.

**ГАЗЕТЫ**

Учора была сустрэча з пісьменнікамі з Маравіля — суседняй краіны, суседняй літаратуры...

Сёння — працяг сустрэчы, і сёння прыйшлі газеты, і ўсе, хто ўчора дзяліўся ўспамінамі, чытаў пераклады ці звязваў у вузлы красамоўства ніткі ўзаемасувязяў, вышукваюць у газетах, што пішацца ў іх пра іх.

Дзіўна: хіба не самі яны казалі ўчора гэтыя словы,

хіба не іхнія твары адлюстраваліся на гэтых здымках,

хіба не іхнія прозвішчы складаюцца з гэтых літар,—

каб зараз вось гэтак заўзята, уважліва, з хваляваннем распазнаваць у газетах адно і тое ж — саміх сябе?!.

## ПАСАЖЫРЫ

У пасажыраў сумкі, валізкі, торбы. Калі пасажыры, спяшаючыся, бягуць да свайго вагона, сумкі, валізкі, торбы ўчаперваюцца ім у рукі і ўпарта іх цягнуць назад.

Калі пасажыры ўладкоўваюцца ў вагоне, сумкі, валізкі, торбы займаюць бесцырымонна іхнія месцы і, робячы іх сваімі вартаўнікамі, не адпускаюць іх ад сябе.

Пасажыры турбуюцца, пасажыры хвалююцца, пасажыры шчыруюць, пасажыры слугуюць, нібы яны — сумкі, валізкі, торбы, а сумкі, валізкі, торбы — сапраўдныя пасажыры.

## КРЫНІЦА, З ЯКОЙ ПІЎ СВЯТЫ

Ад царквы да царквы, ад леснічоўкі да леснічоўкі ідзём **з** Арабейкам Іванам, напытваючы сцяжыну да той крыніцы, з якой піў святы.

Мы знемагліся, нас паліць смага, але мы адмаўляемся ад піцця, і людзі, бачачы нашу адданасць святой ідэі, шчырае наша імкненне, нам кажуць, кудою ісці.

Апоўдні гарачага дня мы прыходзім да мэты. Крыніца ўвабрана ў зруб, і Іван Арабейка першы, схіляючыся над **зру**бам, зачэрпвае ў конаўку, што мы знайшлі тут, вады.

Гэта, аднак, не зусім і вада, а — жоўта-чырвоная вадкасць, бы недзе глыбока, адкуль выцякае крыніца, у надземных нетрах, точыцца бесперапынна нейкая бітва і сплывае гэтакаю крывёй.

Іван Арабейка п'е. І я п'ю, сціскаючы зубы, таксама.

Потым мы будзем хварэць, будзем пакутаваць, але будзем ведаць, што далучыліся да самой сутнасці свету і што пілі з крыніцы, з якой піў святы.

## МІТЫНГ

Па снежнай груваасткай дарозе з малою сваёю дачкою паволі іду ў мястэчка.

Калі падыходжу — бачу: тут адбываецца мітынг — ля самай дарогі, побач, на голым палетку, і чую ўзварушаную гаману.

На ім верхаводзіць ксёндз — колішні мой хаўруснік з часоў вальнадумнасці і маладосці з вострым і ясным аблiччам ці ветаха, ці маладзіка.

І словы, што ён цяпер прамаўляе, вострыя, нібы лёзы; крэсляць яны на целе прасторы зацятыя рэзкія рысы і падзяляюць усіх, хто іх слухае, напалам.

У цэнтры мястэчка, ля крамы, таксама сабраліся людзі. «Трэба яго павесіць! Ён — шкоднік»,— гучаць адны галасы. Другія пярэчаць: «За што? Не ён вінаваты ва ўсім, што так сталася, а вунь тыя...» — і пальцы паказваюць угару.

Доўга стаім тут, але дарэмна: машыны з хлебам няма і няма. І толькі калі пачынае брацца на вечар і на ліловым небе ўзыходзіць зіхоткі месяц, разыходзімся па дамах.

З малою дачкой і парожняю кайстраю за плячыма падаюся той самай, занесенай снегам, дарогай назад.

Нічога ўжо не чуваць, не відаць, ужо скончыўся мітынг, але там, дзе ён быў, на сялянскім голым палетку, адтала зямля.

## НОЖ З ДРАЎЛЯНЫМІ ТРОНКАМІ

І вось, бутэлькі з віном і гарэлкай, якія я здолеў здабыць на вакзале ў краме, кудысьці зніклі.

Толькі ў самым кутку каморы сярод папяровых падраных абгортак знаходжу адну з вузлаватага белага шкла бутэльку і доўгі, з драўлянымі тронкамі, нож.

Мяне апаноўвае злосць і роспач: «Ну, я ж яму пакажу! Ён і сюды дабраўся, стары мой п'яніца-бацька...» І па гарачых слядах я кідаюся яго шукаць.

Ён ляжыць у пакоі, на сваім ложку, на якім потым памрэ, і калі я замахваюся на яго нажом, заўважаю яго спакойны і ўсмешлівы позірк, у якім тлее нейкі інакшы, чым я разумею, сэнс.

Ён не баіцца нажа, яго нават, здаецца, цешыць, што я спрабую яму перашкодзіць памерці сваёю смерцю і як бы бяру яе на сябе...

Я спахапляюся: Божа, што я раблю, з кім змагаюся, каго караю?!. Мы апаілі жыццё віном і гарэлкай сваіх пачуццяў і самі сп'янелі і, п'яныя, гаспадарым, адстойваем сваю праўду, выносім прысуды...

Я апускаю паволі руку, узнесеную над бацькам, і пакідаю бацьку ўсё, што маю з сабой: з драўлянымі чорнымі тронкамі нож і не ўзятую ім з вузлаватага белага шкла бутэльку,
і пакідаю бацьку ягоную смерць.

## ТРЫ ТРУНЫ

За доўгія тысячагоддзі ўсё з'ела сырая зямля дарэшты: і косці людзей, і палотны адзення, і труны — з дубу, з грабу, з сасны.

Аднак пасярэдзіне могілак, перакапаных цяпер пад пляцы будоўлі, уцалелі, нічым не кранутыя, тры труны — каменныя чорныя саркафагі.

З вечна сутонлівай і ўжо разбуранай глыбіні іх узнялі, бы дзівосных істот, на паверхню, і першы рабочы, нявечачы камень, ломам, зубілам і малатком ускрывае глухое века першай труны.

Калі яно адымаецца — бачыш: у ёй, бы жывая, ляжыць маладая жанчына — у чорным убранні, з кнігаю на грудзях. «Кніга магічнай мудрасці»,— няўцямна чытаюць усе, хто тут ёсць, залатыя літары назвы, не разумеючы, што ім рабіць зараз з гэтай адкрытаю таямніцай, з гэтай адкрытай труной.

Але неўзабаве агульная ўвага, быццам знайшоўшы выйсце, сама па сабе перасоўваецца да тых -астатніх, нямых, яшчэ не чапаных — знаходак, і ўжо другі будаўнік, схіліўшыся, пачынае вярэдзіць і длубаць другі таямнічы паралелепіпед.

І зноў усё паўтараецца: як і ў першай, ляжыць у гэтай труне, нібы спіць засяроджаным сном, нетутэйшага хараства жанчына з кнігай магічнай мудрасці на грудзях.

Збітыя з панталыку тым, што адкрылі, бы нешта нас падганяе, з жалеззем сваім пераходзім няроўнаю чарадой да трэцяй — каб зноўку адкрыць тое самое,—да апошняй, замкнёнай, каменнай, чорнай, узнятай з глыбіняў смерці, труны.

**SUMUS NESSMUS**

Мы не займаем ніякіх пасад і не маем ніякіх званняў, але якраз у гэтым усе, **хто** ведае нас і не ведае, бачаць нашу пасаду і разумеюць наш чын.

Мы не такія, мы іншыя, але мы апынуліся тут, і тутэйшае наваколле пераконвае нас няспынна, што мы гэтакія, **як** усе.

Мы робім не тое, што хочам і можам, а тое, што нам прапануюць,

а тое, што хочам і можам, хаваем на потым, на некалі, нібы ў труне, у сабе, і, адмаўляючы рэчаіснасць, што не дае нам спраўдзіцца і праявіцца, гэтакзгаджаемся з ёй.

«Я ніколі не каяўся ў тым, чаго не рабіў, але каяўся ўтым, што рабіў»,— нам прысвячаюць свае высновы волаты думкі.

Sumus ne simus.

Мы ёсць, каб не быць.

## НА НЯМЕЦКАЙ ДАРОЗЕ

Там, дзе адна дарога ўпадае ў другую, да мяне падбягае, аднекуль узяўшыся, нізкі, з кутасікамі ў вушах, настойлівы звер.

Ён ненавідзіць мяне І, здаецца, хоча напасці, і я, каб яго задобрыць, развязваю торбу з ядом і кідаю зверу, што маю з сабою,— кавалкі сала, мяса і каўбасы.

Звер глытае мае пачастункі і, калі яны канчаюцца неўзабаве, падступаецца да мяне бліжэй — нібыта я даставаў іх з самога сябе і сам я таксама — сала, мяса і каўбаса.

Злева, удалечыні, віднеецца белы горад. У ім жывуць Немцы — іншыя людзі па мове і разуменні, як трэба жыць.

Але, каб трапіць туды, я мушу паразумецца са зверам, а ён усё болей раз'ятрываецца і выклікае ўва мне ўсё большую боязь, усё большы страх.

З другога канца дарогі чуюцца раптам цвёрдыя нейчыя крокі, іх чуем і я, і звер.

Цяпер і відаць ужо: гэта — Немец, і я, не могучы адгадаць, хто ён мне, сябра ці вораг, нібы збавення, чакаю яго набліжэння, яго прыходу, а звер...

У нерашучасці ён застывае спачатку на месцы, пасля паварочваецца і знікае ў глыбокіх, парослых кустамі, блізкіх равах.

## МАМУ ТХАКУР ДАС

Зазванілі званочкі, усплёснуліся кімвалы, узнесліся галасы. «Харэ Крышна, Харэ Крышна, Крышна-Крышна...» — творыцца махамантра.

Маму Тхакур дас у аранжавым аблачэнні сядзіць, скрыжаваўшы ногі, і, пакуль раздаецца з тацы прасад, гаворыць: «Мінуліся тыя часы, калі нас можна было палічыць па пальцах, цяпер нас шмат...»

Прысутныя, што прыйшлі на гадзіну сустрэчы, слухаюць, згодна ківаюць галовамі І задаюць пытанні.

А я згадваютыя часы, калі Маму Тхакур дас быў проста Міша, калі нікога не трэба было лічыць ні па пальцах, ні як інакш, калі кожны быў значны не тым, што знайшлося, а тым, што шукалася, што спасцігалася і што не мела наймення...

І мне шкада тых магчымасцяў і тых часоў.

## ПАЛЯВАННЕ Ў РАЙСКАЙ ДАЛІНЕ

А потым мы выйшлі ў даліну...

Сінелі ўдалечы горы, урачыста высіліся лясы, і ззяла на небе не сонца, а само неба, нібы блакітная лінза, свяцілася мяккай, лагоднай, прыязнаю светлынёй.

Рупіліся на спелых палетках мірна гожыя дужыя людзі, а на зялёных лугах, у гаях гуляла і жвавілася няпужаная звярына.

Мы доўга моўчкі стаялі, удыхаючы водар шчасця, што напаўняў даліну, ды потым, урэшце, нібы намагаючыся, згадалі, што мы не адгэтуль, што мы не такія, што нам ужо трэба вяртацца, і тады грымнуў стрэл…

Усяго адзін стрэл, але ўся даліна павярнулася тварам, уражаная, да нас.

І вось ля самага небаспаду ўзнікла чырвоная хмарка і шпарка пасунуласяпаплыла сюды, за ёю другая і трэцяя, цэлая чарада, і з кожнай гэтай чырвонай хмаркі на спелы ўраджай палеткаў, да ног нашых, сталі падаць і нагрувашчвацца ў кучы целы забітых казуляў, вавёрак, зайцоў...

Не з ношкай здабычы, а з ношкаю цяжкай гнятлівай віны мы адступалі — і ўсё адступаем яшчэ — з той дзівоснай, з той райскай, загубленай намі, даліны, куды нас завёў аднойчы наш паляўнічы лёс.

**ХМАРА**

Апусцілася над зямлёй і віруе рудая хмара.

Дзе ў хмары сэрца, дзе розум, дзе вочы?

Пужаючыся яе, бегае па прадмесці запрэжаны ў воз гняды конь, і невядома, дзе фурман.

Выюць сабакі, і зашываюцца куры якая куды.

Нібы яго падымае і ўтрымлівае паветра, кружляе па-над мястэчкам з грабеньчатай галавою вуж.

Я кладуся на дол: мне заўсёды хацелася быць бліжэй да нябёсаў, цяпер — бліжэй да зямлі.

Разважаючы між сабой, каму я належу, да мяне падыходзяць дзве не знаёмыя мне жанчыны і становяцца ў галавах.

Няма ў хмары сэрца, няма вачэй, але якаясьці сіла змушае яе віраваць, і вісець над зямлёю, і бачыць, што творыцца з маім сэрцам, і перайначваць звычны час.

**СПАРЫШЫ**

Бы дрэва, што мае адно карэнне, а дзве паставы, я — спарышы.

Той свет і гэты з'ядноўваюцца ўва мне, знаходзяць смерць і жыццё ўва мне ўвасабленне.

З дня ў дзень, з году ў год, з веку ў век збіраюся з тайнаю моцай, каб калінебудзь абвергнуць сваё існаванне, адолець дваістасць і стаць насампраўдзе сабой.

На запытанні «Чаму?» і «Навошта?», з якімі скіроўваюся ўвышыню, вяртаецца мой адгалосак — рэха і, доўга вандруючы ў пространі між спарышоў, знікае.

Я ведаю: гэтак, як ёсць, не павінна быць.

Але гэтак ё с ц ь .

**РУНЬ**

Ідзе па пляцы сваім і нясе вязанку жоўтай ільснiстай саломы сусед і мой школьны таварыш Багданчык Саша.

— Дзе ўзяў ты гэтай саломы? — пытаюся **я** ў яго.

— Ты сам усё роўна не знойдзеш. Хочаш — сястра пакажа,— адказвае ён.

З юнай яго сястрою разам ідзём па разоры, разам выходзім за плот.

Ды там, дзе нібыта павінна ляжаць салома, красуе ад краю да краю поля зялёным-зялёная рунь.

Згодна гаворацца нашы словы, тахкаюць згодна сэрцы, дыхае радасцю невыказнаю рунь,

а Саша Багданчык, чамусьці спыніўшыся на дарозе з вязанкай саломы сваей, пазірае, усё пазірае ў здзіўленні, пакуль яго бачым, на нас.

* * *

За даляглядам грымоты.
Дрэвы ўслухоўваюцца ў трывогу.
Неба вялікае і нямое.
Пахне зямлёй.
Ніхто не пэўны ў сваім жыцці, ніхто не ведае, што з кім будзе.

Падзеленая на пляцы і двары, нанова сабралася разам і стала сваёй прастора, дзе людзі, каб захавацца, выкопваюць сховішчы-ямы і дзе між усіх жыве тая, каго, як відушчы еокал, высачыла душа.

Нічога ёй не скажу, s яна мне нічога не скажа, яна ўсміхнецца зямлі, я ўсміхнуся ёй.

Цяпер у свеце вайна, і што было немагчыма ўчора, цяпер магчыма.

І патаемнай свабодай поўніцца свет.

## ЧЫРВОНЫ ЗМРОК

Ля самай зямлі палымнее чырвоная зорка — сонца: было **яно** срэбрамым раніцою, было залатым удзень, а цяпер увабралася ў колер, пасля якога ўсталюецца цемра,— у колер крыві.

Сябрына тутэйшых вясёлых хлапцоў, падзеленая надвое, дагульвае гульню у мяч,

Захоплены разам з усімі гульнёю, я позна ўспомніў, што ўтульныя белыя домікі сцішанага пасёлка мне не свае.

Такі быў прасторлівы дзень, а зараз і тую вузкую сцежку, якою мушу прайсці

праз лясныя нетры, забірае, імкліва згусаючы, змрок.

Колькі б ні доўжыўся дзень, гэтулькі доўжылася б гульня, але цяпер усё: больш часу не будзе.

Спяшаюся, але ці паспею, пакуль развітальнае сонца сцякае крывёю, дайсці да сябе — дамоў.

Далёкія пільныя вежы, нібы апошнія вартавыя, праводзяць мяне ў непазбежнае падарожжа — у непазбежную ноч.

**ДАРОЖНЫЯ ЗНАКІ**

Мы на шляхах: з рэчаіснасці, дзе ўсё змяняецца то паступова, то раптам, у рэчаіснасць, якая прыцягвае нашу бязмоўную і невідушчую ўвагу, нібы магнітную стрэлку полюс, і ў абсязе якой мы робімся тымі, кім ёсць.

Мы паміраем на ноч, але не належым ночы,
уваскрасаем на дзень, але не належым дню.

Нашы малыя жыцці і нашы малыя смерці выводзяць нас у наступнасць, дзе мы адчуваем-распазнаёмся, што мы тут ужо былі.

Як рухаецца па складах і па словах увага, каб прачытацьурэшце завершаны сказ, гэтак чытаем бесперастанку мы сам сябе, і як важна пры гэтым не схібіць, не зблытацца, не запнуцца, а ўсё прачытаць па парадку 1 цалкам засвоіць нам скіраваны змест.

З глыбіняў вякоў узнікаюць і зноўку знікаюць д а р о ж н ы я з н а к і — людзі, што еустракаюцца нам на нашых шляхах.

**КЛАДКІ**

Мы ідзём па дрыгве.

Абзпая тояцца прорвы, буяежоўтая лотаць, тоўпяцца на куп'і пукі сітнягу.

— Нашто шукаць сваёй згубы? — нам кажуць старыя людзі.— Прыйдзе час, і яна сама, каго трэба, знойдзе.

Не згубы, аднак, мы шукаем, а выйсця — з жыцця, што, не маючы мэты, туліцца ўскрай дрыгвянога бязмежжа, і хіба мы прычынай таму, што выйсце ў ім гэтак шчыльна з'яднана са згубай, а тое, што ёсць, з тым, чаго німа?

Некалі па дрыгве былі пакладзены кладкі, і людзі тады разумелі, к у д ы жывуць, але даўно ўжо кладкі ўбіліся ўглыб, засмакталіся прагнай дрыгвою, і трэба цяпер ісці наўздагад.

Мы гразнем, мы сумняваемся, мы вывяраем крокі, і калі раптам праваліваемся ў згубную глыбіню, знаходзім, гэтак жа раптам, апірышча — страчанае, старое, аднятае, але ўсё роўна заўсёды прысутнае патаемна ў нашых адчайных памкненнях,— к л а д к і.

## БАЦЬКАВЫ РЭЧЫ

Падворак зарос малíннікам і дзьмухаўцамі, і ў ім, паскіданыя, на паламаным старым варштаце, на лаве ляжаць бацькавы рэчы.

Я пазнаю іх, бы даўніх знаёмых: ватоўку, якую і сам надзяваў не раз, шалку-вушанку, кашулю, боты...

На іх свеціць сонца, на іх імжыць дождж, і хоць ніхто іх не носіць, яны захавалі свой даўні выгдад, свой даўні дух.

Я так і ведаў:не мог пайсці бацька з гэтага свету, не пакінуўшы пасля сябе недзе нейкага следу, і Коля Штунда, прыадчыніўшы варотцы ў свой адгароджаны ад астатняй свдзібы падворак, сочыць, што я вазьму.

Скрушна агледзеўшы ўсё, што тут ёсць, я бяру кашулю, бо, затуляючыся лахманамі ад выпадковых людскіх вачэй, я, можа, сюды й завярнуў, што не меў кашулі, але калі спрабую надзець яе на сябе, з прыкрасцю заўважаю: яна ў шмаравідле.

«Што б ты ні надзяваў, ты ўсё роўна заўжды застанешся голы»,— дзіўная думка, якая даймала мяне ўвесь ранак, мне згадваецца наноў.

Пэцкаючыся шмаравідлам, я сцягваю з цела свайго, не надзеўшы, кашулю — нічога з бацькавых рэчаў мне ўжо не трэба.

І Коля Штунда, усцешаны невымоўна, што я нічога сабе не ўзяў, зачыняе варотцы падворка за мною.

## БУЛЬБІНЫ

Жанчына б'ецца з жанчынай.

Адна ўжо старая, другая яшчэ маладая, адна патайком у лагчыне, на латцы, будоўляю не чапанай, нічыйнай зямлі, накапала бульбы, другая, што гэтую латку асвойвала і засявала, яе застала, адна спрабавала ўцячы, другая яе напярэсцігі даганяла, і вось...

З торбы, у якую ўчапіліся рукі адной і рукі другой, на дол падаюць буйныя белыя бульбіны.

Пэўна, яны не падобны да слёз, ды цяпер, ды цяпер усё-такі слёзы.

## ІДАЛ

Утоены ў поцемках сноў, моўчкі чакэе, калі хто ўвойдзе ў яго абсягі, і хто заўважае яго, заўважаецца ім.

Тады загараюцца яго вочы і, нібы ўключаецца нейкі дасведчаны механізм, ён пачынае ўсім целам сваім вібраваць-верашчаць і, трушчачы супраціўленне, бы ў павуціну, захоплівае ў гэтае вібраванне сваіх ахвяр.

Ён ведае, рана ці позна, кожны, як да апошняга раздарожжа, прыйдзе сюды, дзе ён;

але хто паддасца яго прыцягненню, ужо нікуды далей не пойдзе, хто ж пераможа сваю залежнасць, пойдзе дарогай багоў.

Тут, на паверхні, мы высвятляем свае стасункі з сабой і з багамі, а там, у сваёй глыбіні, не чуючы нашых размоў, нас чакае ідал — наш уцялеснены, намі забыты, сон,

## НА СВЯТА ЗБАВЕННЯ ДУШЫ І ЦЕЛА

На света Збавення душы і цела прыходжу ў старую драўлямую нашу бажніцу, куды не прыходзіў ужо даўно.

Аднактам вялікаю шчыльнаю грамадою стаяць нетутэйшыя хмурныя людзі і правіцца набажэнства на мове нязвычнай, чужой.

З бояззю перад імі я, ледзьве ўвайшоўшы ў бажніцу, выходжу і разам з усёю збянтэжанаю акругай чакаю ля ганка, калі настане наша чарга.

Мінуўся той час, калі мы прыходзілі ў нашу бажніцу, калі хаіделі,

мінуўся той час, калі цела было тое самао, што душа, а душа тое самае, што і цела.

**АЛЁСЫ**

Ад вёскі мала што засталося — адно некалькі хат са старымі людзьмі і яшчэ бальніца.

Па вузкай стаптанай бальнічнай лесвіцы, прытрымліваючыся за парэнчы, мы сходзім уніз.

— Мне ўсё тут знаёма з маленства,— дзялюся сваімі ўспамінамі са сваёй спадарожніцай,— Тут працавала, сюды прыехаўшы яшчэ да вайкы, акушэркаю мая маці...

Яна глядзіць на мяне ціхмяным глы**бокім** блакітным паглядам.

— А я вось прыехала,— кажа яна,— сюды з далёкага свету, каб тут нарадзіць, каб у тым замежжы, дзе я цяпер жыву, прысутнічала, гучала і цешыла мне душу імя нашай вёскі —

**Алёсы.**

**НАВІНЫ**

Калі між сабой сустракаюцца двое ці трое, яны перш за ўсё пачынаюць адно ў аднаго пытацца, адно аднаму казаць, што дзе адбываецца ў свеце, што дзе чуваць.

Усюды, як стравы, чакаюць навін і шукаюць навін, і той, хто трымае руку на навінах, амаль прарок.

Нібы набажэнства новага часу, усіх далучаюць навіны да нейкай (якой — невядома) з'явы, усіх уключаюць у нейкі (які — невядома) абрад.

Шчасце мінула, надзея знікла, жыццё, што квітнела і вабіла, раптам паблякла, і толькі ўзышоў з глыбіні перакуленых з'яў і сабою праняў навакольную рэчаіснасць адзін невідушчы, няўлоўны, спадманлівы колер —
колер навін.

## ДАРАГІ ЗАПАЛЯНЕЦ

Нагружаны кніжкамі, прыйшоў да мяне Дарагі Запалянец і — як падарунак мне — разам з сабою прывёў паэта, якога знайшоў ён і ўзгадаваў у сваім вясковым краі.

Я доўга чакаў яго — можа, гады, а можа, дзесяцігоддзі; адтуль, дзе ён жыў, надыходзілі сінія вёсны і каляровыя лістапады, адтуль наплывалі залевы і нарываліся завірухі, туды адыходзіла і абдымала сабою ўсё запалянскае наваколле, паволі развітваючыся са мною, мая маладосць.

Знаёміць мяне Дарагі Запалянец з кніжкамі, ім перажытымі, і са сваім гадаванцам, які на цэлую галаву вышэй шы і за мяне й за яго, і кажа, што гэта — мая маладосць, а я, пасміхаючыся, пакідаю гэту сваю маладосць асвойвацца ў доме і на падворку,

а сам з Дарагім Запалянцам іду, паступова знікаючы, за той лес, які, нібы гутарыць з намі, становіцца вокамгненна то восеньскім, то вясновым, за тую рэчку, што, падуладная нейкай вялікай змене, цячы пачала назад.

**ПАДВОДНЫ ПЛЫВЕЦ**

Падводны плывец, час ад часу вынырваю на паверхню, і ўсё наваколле зварочвае на мяне сваю ўвагу, спрабуючы высветліць і мне давесці, хто я такі.

Дакуль я нераспазнаны — я ё с ц ь, але калі я прыпамінаю, кім быў калісьці, у вострай увазе свету ўзнікае нешта, што вылучае мяне са свету і асуджае на смерць.

Мне падабаецца жыць — але адно толькі жыць немагчыма,

мне падабаецца ведаць, што людзі мяне разумеюць — аднак, аднак гэтаму разуменню заўсёды пярэчыць адна неадольная перашкода, і гзтая перашкода я сам.

Злучаны з плынню, плыву ў невядомыя далячыні, каб калі-небудзь у свеце недзе знайсціся зноў.

## МАЛЕНЬКІЯ НОЧВЫ

Нехта стукае ў дзверы.

Я доўга, не ведаючы, хто гэта стукае, не адчыняю, а калі адчыняю, бачу: стаіць за дзвярыма бацька з маленькімі ночвамі ў руках.

Ён кажа: «Пакуль ты мне адчыняў, я схадзіў пад царкву і ўзяў вось гэтыя ночвы, каб і м і стукацца ў дзверы.

Ці помніш ты гэтыя ночвы: ты ў іх купаўся, калі быў малым...»

Я гляджу на маленькія ночвы і, нібы ўва мне адчыняюцца нейкія дзверы, у іх пазнаю, што і помніць не помню, што згадваць не згадваю і што не мае ні вобразу, ні найменне, а мае мяне самога,—

с в а ё.

## СЕРБСКАЯ ВЁСКА

Некуды падаў, траціў прытомнасць, поўз, а развіднела — паўсталі з імглы будынкі і выйшлі людзі...

— Што гэта за мясціна? — спытаўся я ў першай, у чорнай хустцы, старой жанчыны, з якою сустрэўся на вуліцы...

— Козіцы, сербская веска,— сказала яна і ўступіла ў дзверы адчыненай крайняй хаты, а я гэтаксама за ёю, спрабуючы высветліць, ці далека ад Козіцаў да сталіцы...

—

Учора было ў гэтай хаце вяселле, а зараз — рэзрух.

Смуткуючы, маладая сядзіць ля акна, і вострацъ мужчыны нажы на ганку.

— Дваццаць чатыры д'яблы,— сказала, адказваючы, старая, і мне было дзіўна чуць аб гэтакай меры шляху,

і цяжка было мне даўмецца, ці месцяцца ў д'ябле **вёрсты,** ці, **можа,** д'яблы ў вярсце.

Кожны з прысутных мне нешта хацеў растлумачыць, і спараджала ўсякае слова мноства наступных слоў, а кожная лічба мноства далейшых удакладненняў.

Адно маладая сядзела, як і раней, ля акна і моўчкі глядзела некуды ўдалеч.

**СКАРБ**

З зямлі выкопваюць скарб — гаршчок старажытных рымскіх дынараў.

Ніхто не ведае, як яны апынуліся тут, у гэтай паўночнай, далёкай ад Рыма, краіне, хто іх калі сабраў, хто іх калі, баючыся за іх, закапаў...

Калісьці яны валодалі дзейснаю моцай — рушылі войскі, узводзілі гарады, чынілі прысуды, аднак і цяпер...

Яны сцярожка кранаюцца нашых рук, кранаюцца нашых душаў — і ў нас ажываюць паволі нам не знаёмыя вобразы, нам не вядомыя з'явы,

і мы, здзіўляючыся, разумеем, што мы гэтаксама зямля, што **мы** гзтаксама зямля, у якой схаваны нейчыя скарбы.

**ДАСЯГНЕННІ**

Каб дасягнуць таго, што вышэй за мяне, я адмаўляюся ад таго, што маю.

Удача і поспех, выпрабаваныя павадыры, выводзяць мяне са свету адвечнага кругазвароту і ўводзяць у свет барацьбы і падзей.

Я надаю жыццю сэнс, і жыццё здзяйсняецца мной і са мною, паказваючы, што яно можа, што — не.

Я авалодваю доляй, доўжуся ў заваёвах, аднак мае новыя дні як найвялікшую мэту мне адкрываюць, што ўжо мінула, і як найвялікшую ўзнагароду мне абяцаюць тое, што я ўжо меў.

**ПАЛЁТ КАЖАНА**

Згусціліся прыцемкі — і ў паветры замільгацела істота, якая не ўмее лётаць,— кажан.

Здаецца, ён заблудзіўся і выпаў сюды з прадаўняй, ужо не існай, прасторы і зараз зачэпіцца за правады, нацягнутыя на слупах, наштурхнецца на шчыт будынка альбо, не ўтрымаўшыся на вышыні, упадзе...

Аднак жа так не здараецца: быццам зводдаль намацваючы прадметы, упісаныя ў наваколле, ён своечасова ўхіляецца ад перашкод.

Ён рухаецца штуршкамі, і скураныя крылы — пругкія плоскасці, на якія абапіраецца рух.

Як драпае цвік па шкліне, ён выпраменьвае востры пранозлівы гук, і людзі, каб гэтага гуку не чуць, зачыняюць вокны і дзверы, а той-сёй, дасціпнейшы, на падворку разгортвае белую латку тканіны, каб кажана злавіць.

Нічога не скажаш: няўклюдны, няроўны, прышыты да спратаўзямлі, недалёк! палёт кажановы валодае нейкай сваёй адвагай, нейкім сваім натхненнем,

але натхненнем гэтым кіруе змрок.

## СТАРЫЯ ДРЭВЫ

Крыжы мураванай, завешанай цяжкім замком, бажніцы, хаціны, утуленыя ў даўніну, пагорак, дзе нешта раней было, а цяпер зарасло дзірваном і рассыпалася на каменне:

дзень на радзіме ў сябра, які не вярнуўся аднойчы н і к у д ы, але які перад гэтым мяне сюды запрасіў.

Усё на радзіме ў сябра без сябра страта, і калі на схіле пахмурага дня я збяруся адтуль пайсці, у бязлюдным прагале завулка прыкмечу тое, што, нібы злом прасторы, спыніць увагу маю і здасца надзіва знаёмым,— старыя вялікія дрэвы,

і я, у прадчуванні сустрэчы, памкнуся насустрач ім.

## ЧАЧЭНСКАЯ КУЛЯ

Жывы — не жывы, мёртвы — не мёртвы, вярнуўся з чачэнскай вайны Чапялевіч Міхась дадому з ранай крываваю ў грудзях.

Яго лячылі ва ўсіх шпіталях, яго глядзелі ўсе дактары, але ўсё адно не змаглі загаіць яго лютай раны.

Канчае і зноў пачынае расказваць ён пра сваю вайну і сваю пакуту.

— Мяне параніў мёртвы чачэнец,— кажа Міхась Чапялевіч.— Раздушаны тракамі танка, ён быў ужо нежывы, але перад тым як навекі супасці з зямлёй, са слатой, з нябытам, паварушыўся, стрэліў, і куля пасланая ім, напаткала мяне...

Мы слухаем споведзь свайго земляка, свайго радака і роднімся ранаю незагойнай з бязмежна адважным, бязмежна адданым жыццю народам, з якім на вайне, што нібыта была і нібыта не, Чапялевіч Міхась ваяваў.

## НАВАЛЬНІЦА

Яшчэ над зямлёю па-летняму ззяла сонца, цягнуліся ў вабныя далячыні барозны палёў і кветкі дарылі паветру свой шчодры водар, ды ўжо, быццам зрок пачынаў недакладна бачыць, прастора нацягвалася смугою і ў крыку імклівых ластавак чуўся спалох.

Нешта ў прыродзе было не так, і, каб даўмецца, дзе яно, тое не так, я спыніўся і азірнуўся, і вось — нібы тыя малюнкі, што малявала лета, былі адно толькі маімі ўяўленнямі, а цяпер наставала сама сапраўднасць — знямелы, убачыў: паветра трымціць і віруе, і змрок перамешваецца з бліскатнай светлынёю, і вогненныя пісьмёны крэсляцца ўсцяж...

Блізка страшэнная навальніца, і сховаў, каб ад яе ўхіліцца, няма.

**ДВА БЕЗЗАКОННІ**

Адно беззаконие народзіць другое — яшчэ бессаромнейшае — беззаконне.

І новы парадак, што меўся, калі наставаў, быць праўдай, раздвоіцца сам у сабе і, калі настане, акажацца ашуканствам:

а той, каму дасца ўлада, каб ён быў для ўсіх сваім і ўсе для яго сваімі, акружыць сябе ланцугамі ахоўнікаў і дарадцаў і ўзненавідзіць сваё.

Крывое не зробіцца простым, а скрывіцца яшчэ раз.

**БЕЗДАНЬ**

Не краявід гэта быў і не новы горад...

Але калі я, паддаўшыся зману, перахіліўся праз край тратуара, напружанага, нібы струна, і ўгледзеў, што тоіцца там, унізе, усё стала позна ўраз.

Не краявід гэта быў і не новы горад, а — страшная чорная бездань: яна займала сабою да самага небакраю ўсе падасновы, усе абсягі і, падымаючыся да паверхні, мяне забірала ў горада і ў краявіду і невідушча глядзела мне ў твар.

Нібыта пры замыканні, бліснула бліскавіца і гром прагрымеў, і проста перад сабою, на ўзроўні вачэй, я ўбачыў абсмалены сколаты камень і свае рукі, якія ўчапервaліся ў гэты камень, а ён паволі і неахвотна іх адпускаў...

І ўсё, што цяпер я бачыў і што разумеў, здалося мне раптам надзвычай знаёмым, нібы рассвятлялася мая памяць і штосьці спяшалася мне паказаць, а сэрца пярэчыла гэтаму і не хацела, каб аб'явілася тое, апошняе, ш т о.

...Сілай апоры пераадолеўшы сілу цяжару, выкінуся на тратуар.

**СПРАДВЕЧНЫ ПЫЛ**

Спрадвечны гасцінец.

Людзі, калі праходзяць альбо праязджаюць па ім, быццам яны парушаюць нешта, што ўжо належыць не гэтаму дню, уздымаюць пыл.

А потым паволі знікаюць — і пыл асядае.

Але калі я думаю пра людзей, мне прыходзяць на памяць словы, якія нібы не тлумачаць нічога:
**с п р а д в е ч н ы   п ы л .**

## НАДЗЕЯ, ЯКАЯ НЕ МАЕ ПАТРЭБЫ Ў АБГРУНТАВАНН!

Мусім тлумачыць усім і сабе таксама, што азначаюць нашыя словы, і прыкладаць іх да нейкай, схаванай у памяці, меркі, каб ім вярнуць першаісны змест.

Мы на паверхні з'яваў: усё, чым былі мы істотныя, засталося ў пластах глыбіні, і хоць мы не вандроўнікі, мы ўсё адно ў выгнанні, і забароны кіруюць намі, з дня ў дзень прывучаючы нас зразумець ізасвоіць, што дазваляецца нам, што — не...

Цьмяныя нашы мэты, і, асягаючы іх, пярэчым шчырым сваім памкненням: усё-ткі мы трацім усякі раз болей, чым здольны набыць.

Мы ў спрэчцы з сабой.

Але, быццам багіня кранае рукой за касмык валасоў, незаўважна для ўсіх астатніх, угневанага Ахіла, нас раптам кранае спакой —

і мы пазіраем з надзеяй, якая не мае патрэбы ў абгрунтаванні, у тое, што мае быць.

**ГАННА-МАРЫЯ**

Два святары — адзін у светлым, як дзень, адзенні і ў чорным, як ноч, другі – разам ідуць па вясновай стрункай дарозе і разам нясуць зіхатлівы, з ружовых кветак, вянок.

Яны пазіраюць далека наперад — і ціхая радасць іграе на іхніх тварах: яны ўжо бачаць таго, хто ім сустрэнецца самапершы і каго яны ўзнагародзяць сваім вянком.

Гэта — Ганна-Марыя.

І калі святары аддаюць ёй вянок, ёй мроіцца, што прастора супала з лёсам і **што** ўжо калісьці з ёю такое было...

«Тое, што я вам сустрэлася першаю, - выпадкова»,— нібы апраўдацца за нешта, хоча яна ім сказаць, а словы ўсё роўна складваюцца па-свойму і вымаўляюцца ўголас: «Das ist kein Zufall»[1].

[1] Гэта невыпадкова (ням.).

## СЛЁЗЫ

Людзі ідуць са сваёю бядой да сваіх дабрадзеяў — хто аб'яўляючы ўголас, што жыць так нельга, а хто нічога не кажучы, моўчкі, нібы звінаваціўся сам.

Кранутыя гучна-нямою людскою бядой, дабрадзеі плачуць — і шчодрыя іхнія слёзы ім замінаюць бачыць саміх людзей.

## СТАРЭЙШЫ БРАТ

Яны як дзве кроплі вады падобныя між сабою, і я называю міжволі малодшага брата імем старэйшага: Анатоль.

Ён толькі што выйшаў з лодкі і адчувае сябе на сушы не дужа ёмка, бы рэкі, якімі ён плаваў, зрадніліся з ім і не хочуць яго яшчэ адпусціць.

Старэйшы быў лётчыкам, і ўжо цяжка злічыць, колькі гадоў мінула, як ён са сваім самалётам, уцягнуты ў вір апраметнага віражу, разбіўся.

Але аднекуль прабілася і пасялілася між людзей упартая дзіўная чутка, што ён не загінуў зусім, а займеў не вядомую людзям магчымасць вярнуцца назад, на зямлю, у сваё жыццё.

Каб нешта сказаць, пытаю малодшага брата, ці вучыцца ён, ці працуе, ці проста застаўся дома і ці мяне пазнае, а ён на мой роспыт адказвае з нейкай унутранай неахвотай, бы тое, што адбылося, не да канца яшчэ адбылося і мусіць чакаць свайго завяршэння,

і зноўку мне здасца, што гэта старэйшы брат.

Далёкія сінія вербы гнуцца пад ветрам.
Рэкі, напоеныя разводдзем, поўніць спакой.

## СВЯТОЕ ЖЫТА

Кветкі і свечкі, прынесеныя з сабой, і яшчэ няхітрая спожыць, якою жывыя дзеляцца з тымі, што некалі гэтаксама жылі на зямлі.

Усё ўжо сабрана, выкапана і пажата, і сёння якраз той дзень, калі сумяшчаюцца восі таго і гэтага свету і дзейсніцца свята яднання жывых і мёртвых — восеньскія Дзяды.

Мы пойдзем да агароджы і ўбачым грудок маладога жыта — бы тут, на дзялянцы гэтай, у гэтай зямлі, пахавана само маладое і мілае людзям лета, але, пахаванае, узышло.

І, можа, таму, што цяпер у свеце пануе іншая норма, мы з пашанотаю кажам: «Святое жыта»,— і, як адкрыццё, скіраванае нам, прымаем спрыязнены з простым! вечнымі рэчамі цуд.

## ЧЫРВОНАЯ ГЛІНА

Мы выберам шлях, і, быццам кругі аблогі, ззаду пачнуць заставацца мінулыя дні, а новыя сведчыць пра нашы магчымасці і дасягненні і абяцаць нам, што мы ўсё адно аднойчы сустрэнем чырвоны горад, і пераконваць нас, што нішто не зможа спыніць наш адважны і скіраваны да межаў шлях.

Ды нехта, нібы выпадкова, скранецца і пойдзе таксама з намі, не пакідаючы на паверхні зямлі слядоў, і калі мы захочам разгледзець, хто альбо што гэта,— ціха адхіліцца і растане, і мы падумаем пэўна, што гэта анёл ці бог.

Недзе ля самага краю часу па хісткім схіле нам давядзецца спускацца ніжэй і ніжэй, у зямную глыб, а спусцімся — дык убачым: чырвоная вязкая гліна зойме ўсё дно прадоння,— і змусіць нас прыпыніцца, а потым, калі мы прабудзем з ёю сам-насам да заўтра, змусіць нас нанава ўзняцца наверх і пайсці, не аспрэчваючы нічога, назад.

**БУРА**

Нібыта надумала нешта бура...

Хвалі, якія шалелі на моры і ўзрушвалі мора, раптам аціхлі, і ўсталявалася ціша.

І ў гэтай напружанай грознай цішы, бы падзялілася мора надвое, паволі паўсталі дзве велізарныя хвалі і, вырастаючы ўсё вышэй і вышэй, да самых, нахіленых ніцма, нябёсаў, рушылі нецярпліва адна на адну...

Гэта было заўчора, а сёння зноўку неба высока, і зноўку, нібы ўспамінаючы нешта, трывожыцца мора, і доляй сваёй зняволены дух зноўку марыць пра буру.

## АТРАД

Падуладныя нам перададзенаму загаду ідзём парадзелым сваім атрадам у далёкую вёску Лукомер, дзе нас чакае расстрэл.

Нам хочацца жыць, але мы на вайне, і вышэйшая непазбежнасць трымае ў руках наш лес.

— Гэта апошні наш бой,— кажу я, падтрымліваючы сівога, у скрывянелых бінтах байца і адчуваю з усімі разам, што ўсё наўкола для нас насамрэч пачало быць апошнім і поўніцца невыказнай спагадай да нас.

Нам доўга ісці: за рачныя поймы, за балаціны, за нівы, за пушчу, за небасхіл,— і мы невымерна рады, што перад тым, як знікнуць, дні будуць доўжыцца і кружыцца, і ўводзіць нас паступова ў сваю незваротную глыбіню.

Наўскрай то пясчанай, то ўтравянелай дарогі красуецца жыта, і, падышоўшы бліжэй, я ў ім заўважаю гняздо і чародку птушак: вывеліся перапеляняты і ўжо абжываюць жвава жытнёвы свой свет.

У гэтым краі мінала маё маленства, і я дамаўляюся са сваімі камрадамі па атрадзе, што на гадзіну ці мо трохі болей, чым на гадзіну, я адлучуся, а потым іх маіаню.

Я разуваюся і пакідаю салдацкія цяжкія боты ў жыце і паварочваюся — каб наапошне сустрэцца і развітацца — да колішняга, тут мінулага і ад мяне ўжо аддзеленага назаўсёды, майго жыцця.

Забытыя сцежкі рынуцца мне насустрач, і павыходзяць з-за хатаў вялікія думныя дрэвы, і праплыве паўз мяне са звінюткімі галасамі і дарагімі абліччамі школа,— ну а затым...

Затым я знайду свой абутак у жыце і даганю свой атрад.

**РЭЧАІСНАСЦЬ**

Ні змрок, ні святло.

Ні ўчора,ні сёння.

Не ведаюць дрэвы, ці ім зелянець далей, ці скідаць лістоту.

Не разумеюць вароны, ці ім куды адлятаць, ці сядзець на дрэвах.

Суседзі сабраліся пераязджаць, ды раптам адумаліся і заносяць рэчы назад — у старую кватэру.

Усе перашкода ўсім.

Словы не маюць, куды казацца.

Цені, што падалі ад людзей, супадаюць з людзьмі.

На рэчаіснасці пляма.

**ПЛЯМА**

Дробныя плямкі зніклі, але ўтварылася і засталася вісець у паветры адна, набрынялая чарнатою, вялікая пляма.

Што з ёй рабіць: ці размесці яе на шматкі?

ці вынайсці яшчэ большую пляму, каб ёю сцерці яе?

ці, зрэшты, яе зуеім не чапаць — і яна паступова знядужыцца і растане ў нябеенай, напоенай вечнасцю, чысціні?

А некалі ж мы яе прьвклікалі нецярпліва, жадаючы ёю сцерці адразу ўвесь бруд.

## ПАГАРДЖАНЫ ПРАРОК

Што надыходзіла — адышло, што абяцалаоя — пастаяла, як белае воблака над галавой, і паціху растала.

Так многа было малых і вялікіх падзей — а самай Істотнай усё-такі не хапіла, так многа было еуетрэч — але ўсе яны ўжо за мяжою часу і адгукаюцца калі як.

— Чалавек, ты з'еў свайго Бога,— казаў велікодным днём пагарджаны прарок і стукаўся велікодкым чырвоным яйкам у чорны камень.

Вось, мёртвае ажыло.
І вось, жывое змярцвела.

# ЯН

Падыходзячы да сваёй, абнесенай плотам, сядзібы, ён пачынае развасабляцца — скідаць свой чорны манаскі ўбор.

Гэта якраз той час, калі ён ужо не манах і яшчэ не спадар, і я выбіраю якраз гэты час, каб нацянькі падысці да яго і, здзівіўшы сваім з'яўленнем, яму сказаць...

Я нават не ведаю, ш т о, бо тое, што хоча настаць і адбыцца, не супадае са сказаным, як з зямлёю, з яе падымаючыся паволі, не супадае трава.

Вуліца доўгая і пустая.

Хмурыцца — бы на дождж.

Хвіля — і ён (ці, па-новаму, Ян што не схацеў свайго шчасця, каб шчасцем зрабіцца для ўсіх астатніх) адчыніць варотцы ў сваю сядзібу,

і ў гэтую хвілю я дакрануся рукой да яго пляча і, адчуваючы, як з-пад стаптанай цьмяиай паверхні пругка расце маладая трава і як збіраецца дождж у згусцелай хмурнечы, скажу найпершыя словы: «Добры дзень, Ян...»

**НЕШТА**

Нешта (а што — невядома) недзе гарыць: размыты абрысы знаёмых рэчаў.

Людзі стаяць на прыпынку знямелым натоўпам: быццам забыліся нешта, а што — не могуць згадаць.

Шэсцьдзесят шосты **дзень** сядзіць у астрозе за нешта зняволены журналіст і ўжо немаведама колькі здольная нешта сказаць банкірка.

А каля плота, быццам вартуе нешта, блукае руды сабака: калі яго хто намерваецца прагнаць, ён натапырвае поўсць і гыркоча, калі яго хто намерваецца прыручыць — уцякае.

## КОЖНЫ РАЗ НАНАВА

Нібы для самога сябе памерці, му**сіш** урэшце выпасці **з** круга пытанняў сваіх і сваіх адказаў, каб здолеў твой Бог запытацца табою і табой адказаць.

Нас разбіраюць нашыя ўчынкі — і застаецца ўсё менш нас і менш для здзейсненай думкі, для сутнага слова і для сустрэчы, якой мы заўсёды чакаем і ад якое ўхіляемся кожны раз.

Мы заўважаем не тое, **што ёсць, а** што аб'яўляецца, што мільгаціць, што махае, быццам нас вабіць, рукамі, што кружыцца, што ўладарыць, што, насяляючы плошчы і вуліцы, зычна гамоніць і выглядае ўрачыста, а тое, што ёсць, нас адсоўвае за кругі акрэсленых кожны раз нанава небасхілаў.

## СВЯТА, ШТО НАСТАЕ

Калі мы пяройдзем мяжу і голай пясчанай дарогай будзем вяртацца дамоў, за мамі, там, дзе надоечы мы былі, успыхне **пажар,** а на нашы галовы і плечы пасыплецца вогненны снег.

— Не трэба палохацца і вяртацца,— мы скажам адно аднаму,— Тое, што некалі вымкнула згубай, зноў паўтараецца з году ў год, але ўжо як свята. Згуба ўсё больш мінае, а свята ўсё больш настае...

І мы ацярушым з сябе іскрыны і попел і, перш чым скончыцца дзень, знаёмай даўняй дарогай увойдзем пад вечныя шаты, пакінутых некалі за сабою, хатаў і дрэў.

**ЦУД**

Рака разлілася і падплыла да самых падворкаў, і рыба, якая раней не хацела лаеіцца ні ў якія хітрыя сеткі, цяпер сама давалася ў рукі.

Нутром адчуваючы, што насампраўдзе так не павінна быць, што гэта нейкае ашуканства, людзі ў кашы, у мяшкі, у начоўкі паспешліва набіралі ахвотнай, быццам еп'янелай, рыбы, што не знаходзіла месца сабе ў вадзе.

І сам я, выпхнуты з чыстых глыбокіх віроў на паверхню, курчуся разам з астатнімі рыбінамі ў пахутах, усёй сваёй безгалосай істотаю крычучы: «Людзі, глядзіце, глядзіце, людзі, калі набліжаецца згуба, srna пасылае перад сабою цуд».

## ГОЛАС

Гукаю і чую свой голас.

Ён займае і гул ракі, і водгулле грамады, і цішу далёкага лесу.

І пакуль ён гучыць і, усюды прыняты і заахвочаны ўсюды, мае адвагу і моц гучаць, у гэтай краіне ён не чужы і не свой, а — сама, заснаваная мной, краіна.

# ВЕРШАСКАЗЫ

## ГОРАД

Горад горды і высакародны: ён стаіць на высокім месцы — на ўзгорку, на грудзе, і, адгароджваючыся ад навакольнага асяродка вежамі і сцяною, не адлучаецца ад яго, а вылучаецца з яго — як яго цэнтр, сярэдзіна, сарцавіна.

Ён — бесперапыннае пераўтварэнне дольняга ў «горнае», мінулага ў «градучае», ён - іхнія народзіны, і таму ўсе позіркі скіроўваюцца да яго, і таму ўсе дарогі сыходзяцца ў ім, і таму ўсім крывічам і радзімічам ён, нібы ўзнагарода, родны і дарагі.

Горад загартаваны ў горне розных нягод і прыгод, ён перагараджае ордэну і ардзе дарогу да валадарства, і калі на ўсё горла ворагі прадракаюць: «Гора — гораду!» і абрушваюць на яго град камянёў і стрэлаў, горад адказвае ім пагардай.

Да горада горнуцца вёскі, лясы, пасады, палі, агароды, і ён з'ядноўвае іх у радзіму, а разнаісную грамаду - смердаў, рамеснікаў, гандляроў - гуртуе ў народ.

І нават калі горад знішчаецца дашчэнту, згарае да гарадзішча, народ і радзіма становяцца тым радовішчам, з якога ён адраджаецца зноўку.

У горадзе валадарыць Рагвалод, горад радуецца Рагнедзе.

## ДУБ

З усіх дрэў дуб самы дужы, самы векавечны, самы даўні і самы будучы — ён увасабляе сабою трыяду часу: даўніну, цяперешчыну і будучыню і сваім існаваннем сцвярджае: быў, ёсць, буду.

Аб дубе бытуюць паданні, але сам ён не дбае аб тым, каб каму-небудзь падабацца: уся яго турбота, каб і ўлетку, і ўзімку быць сабою самім — дубам.

Усё, што робіцца з дуба, усё, што з яго будуецца, мае адменны характар: яно трывалае, яно добрае — яго не паточыць шашаль і ў ім не наробіць гнёздаў цвіль.

Дуб і падобны да ўсіх іншых дрэў, і адрозніваецца ад іх менавіта сваёй большай драўлянасцю, дрэвавасцю: ён дрэва ў дрэве кроці, у два разы, у «дубль».

Дуб — тутэйшае дрэва ведаў: на ім сядзіць вешчая птушка бусел, пад ім — сівы дзед: вясковы буда.

## ДЫМ

Безмаёмасны, бы манах-дамініканец, і багаты, бы цар Мідас, дым падымаецца ўгору і падымае з сабою, што ўзняцца само не можа: бадылле, ігліцу, галіны, а часам нават будынкі.

Але калі ў паднябессі ён адтуляе абдымкі, каб адняць ад сябе свой набытак, каб адмыцца і ачысціцца ад яго, ён адымаецца і сам: становіцца проста яснасцю, проста «невідзімнасцю», і паднябесое, як мытня, бесперашкодна прапускае яго ў свой эдэм.

Дым думае, і хоць на мадэль яго думання ўплываюць шмат якія ўмовы і абставіны: адкуль ён распачынае сваю вандроўку — з далі-ны, з гары, ці з выдмы, якія «модлы» — каінавы ці авелевы — нясе з сабою і каму прысвяча-ецца — дэману ці дэміургу, - найпершая, най-дамінантная ўмова — каб ён рухаўся, каб па-дымаўся, каб быў дынамічны, бо нерухомы — ён толькі сажа, толькі куродым, толькі туман.

Дзе дым, там дом, і калі агонь для дома — дыямент, дык дым — дыядэма.

Дым дамаўляецца і знаходзіць супольную мову з усімі стагоддзямі і гадамі і ўпадабняецца то матыльку, то гатычнай бажніцы, то пірамідзе, то дзьмухаўцу, то, урэшце, дамоклаву мячу, і па дыме, нібы па здымку, можна даўмецца, якія гэта стагоддзі і якія гады.

Дым не падманвае нас: ён — матыў, які вынаходзіцца намі самімі і ў якім ёсць мы, ты і вы...

**ДЗВЕРЫ**

Дзверы маюць дзве веры і вядуць у два бакі — у прыход і адыход, у прыйсце і выйсце. Яны робяцца з жывой матэрыі — з дрэва, здзерава, і адгукаюцца таму, хто стукаецца, ягоным жа стукам: асцярожным — на асцярожны, бадзёрым — на бадзёры, і разумеюць таго, хто ў іх стукаецца, па тым, як ён стукаецца, альбо, і гэта здараецца, шкрабецца.

Прапанова, але пераборлівая, забарона, але дзіравая, дзверы аддзяляюць унутраную прастору ад знадворнай, і той, хто ўваходзіць у дзверы, уваходзіць у новы стан і ў новае стано-вішча: з «нідзе» ў «дзе», з дня — у «добры дзень», з двара — у «дзяржаву».

Дзверы трымаюцца раўнавагі і сцвярджаюцца правілам: яны мусяць адчыняцца на адзін раз больш, чым зачыняюцца, і калі гэтае правіла парушаецца, то і раўнавага вярэдзіцца.

Падмазаныя — дзверы маўчаць, непадмазаныя — верашчаць, цвярозыя — разважаюць, нецвя-розыя — вярзуць лухту, разнасцежаныя — выс-цюжваюць хату, зачыненыя — берагуць яе дух, яе мары, яе вярозы.

Каля дзвярэй зераюць лапці-кавярзні ды аціраецца дзяркач.
Да дзвярэй нахіляецца калодзежны журавель — асвер, а вёдры напамяць ведаюць да іх дарогу. У дзверы дзярэцца сівер. І звер недаверліва спыняецца перад дзвярамі, вынюхваючы ў іхнім двувер'і ерась.

## ДАРОГА

Дарога — як рака: разгаліноўваецца на шматлі-кія прытокі — сцежкі і цячэ паўз двары, гарады, агароды, усё закранаючы сабою і ўсё пакідаючы па-за сабою. Адзінага, каго яна не можа пахінуць,— гэта чалавека: калі рухаецца ён — рухаецца і яна, калі спыняецца ён — спыняецца і яна. Ён — яе другое «я», яе спадарожнік і павадыр, які дырыгуе, як ёй ісці — таропка ці паволі, ідіха ці гучма.

Усё, што здараецца з дарогай, здараецца і з чалавекам, і ўсё, што ні здараецца з чалавекам, здараецца якраз у дарозе, бо сама прырода дарогі — здарацца, «здарагацца».
Але калі адрасы дарогі вядомыя — яны акрэслены на картах і схемах, то адрас чалавека невядомы; разам яны ідуць да небакраю, датуль, дзе неба злучаецца з зямлёю, далей у памяці дарогі чалавека няма, далей чалавек ідзе сам: адною сваёю прыродай у дол, другою — угору.

Дарога адгароджана ад наваколля сваім радаводам, сваёй роляй — яны ў яе выключныя: наваколле замыкаецца ў круг, у карагод, а дарога, наадварот, выключаецца з круга, расторгвае яго. Яна ў два канцы, у два рагі, і праторана своеасаблівым нарогам — людскою хадой.

Дарога — найдаражэйшая госця: яна нясе людзям навіны, нясе дары, нясе радасць і гора, трагедыю і жарт, гатовая, як торг, заўтра змяніць іх на процілеглае.

Дарога — палімпсест, тора чалавечай гісторыі: што на ёй выдрукоўваюць адны, сціраюць, выдрукоўваючы сваё, другія.

Але так пішацца жыццяпіс чалавецтва, і нават калі дарога зарастае драсёнам, дрыжнікам ці падарожнікам — першым сведчаннем пра чалавецтва ўсё роўна застаецца яна, дарога,— самы вялікі сугюльны чалавечы твор.

**ВОЎК**

Рускі в о л к — волат: ён волакам цягне Ваўкавыск у Валакаламск.

Літоўскі **v i l k a s** пільнуе Вільню і *viliasi* (мае спадзяванне), што будзе пільнаваць і Вілейку.

Сербалужыцкі w j e l k шукае на віках (на кірмашы) той век, які памятае, што ён вялікі.

Polski w i l k *wikła się* (ублытваецца) ў неймавер-ныя справы, але на Вігіллю (Куццю) выблытва-ецца.

Украінскі в о в к апрануты ў аўчынку, і калі на яго паказваюць пальцамі: «Во — воўк!», ён выдае сябе за авечку і кажа, што ніколі і краем вока не бачыў воўка.

Чэшскі **v l k**, як дзіцячая цацка ваўчок, круціцца ў валтузні вуліц **і** вулак; да ўсяго, што настала і мае яшчэ настаць, ён загадзя ўжо звыклы.

Старалацінскі v u l k u s жыве на вулкане.

Сербскі в у к ведае навуку: у яго вострае вуха і чалавечы глузд.

Праславянскі в ь л к ъ валхвуе.

Беларускі в о ў к вые.

**КАРАНІ**

Карані пакараныя: гэткая іхняя карма — рыць дол, урывацца ў цемру, быць катаржнікамі.

Але ніхто ніколі не чуў ад іх ні скаргі, ні наракання — яны крэўныя з самым вышэйшым, з сонечным пачаткам РА, і памятаюць вышэйшую праўду — праўду самаахвярнасці.

Карані кіруюцца да радовішчаў жыцця — да крыніц і, здабываючы з адмоўнага КА дадатнае РА, а са сваёй кары — карысць, кормяць ёю дрэва.

Для іх няма ні свайго ранку, ні свайго вечара: ранак для іх — калі дрэва цвіце, вечар — калі яно акрываецца асенняю скрухай.

Там, пад зямлёю, у сваёй краіне, яны каралі, яны карануюць дрэва кронай, яны багатыя будучай радасцю, але выцягнутыя на паверхню, ляжаць як пачварныя крывыя сутаргі — курчы.

Карані лёгка ранящца вонкавай — рассякальнаю — сілай, аднак, перакананыя, як Каран, яны не могуць скарыцца са смерцю і нерухомасцю, і нават калі дрэва гіне — з іх, з каранёў, усё роўна ўзыходзяць новыя крэўнічы — парасткі.

**БРУК**

Брук — дарожны друк, вухналі, загнаныя ў ходу дарогі, каб не расслізгваўся рух. У ім часткі намагаюцца перайсці ў адзінства, у ім хвіліны намагаюцца сабрацца ў час.

Брук выпаў з рук, выпаў пад ногі. Яго нораў і круглы, і круты: брук барухаецца з бязладдзем, але буркоча і на гладкапіс.

Па бруку грукае воз.

У возе морква, бручка і буракі.

**СКРЫНКА**

Калі яе адчыняюць, яна скардзіцца, яна скрыпае.

У ёй захоўваецца скрытае — скарб: ім яна поўная, ім змястоўная, ім ацэньваецца яе вартасць.

Усе думаюць, што яна скнара, што яна «рынак», але сама скрынка ведае, што яна скрыпка, у якой няма струн.

**ХЛЕБ**

Хлеб святы, хлеб вялебны, і ўсё, што спалучана з ім, што «зліплена» з ім, адбываецца як абрад, як набажэнства, як малебен.

Хлеб хвалебны: яго шануюць і хваляць усе плямёны — і дулебы, і вялеты, і лахвічы.

Хлеб лепшы: з усіх страў, з усіх наедкаў, у ім жыццё (ці на іншай мове — Leben). Ён есца, смокчацца, грызецца, «хлябаецца» і генетычна памятае свой радавод, сваю бацькаўшчыну — глебу.

На выгляд хлеб чорны, але па сваёй сутнасці белы.

**ПІЛА**

Ці гэта ліпень, ці лістапад, у пілы — пільніца, напружаная часіна: нібы навачасны Пілат, яна заўзята дапытваецца ў ліпы, піхты, яліны, клёна адказу на адно і тое ж пытанне: у чым ісціна? — і, намерваючыся любою цаною «даплыць» да ісціны, то плаўна, а то з запалам паглыбляецца ў іхнюю сарцавіну, у іхнюю «замкавіну», але ўсялякі раз плён яе допытаў — пыл, пілавінне.

У палоне сваёй заўзятасці, сваёй паляўнічасці піла засляпляецца: яна перапалавіньвае дрэвы наскрозь, разнімае іх на палены, і там, дзе яна спадзяецца набыць большую глыбіню, яна набывае большую плыткасць, што неўзабаве заканчваецца карою, якая ледзьве ліпіць, ды голай, пустой паверхняй, і там, дзе яна спадзяецца сустрэцца з ісцінай, яна сустракаецца з парадоксам, якога ніяк не можа засвоіць і які ўвесь час переражоўвае-перапіліквае ўголас: калі глыбей, то плытчэй, калі глыбей, то плытчэй...

Піла адмаўляецца ад якой бы там ні было платы: яна аскетычна-пляскатая, і што яна п'е, тое выплёўвае.

Пілатаж у пілы просты, пілігрымка аднастайная: наперад — назад, назад і наперад, аднак яны немінуча «ўліпаюць» у запамежную рэчаіснасць канцэнтрычных кругоў і капілярных трубак і дзейсняцца паводле законаў ірацыянальнай лічбы «Пі» — лічбы, якая не ведае завяршэння.

**КАЛОДА**

Калода няўклюдная, але гэтая няўклюднасць укладваецца ў яе, нібы яе код, і калі склюд, долата і сякера, намерваючыся надаць калодзе людскі выгляд, бяруцца згладжваць і злагоджваць яе няўклюднасць, калода «раскалоджваец-ца», пераўладкоўваецца ў нешта адрознае ад ся-бе — у кадаўб, а то і ў лодку.

Калода не памятае, адкуль яна і куды: яна ляжыць, уладзіўшыся ў калдобіне, якую сама сабе выбіла ў доле паводле сваёй вагі і свайго аб'ёму, і слухае, як яе бэсціць і лае кудлаты бадзяга-вецер: калода — лайдак, што адно толькі вылежвае бакі, калода — кладка, па якой ніколі ніхто не ходзіць, калода — клад, з якога няма чаго ўзяць,- і, быццам калоідам, поўніцца горкаю думкаю аб сабе.

Аднак над ёю кружацца пчолы, упрошваючы, каб яна згадзілася стаць для іх котлішчам, аднак да яе падступаецца глыбіня, даводзячы, што без калоды не можа быць і калодзежа, аднак яе абсядаюць кодлам, нібы яны калядуюць, грыбы-апенькі, і залацістагаловы певень у апошнія вокамгненні свайго жыцця, як да самай роднай істоты, прытуляецца да калоды.

**ЗБРОЯ**

Таго, хто бярэцца за зброю, зброя таксама забірае і абавязвае, каб ён укладаў у яе сваю змогу, сваё ўменне, свае жыццё.

Зброя пад забаронай: да яе нельга звяртацца, каб адплаціць за крыўду ці за абразу, нават калі свярбяць рукі, але калі да яе звяртаецца той, хто крыўдзіць і абражае,— яна найлепшая абарона.

І з аднаго, і з другога боку зброя з'ядноўвае ўсіх, як сяброў, як братоў, але паміж самімі гэтымі бакамі разворвае баразну барацьбы.

На зброі зазубрыны, аднак вызвоньзае ў ёй ста-радаўняе — «зубрынае» — высакародства брон-зы.

Зброя: на полі бою разбураны бор целаў, над полем бою абразовы рой душаў.

**ПЯЧОРА**

Пячора — як слімаковая ракаўка і чарапашы панцыр: у ёй туліцца жыццё, якое яшчэ не здольна быць сам-насам з вечнасцю і бязмежнасцю: яно мае патрэбу ў тым, што яго абмяжоўвала б, што яго ахоўвала б ад небяспечнай рэчаіснасці і такім чынам захоўвала для наступнасці,— у прасторы, якая была б яму ўпору.

Пячора — прарочыца: у яе чэраве назапашваюцца магчымасці, песціцца «чалавекасць», датворваецца чалавек, паўтараючы сабой прызначэнне і долю пячоры: як і яна, ён у рэшце рэшт вычэрпваецца і адпрэчваецца, становячыся проста чэрапам, у вачніцы якога будзе ўглядацца будучы Гамлет.

Сваёй пашчай пячора ўчаперваецца ў вонкавы асяродак — у пясчанік, а сваёй прарочасцю ў таго, хто перакрочвае тое, што чуюць вушы і бачаць вочы.

Месцазнаходжанне пячоры ва ўчора, у пазаўчора, а можа, нават у праўчора. У пячоры гарыць вогнішча: на ім нешта смажыцца, нешта пячэцца. Па яе сценах скачуць чараўнікі — чырвоныя водсветы і чорныя водцені, і самі яны спярэшчаны пячаткамі «чалавекасці» — почыркамі і рысамі.

Вакол пячоры шворацць і хто ведае што чворацць пачвары.
У пячоры спяць прашчуры.

## КАСА

Каса — косая, аднак там, дзе яна праходзіць, застаюцца чыстыя, без касмыкоў, касынкі лугоў і роўныя каснікі пакосаў.

Каса не спакушаецца славай і не выстаўляецца напаказ: яна толькі першаю, у расу, каштуе тыя «смакосы», якія пасля будуць каштаваць каровы і козы.

Каса касуе ўсё, што ўзводзілі вясна і лета: яе кранае не краса званцоў, касачоў ці каласоў-нікаў, а косінусы і катангенсы стасункаў з імі.

Пасада ў касы каставая — ад Касандры: яна прадказвае ўсім аднолькавы лёс і сама ж вершыць яго.

На касу, як на смерць, касавурацца гусакі, на касу сыкае асака, яе кусаюць камяні, ад яе адкасоўваюцца кусты, але, вітаючыся з ёю, касу ксціць касец Ясь і — развітваючыся з ёю — касінер Кастусь

**ЛЁД**

Вада ўтрымлівае ў сабе лёд як сваю іпастась, як сваю патаемную патэнцыю, як свой летаргічны сон і ўсялякі раз, калі «прыціскаюць» абставіны, пералітоўваецца ў яго.

Лёд літы, чысты, празрысты: дол, пад якім зімуе казка, літаграфія, якая памятае лета.

У лёд умарожваюцца човен і лодка, але сам лёд — замкнёны палёт па гарызанталі, лодка, якая злучае ўсе берагі і ў адну і тую ж хвіліну знаходзіцца ў любым пункце палетка возера ці ракі.

Лёд апякае, як ёд, але ў ім — мёд літасці, якою ахоўваецца ўсё жывое ад лёзаў марозу і лютасці холаду.

**МАЛАНКА І ГРОМ**

Каб аперазаць паўнеба, маланцы дастаткова вокамгнення, вокамíргнення: яна амаль бязмежная ў прасторы — такая вялікая і амаль бязмежная ў часе — такая малая.

Яна выкікае з хмарнай імглы і, рассвятляючы гэтую імглу, дасягае найярчэйшага напалу.

Яна ўсюды паспявае, усё спасцігае, і людзі ёй моляцца, як святой, і называюць яе чалавечым імем: Малання, аднак і сама яна — малітва, яскравая малітва прасторы, якая, як людзі, мае патрэбу ў споведзі, ачышчэнні і прасвятленні.

Маланка — ламанка: яна ломіць магутныя дрэ-вы і вымалёўвае трапятлівыя — «ліхаманкавыя» — узоры вышэйшай — электра**магнетычнай** — трыганаметрыі.

Маланка спакон вякоў маладая, яна вечная «му-за»: калі яна гаворыць, пануе нямая ціша, калі замаўкае, пачынае гаварыць «гармата» — гром.

Гром агромністы: ён «ахорвае» бязмоўнае і пашырае імгненнае, палохаючы старых і малых тым, чаго ўжо няма, што ўжо мінула.

Гром — гурма і гармідар; пакінуўшы свае харо-мы, ён гоніцца за маланкай, за ўсё чапляецца, усё зрушвае, усё пераварочвае дагары.

Маланка лёткая, гром груваcткі, маланка маляўнічая, гром красамоўны, маланка — змест, гром — форма, маланка — інтуіцыя, гром — логіка, маланка — мелас, гром —

рыторыка, маланка крэсліць граматы, адрасаваныя Садому і Гаморы, гром іх абвяшчае.

Маланка жне, гром малоціць, маланка — серп, гром — молат; яны такія розныя, такія непадобныя, але іх яднае гармонія.

## ГРОШЫ

Грошы шукаюць схавішчы, дзе б іх не бачылі лішнія вочы,— ці прыгаршчы, ці гаршчок, ці гарышча,— і аб сабе не гавораць уголас, а калі рашаюцца гаварыць, то — шэптам, шоргатам.

Адзін грош дробны, як гарошына, але калі іх многа — яны «гросы», і тады яны могуць і павучаць, і прарочыць.

Грошы ахрышчваюць грахі, але самі яны хрышчоныя сонцам — Хорсам.

Грошы вырошчваюцца з душаў рэчаў, але ўрошчваюцца ў чалавечыя душы: кім валодаюць яны — таго яны горшаць, хто валодае імі — таго яны ўхарошваюць.

**БЕРАГ**

Бераг суправаджае раку да самага мора, сочачы ўдзень і ўначы, каб яна не спынялася па дарозе, не збочвала, не забывалася пра мэту, аберагаючы яе самую ад яе памкненняў, ад яе нораву, ад яе пачуццяў, і разам з тым «па-стараверску» застаецца на аднойчы абраным баку, на аднойчы знойдзеным месцы, разважаючы пра асіметрычны закон Бэра, паводле якога рака заўсёды аддае перавагу аднаму берагу, і правяраючы гэты закон на сабе.

На беразе растуць бярозы і берасты. Над берагам лётаюць ластаўкі-беражанкі. Пры беразе бярложыцца Бярэсце: у ім берасцейцы п'юць брагу і пішуць берасцяныя граматы.
А ўздоўж берага, па рацэ, плывуць чаўны-дубы, чаўны-берасцянкі і бярвёны-плыты.

Рака хісткая, бераг устойлівы, рака — небяспека, бераг — абарона ад гэтай небяспекі, рака — бег, бераг — бог, і плыўцы, звярэджаныя стыхіяй, бяруцца аберуч грэбці да берага, і Берынгі, выпраўляючыся ў марскія і акіянскія падарожжы, сваім неабвешчаным гербам маюць яго — бераг.

**СЯКЕРА**

Сякера з сакрэтам: яна адначасова сталёвая і драўляная, кароткая і доўгая, крывая і простая, вострая і тупая, яскравая і цьмяная,— у ёй з'ядноўваюцца краі, супадаюць кроці, гавораць на адной мове карысць і кара.

Сякера мае справу з дрэвам; яна абцінае на ім сукі-раскірэкі, зганяе скуру-кару, падсочвае, рассякае. Ёй карціць знайсці ў дрзве скрытае, «sakrum», а знаходзіць яна адно толькі аскерыкі і аскроткі — трэскі-аскепкі.

Калі сякера ўвіхаецца, калі яна прыскорвае спор, тады яна акраса працы, і скруха не можа яе скарыць.

Сякера хаўрусуе з усімі прыладамі, дзякуючы якім «ўваскрасаюць» свірны, цабэркі, крэслы, скрынкі, куфэркі, але сярод іх яна — кесар.

**ПТАХ**

Раптоўны, нібы гром стрэлу (п-тах!), і поцемны, нібы згустак патухлага полымя, птах — выклік і нерухомай форме, і бясформнай рухомасці.

Ён прыляцеў са Старажытнага Егіпта, ад бога мастацтваў Пта — як яго пасланец, як яго патаемнае слова, як іпастась яго духу.

Птах — адмысловы хатха-ёг: яго цела паслухмянае любому подыху натхнення, ён дасканала валодае тэхнікай левітацыі, і зямное прыцягненне толькі дапамагае яму развіць закладзеныя ў ім «птахчымасці».

Птаха хапае і на зямлю, і на неба, і хоць хата для птаха — зямля, на ёй ён спутаны, на ёй ён «пехацінец», які мусіць думаць пра тое, каб напакаваць свой «хатуль» і каб займець свой катух.

Але, выпхнуты моцай палёту ў неба, ён набывае другое — ці, можа, першае — дыханне і, вольна ад хапатлівага клопату і ад высотнай пыхі, як роўны вітаецца з маладзіком і з ветахам, і зямля — вачамі сваіх шматлікіх «хацінцаў» — бачыць у ім і плаху, узнятую высока, і высока ўзняты свой дах.

**ПЧАЛА**

Пчала нікога не чапае сама, але калі нехта чапае яе альбо той церам, у якім жытлуе яе радзіна, яна не шкадуе жыцця, караючы — і лечачы ад сваволі — крыўдзіцеля, апякаючы яго сваім роспачным пацалункам.

Пчала — чалядніца працы, і на чале летняга дня, ведучы яго за сабою, яна вылятае ў поле, у луг, у сад, цешачы іх сваім прылётам, тым, што пачаўся дзень і што яна, пчала, пачала паломнічаць.

Увесь дзень пчала зносіць у вулей, у яго каморы, падпечкі і ночвы, праз яго чалеснікі і атворы тое, што яна возьме ў поля, у луга, у саду,— узятак, і тое, што яны ёй дадуць,— уздатак, адводзячы адпачынку ноч.

Пчалу нельга забіваць: яна — пЧАЛа, у ёй захоў-ваецца чалавечы пачатак, і людзі шануюць яе, як чалавека.

Пчала мае справу з самымі прыгожымі, з самымі чулымі, з самымі духмянымі стварэннямі — кветкамі, але ў глыбіні яе існавання тоіцца плач.

**БАРАНА**

Барана — з бору: забраная адтуль, яна ўсё роўна не згаджаецца са сваёй абранай роляй і абараняецца рукамі і нагамі ад прымусовага абраннiцтва.

Зацята, «па-барановаму», барана ўпарціцца руху: яе валакуць, пераадольваючы яе натуру, яе супраціўленне, але якраз дзякуючы гэтай упартасці і гэтаму супраціўленню робіцца работа.

Барана драпае, раніць, скародзіць, вярэдзіць, бурыць поле і такім чынам бароніць яго ад няўроду.

Усякае поле для бараны — поле барацьбы, поле «брані».

**ПЕВЕНЬ**

Сербскі п е т а о, тупаючы нагамі і лапочучы крыллем, нібы ён намерваецца ўзляцець, можа, пяты, можа, пяцьдзесят пяты раз, апантана пытае-дапытваецца, ці ёсць дзе-небудзь той супернік, што здольны спаборнічаць з ім, і сваім апантаным пытаннем-дапытваннем пераконвае ўсіх — і перш-наперш самога сябе,— што няма.

Балгарскі п е т е л «пытляваны» — выпрабаваны: ён называецца Петар і дае пытлю ўсім іншым пеўням у наваколлі, якія «ўляпетваюць» ад яго, як ад гарачай патэльні.

Славенскі p e t e l i n, як дырыжабль-цэпелін, вылеплен з несціпатольнай прагі палёту; застаючыся целам на лінялым палетку зямлі, ён «ліецца» душою ў ільняны палетак нябёсаў.

Украінскі п і в е н ь, сп'янелы ад акавітай кроплі вады і перапоўнены спеўным натхненнем, аб'яўляе на ўвесь белы свет, што наступіла вясна.

Беларускі п е в е н ь пнецца на пень, упэўнены, што без пня ён не лепшы за пыльны венік, а на пні — лепшы за вабную паву.

Рускі п е т у х хуткі на рух: ён тушыць полымя ўсходу і, калі ўсход патухае, ганарыцца, што гэта яго заслуга; ён ходзіць пехатою, але пастаянна памятае, што ён — птах, што ён — дух.

Царкоўнаславянскі п ѣ т е л ь — вястун святла:

з лета ў лета ўносіць ён лепту за лептай у перамогу багаслаўлёнай сілы, перакульваючы сваім спевам платы патаемных поцемных клятваў і распутваючы петлі адпетых замоў.

**ЛЕС**

У лесе ўсё пазрасталася і паспляталася: лісце, галіны, камлі, карэнне, зямныя лёхі,— ледзь закранецца нешта адно, адгукнецца другое.

Лес пачынаецца адразу за аселіцай, за сялом, за сялібай, і насяляюць яго істоты, якія не ўмеюць жыць у сялібе — мядзведзі, ваўкі, лісы, ласі, лесуны.

Калісьці ў лесе жылі і людзі, але, палюбіўшы бяспеку болей, чым небяспеку, пляскатае болей, чым звілістае і галінастае, адасобіліся ад яго: між імі і лесам — адлегласць, і гэтая адлегласць не дазваляе, каб лес увайшоў у сялібу; калі ж усё-такі ён уваходзіць альбо ўязджае ў яе на калёсах, дык як паляўнічы здабытак, як балясіны і як бёрны, якія карнаюцца па людской мерцы лёзамі піл і сякераў і з якіх вы-будоўваецца яна сама.

Сяліба — дом: у ёй усё відавочна і ўсё вядома, лес — лёс: у ім усё хістка і пакручаста, і, каб аднойчы сустрэцца з лёсам і даведацца пра саміх сябе нешта такое, што здзівіць і ўразіць іх саміх, людзі блукаюць па сцежках, якія ім сцеле пад ногі лес, і лезуць у глухамань, у сляпыя нетры, бо — на якой бы прыступцы жыццёвае лесвіцы ні давялося стаяць чалавеку — знадворку заўсёды ён гэтакі, як сяліба, а знутры гэтакі, як лес.

Летапіс і летапісец — лес памятае, што было летась, і пазалетась, і безліч гадоў таму назад: якая часіна была ласкавейшая, якая слязлівейшая і якая балеснейшая, ён памятае нават тое, што будзе пасля, бо ад таго, які ён сягоння — знясілены ці ў сіле, у пялёстках ці ў плесні,— залежыць наступнасць.

Над лесам бліскаюць ясныя бліскавіцы, над лесам ляскаюць бязлітасныя перуны.

## СВЕЧКА

Свечка асвятляе чалавечы твар і сведчыць пра чалавека; гледзячы на яе, чалавек пазнае ў ёй сябе: ён таксама, як і яна, запалены, ён таксама, як і яна, нявечны, ён таксама, як і яна, аднойчы згарыць альбо знячэўку пагасне,— і няма ў яго іншага выйсця, апроч таго выйсця, якое наказвае свечка: ператвараць воск плоці ў агонь духу.

Адна свечка — адзін чалавек, шмат свечак — веча, і ўсе тыя людзі, якіх засланіла ад свету века труны, уцелясняюцца ў свечках, запаленых у імя іхняй памяці, і нанава пражываюць скарочаны курс жыцця.

Свечка лепіцца з «часу» — з пчалінага воску ці авечага лою, але асвячаецца вечнасцю.

Натура свечкі — самаахвярнасць: яна «нявечыцца» дзеля бліжніх, нічога не пакідаючы сабе, і таму ёй, як чароўнаю кветкай, вянчаецца рэчаіснасць, і таму на вячэры, якую найменоўваюць тайнай вячэрай, між іншых апосталаў прысутнічала і яна — нераспазнаны, тайны апостал, прысвечаны ў таямніцу святла.

**ДОЖДЖ**

Дождж даўгаждданы, доўгажаданы. Ён «доіцца» з неба і дагаджае атожылкам руні, дрэвам, усёй зямлі — ён іхні заўсёдны добраахвотны даўжнік.

Дождж прыходзіць як боскі адказ на стара-славянскую — старасялянскую — малітву: «Хлеб наш насущный даждь нам днесь».

Дождж добры, дождж дужы, калі ён у меру, у дозу, у «досыць» і калі ў пару — у сяўбу, а не ў жніво і ў дажынкі.

Дождж падарожнічае ўдоўжкі і ўшыркі, без сцежак і без дарог, і там, дзе ён пабывае, жыццё адраджаецца нават з прысаку, нават з жуды.

## ГЛІНА

Гліна — «мгліна»: яна спіць у імглістай глыбіні і сніць свае запаветныя «маглівасці».

Для каменя гліна — адліга, для вады — «льга», але чаго нельга зрабіць з каменю ці з вады, льга з гліны.

Гліна гнуткая, як галіна, і лінія яе паводзін супадае з лініяй паводзін надвор'я: загаспадарыць спёка — і гліна спякаецца, нібы крыца, ліне дождж — і гліна «ліняе» і ліпне да ботаў, да пахлапнёў, да галёшаў, якімі, як лінатыпамі, вандроўнікі выдрукоўваюць свой «глінапіс».

Гліна — галетніца: у ёй няма нічога лішняга, і гніль не здольная да яе падступіцца, і голад не здольны яе праглынуць.

Чалавек вырабляе з гліны ўсялякія рэчы: кафлю, цагліны, глякі,— але і сам ён з гліны, і да канца сваіх дзён ён лепіць з сябе такі твор, які адпавядае яго ўяўленням, задумам і ўчынкам: нягеглы і глёўкі — калі яны глёўкія і нягеглыя, «гімалайны» і «галілейны» — калі гэтакія яны.

З гліны ўсё паўстае, і ў гліну ўсё гіне.

Гліна — нігіль, нішто, але ў боскіх руках яна становіцца геніяльнай.

**ГРЫБ**

Дзе грыб, там любы краявід набывае асаблівую прывабнасць, і сярод многіх хваін і бярэзін грыбнікі абіраюць для пакланення якраз тую бярэзіну і тую хваіну, пад якою бачыцца грыб — самы праўдзівы і ганаровы герб любога гербарыю.

Нібы хатка Бабы Ягі, грыб стаіць на адной назе, акрыўшыся рабою страхою-магеркаю, і, як гібрыд, спалучае ў сабе стромкае і круглае, пляскатае і пукатае.

Хоць грыбовы век нетрывалы, але ў бары і ў лесе ён гэтакі самы абарыген, як стогадовыя дрэвы.

Грыб — горб, што ўзнікае як рывок «паграбовай», спадсподняй напругі ў невядомае вымярэнне, насустрач дажджу і небу; вузел, што звязвае раз'яднаныя рухі прыроды ў адно.

Грыб чуйны і далікатны, як рыбіна, і калі штонебудзь з надвор'ем нетак, ён гэтаксама, як рыбіна, выкінутая на бераг, гіне і прападае.

Грыб усім падабаецца, ім не грэбуе ні славянін, ні габрай, ні селянін, ні бюргер.

**ВЕК**

Век спалучаны з усімі істотамі, але найшчыльней — з чалавекам.
Ён выяўляецца — і чытаецца — у яго твары і постаці, і калі па якой-небудзь прычыне век парушаецца, то н я в е ч ы ц ц а і чалавек.

Век не аднолькавы са стагоддзем: ён утрымлівае ў сабе сваю меру, якая вымяраецца не проста часам, а самой непаўторнасцю часу,— і свой вектар, які скіроўваецца з пачатку ў канец, з маладзіка ў ветах, з раніцы ў вечар, з жыцця, якое падуладна зменам, у жыццё, якое зменам не падуладна,— у вечнасць.

Калі гарыць свечка, яна гарыць век, калі расце дрэва, яно расце век, калі жыве чалавек, ён жыве век, і які б гэты век ні быў — кароткі ці доўгі, роўны ці пакручасты,— ён усё роўна вялікі.

**ДЗІДА**

Дзіда паслухмяная, як дзіця, якое, калі яму кажуць: «Ідзі!..», ідзе датуль і дагэтуль, дакуль яму кажуць, і разам з тым дасведчаная, як стары дзед.

Нібы жардзіна рухомага плота, дзіда дзяжурыць то на дзядзінцы, то ў дзікім полі, загароджваючы дарогу непажаданым гасцям.

У падзеях, дзе вырашаецца лёс дзяржавы, дзіда бярэ самы чынны ўдзел, здзяйсняючы подзвігі, здабываючы дружыне славу, а сабе падзяку, і робячы дзіравымі доказы супярэчнікаў.

Але настае гадзіна — і дзіда ўбіваецца ўдзірван, каб зрабіцца пярэдаднем і прадвобразам таго дрэва, пад якім знойдуць паразуменне ўсе людзі.

**ГУЗІК**

Гузік спрытна ўлазіць у шчыліну-пятлічку, але назад вылезці не можа, застаючыся вязнем свайго спрыту, сваёй зухаватасці.

Гузік не гуз, але мае з гузам блізкае падабенства, не туз, але гэтаксама, як туз, знаходзіцца на адказным месцы: ім звязваецца ў адно цэлае левае і правае, ніз і верх, на ім трымаецца ўсё адзенне.

Гузік — глузд, гузік — розум, ён нейтралізуе сабою памкненні да раз'яднання і бярэ на сябе найбольшую — «тузінную» — нагрузку: яго круцяць, тармосяць, тузгаюць, і толькі тады, калі гузік знікае (адшпільваецца ці вырываецца), кашуля (ці блузка, ці камізэлька, ці кажушок) расхістваецца, распадаецца напалам.

У музыцы адзення гузік усяго адзін гук, але гук ключавы, гук мужны.

## ПАВУЦІНА

Павуціна як ціна: хто ў яе трапіць, таго яна аблытвае і палоніць.

Нібы кароль у сваёй дзяржаве, у павуціне пануе павук: ён пляце павуціну, выцягваючы яе з самога сябе, і развешвае ўсюды, куды не сягае рух, дзе зацішна — ці ў клеці, ці пад павеццю, ці ў куце хаціны.

Колькі б разоў ні рвалася павуціна, столькі разоў павук яе аднаўляе, даючы прыклад і павучанне ўсім ваярам, усім працаўнікам.

У павуціне заканчваюцца многія пуцявіны, яна для іх вусце, а мо і мора, і як бы ні прасіліся ў павуціны мухі, мошкі ці камары: «Пусці!..» — павуціна трымціць і хістаецца, але не пускае.

Павуціна падобная на ядваб, падобная на кілім, але калі ядваб і кілім маюць сваю цану, то павуціна яе не мае, яна — цень ядвабу, цень кіліму, і таму яна захоўвае ў сабе тую лёгкасць і тую бязважкасць, дзякуючы якім, калі настае бабіна лета, яна ляціць.

**БЯДА І ГОРА**

Бяда аб'яўляецца спадсподу, як прарастае спадсподу трава-лебяда, гора абрушваецца згары.

Бяда — яда: яна есць чалавека, гора — піта: яно п'е чалавека, бяда салёная, гора горкае, бяда — яд, гора — атрута.

Бяда прыходзіць знянацку, гора — раптоўна, бяда — выпадак, гора — здарэнне, бяда — Сцыла, гора — Харыбда; яны спадарожнікі чалавечага лёсу, і не ведае чалавек, дзе іх чакаць, куды ад іх дзецца.

Бяда баліць, гора гняце, бяда галосіць, гора наракае, у бяды ўсё падае з рук, у гора ўсё згортваецца.

Бяда бледная, гора чорнае, бяда — пятля, гора — горан, бяда — вужака, гора — груган, гора гародзіць між светам і чалавекам платы, бяда выбудоўвае сцены.

Але ўсё на свеце мінае: і сплывае бяда, бы вада, і згарае, нібы агонь, гора.

**ВЕРАС**

У верасні, калі дацвітаюць апошнія кветкі, на лясных пагорках, выжарынах, расцяробах, усцілаючы дол каляровым ворсам, красуе верас.

Сярод астатніх распазнаных раслін верас нібы версэт сярод вершаў: у параўнанні з дрэвамі ён — трава, у параўнанні з травою — дрэва, і ў параўнанні з іхнімі «веравызнаннямі» яго «веравызнанне» — ерась.

Мінаючы распадзелы на вялікае і малое, на моцнае і слабое, верас расце як варыянт, як версія на тэму: якой мусіць быць расліна, аднак у гэтую версію верас укладаецца ўвесь.

**КАРОНА**

Нібы кронай — дрэва, каронай вянчаецца найпершая асоба ў краіне — кароль, і сама краіна.

Усе падкопы, падшэпты, падсокі, падкрокі, скіроўваючыся на караля, маюць на мэце карону, і калі карона спадае-ўроньваецца са скроняў караля, гэтая «рона» крывавая рана для караля, а часам і для краіны.

Як сваімі вяршынямі горы, карона сваімі ўкорневаецца ў нябёсы: у ей канцэнтруецца скарб, які не купляецца і не прадаецца на рынках, а даецца як дар абранасці.

Карона валодае поўнай — неабкар- нанай — уладай, яна сама сабе кворум, таму для таго, хто выступае ёй наперакор, яна кара, а для таго, хто ей пакорлівы,— маці-карміцелька.

З каронай перамаўляюцца сузор'і Кароны і Арыёна.

**КАЖУХ**

Кажух «скажоны»: зверху — гладкі, знутры — кашлаты, зверху — бедны, знутры — заможны, зверху — «кожа», знутры — кужаль.

Усё лета кажух журботна вісіць у катуху і мае журботны колер, блізкі да колеру жухлай травы і пажоўклай лістоты, але тады, калі трава і лістота знікаюць, кажух кажа, што настаў яго час; і як бы ні намагаліся зухаватыя маразы заказытаць жывы дух, кажух іх адпужвае.

Кожны жук і кожны кажан жадалі б мець свой кажух.

Кажух — клажа, аднак з ёю лёгка.

**ЛЕЙЦЫ**

Лейцы, «прыклейваючыся» сваімі канцамі да аброці, ліюцца адной ляйчынай у другую, а па іх, у сваю чаргу, ліецца «лекцыя», якую фурман чытае каню.

Сярод цяжкай і мулкай вупражы лейцы — малойцы, і фурманцы — ці ледзьве яна варушыцца, ці ляціць улегцы,— як батлейцы без лекара і Мацея, не абысціся без лейцаў.

Лейцы — як рэйкі ў вузкакалейцы; і пакуль яны цэлыя, рух не адхіліцца, не скамечыцца, не скалечыцца, не заледзянее да лета.

**МЕСЯЦ**

Украінскі м і с я ц ь, быццам велічэзная міса, вісіць над местам: мешчанчукі цямяць, што гэта — поўня, і, што гэта талерка, нераспазнаны лятаючы аб'ект,— містыкі.

Польскі m i e s i ą c — місіянер: усім дням, сумешчаным у месяц, ён нясе сваё веравызнанне.

Чэшскі m ě s i c, нібы люстэрка, звяртае ўвагу ўсіх на саміх сябе (мяне на мяне асабіста): мне — s i c !

Літоўскі m é n u o ў мастацтве зменаў дасягнуў дасканаласці, і любое мастацтва, ці, па-літоўску, *menas,* мае ў ім свайго ментара.

Беларускі м е с я ц перамяшчаецца па нябесным скляпенні, шукаючы на ім сваё ўстойлівае, сваё пастаяннае месца.

Праславянскі m e s ę c ь памятае — але нікому не паведамляе — пра сэнс свайго існавання.

Старажытнаіндыйскі m ā s a s масіўны, ён займае ўсё паднябессе, як маска, затуляючы ўсё сабою: сам — зоркі, сам — сонца, але і самота — таксама сам.

## КІШЭНЯ

Калі чалавеку шанцуе, гэта ў першую чаргу заўважае кішэня, і калі не шанцуе — гэтаксама «адценьваецца» на кішэні.

Кішэня нібы кірмаш: што яна мае, з яе дастаецца, і чаго не мае, у яе кладзецца.

Іншыя — шляхетнейшыя — часткі адзення кпяць і шэмраюць, што кішэня — ненаедная кішка, што кішэня — шэльма, аднак кішэня «адкышвае» гэтыя «кепшыкі».

Кішэня спрактыкаваная, кішэня спакушаная, і ўсе каштоўнасці, ці гэта шэлег, ці дукат, селяцца — шчэмяцца — менавіта ў ёй.

## ГОЛАД І ХОЛАД

Голад глытае ўсе наедкі, якія гадаваў год, холад захутваецца ва ўсе халаміды, якія назапашвала хата.

Холад — дрыготка, голад — сутарга, холад — душахват, голад — жываглот, холад тоіцца ў лёхах, голад — у логаве, голад — ляда, холад — лёд.

Голад глядзіць у дол, холад — у неба, голад гавее, холад вее, голад гандлюе, холад катуе, голад — злыдзень, холад — ліхадзей, голад — даўгун, холад — хапун, голад дужаецца, холад ходаецца, холад — волат, голад — асілак, холад адольвае знадворку, голад — знутры.

Холад адхуквае ўспаміны, голад «адгуквае» згадкі, голад — павадыр, холад — хадыр, голад уздыхае, холад хліпае, голад марыць пра «гладкі» лад, які заўсёды частаваў бы аладкамі, холад — пра дыхтоўны дах, голад — пра галаўня, холад — пра галавешку, голад — пра Gold (золата), холад — пра Holz (дровы).

Голад галіцца, холад хоча, холад голы, як гала, голад худы, як іголка, голад намагаецца знайсці ў наваколлі згоду, холад — пагоду, яны ходзяць удвух, і невядома, хто з іх большы, хто з іх галоўнейшы, але, кленучы голад, што ён гад, а холад — што ён кат, нібы пракаветным ідалам, абодвум ім дагаджае і абодвух іх улагоджвае ўсё свае жыццё люд.

## СТРАЛА

Майстар палёту, страла старанна, бы рала, разворвае аблог прасторы, не пакідаючы за сабой ніякіх адзнак і прыкмецін.

Яна ляціць са старажытнасці ў наступнасць, і ў кожным прамежку прасторы са старой ператвараецца ў новую, і ў кожным прамежку прасторы сустракаецца з парадоксам, які сцвярджае, што яна не ляціць, а стаіць нерухома на месцы.

Страла, як час, «струменіцца» ў адзін бок, у адну старану, насустрач той мэце, для якой яна — стрэмка, для якой яна — «страданне», для якой яна — страта, але з якой яе лучыць патаемная роднасць.

Страла вострая, як страсць, і той, у каго яна трапляе, выпадае са стромы звыклых радасцяў, страхаў, намераў, але таму, хто моцна трымае яе на напятай цеціве ў сваіх руках, яна, як астранаўт, адкрывае стромкае неба.

**ЛІШТВА**

У хаты — акно, у акна — ліштва: лішак, што надае хаце свой адмысловы кшталт, сваё непаўторнае аблічча.

Ліштва — клішэ, у якім узоры лістоты і кветак злітаваны з чалавечым векам, і таму калі з лётам і бегам дзён лістота і кветкі ўсё больш становяцца леташнімі і колішнімі, то ліштва — усё больш векавечнай.

Ліштву шануюць і ў Літве, і ў Падляшшы, і на Палессі, і калі ліхія часы пазбаўляюць *(лишают)* хату ліштвы, вытлумачваючы гэта тым, што ліштва толькі *(лишь)* штучная і безгустоўная аздоба, то хата як бы перамяшчаецца са свайго лета ў восень, а то і ў зіму.

Ліштва не стандарт, а штандар, ушаляваны ў саму літару рэчаіснасці: яна вабіць вока і лашчыць думку.

**ВЯСЛО**

Нібы перавяслам, вяслом апяразваецца постаць і Ясельды, і Віслы, і Свіслачы.

Бясконцае мноства разоў вясло спрабуе ўсяліцца ў падводную святліцу і гэтулькі ж разоў высяляецца адтуль: яно — пасол чаўна і чуйна слухаецца яго загадаў.

Каб слаўна плылося чаўну, мусіць быць слаўным вясло: не ломкім, нібы салома, а трывалым і абавязковым, як слова.

У пахмурлівы дзень з-пад вясла выпырскваецца слата, у ясны — выблісквае вясёлка.

## БУДЗЕНЬ І СВЯТА

Будзень будзіць людзей, нагадваючы ім пра тое, што пачынаецца дзень і што нікуды не дзенешся ад клопатаў і работы; свята чакае, калі чалавек сам абудзіцца, і калі ён абуджаецца, ветліва вітае яго.

Будзень — удзельнік, свята — сведка, будзень — маладзік, свята — ветах, будзень — дзейнік, свята — выказнік, будзень абяцае: усё, што трэба, збудзецца, свята вясткуе: усё, што трэба, збылося.

Будзень — падзея, свята — з'ява, будзень — агледзіны, свята — сватанне, будзень распачынае, свята вянчае, будзень — жаніх, свята — нявеста, будзень — «нудзень», свята — вяселле.

Будзень — зіма, свята — вясна, будзень — студзень, свята — май, будзень дбае, свята мае, будзень — яда, свята — піта, будзень рупіцца ў пыле і брудзе, свята аздоблена ў саеты

Будзень ідзе, свята стаіць, будзень дзеліць, свята яднае, будзень бачыць гадзіны, свята — вечнасць, будзень судзіць, свята апраўдвае, на будзень дзівяцца людзі, на свята — свет.

**ГОСЦЬ**

Рускі г о с т ь вядзе з сабой Ost і, калі прыводзіць, кажа, што ён тут не госць, а гаспадар.

Украінскі г і с т ь апавядае прыгоды-гісторыі — то па-блазенску дасціпныя, то па-магістарску грунтоўныя.

Нямецкі G a s t кіруецца напрасткі — праз гаць і пагост.

Польскі g o ś ć востры, як восці, але калі ён, запрошаны за стол, есць і п'е — ён ягамосць.

Беларускі г о с ц ь ідзе дарогай — гасцінцам і нясе з сабой падарунак — гасцінец.

**СЦЕЖКА**

Сцежка выводзіць чалавека з абжытага і звыклага асяродку і вядзе ў незнаёмы свет, і як бы ні мучыла і ні засмучала расстанне, яна суцяшае.

Сцежка сама ведае, як ёй ісці, як ёй весціся, яна хісткая і гнуткая і сцелецца пад ногі, быццам нітка чароўнага клубка.

Сцежка засцерагае ад прасталінейных учынкаў: з яе лёгка збіцца і цяжка ўзбіцца зноў.

Ці спёка, ці сцюжа, сцежка разнасцежвае прастору і цягнецца датуль, дакуль здольны дацягвацца чалавечыя памкненні: яна ўсцяж прашывае сабою абсягі жыцця, і тыя сцягі, якія яно ўздымае, заўсёды маюць сваім правобразам сцежку.

**НАРА**

У кожнай нары свае жыхары: мышы, краты, барсукі, і, у залежнасці ад таго, хто яны, гэтыя жыхары, кожная нара мае свой асаблівы нораў і свой асаблівы гонар.

Нара вынырвае з долу і па непрыкметных сцежках разбягаецца па паверхні, каб потым, узбагаціўшыся наробкамі, нарыхтоўкамі, назіраннем, зноўку нырнуць у дол.

Няма такого асяродку, які б не меў патрэбы ў нары, і нара нараджаецца як унутраны орган гэтага асяродку: яна ўсё хоча бачыць, ведаць і чуць, але не хоча, каб чулі, бачылі, ведалі яе.

Ці на дварэ бушуе бура, ці свеціць сонца, у нары адна і тая ж пара, у нары панура і ціха.

Хто ігнаруе нару, хто не бярэ яе пад увагу, незнарок нарываецца на страту і паразу, але хто разумее, што кожная з'ява, апроч відавочнай паверхні, мае невідавочную глыбіню, атрымлівае ад нары параду.

**КІЙ**

Як рука працяг цела, гэтак і кій працяг рукі. Ён адзін з тых трох «кітоў», на якія абапіраецца чалавек, калі настае вечар яго жыцця.

Кій — кіраўнік, і які б ён ні быў па сваёй «кіякасці» — цяжкі ці лёгкі, стрункі ці камлюкаваты, ён ідзе наперадзе і паказвае вандроўніку кірунак, як і кудою яму ісці — ці ў абход, ці напрасткі.

Дакладны, нібы «кібер», кій ідзе, ківаючыся, і гэтым самым адлегласць, якая праходзіцца кіем, становіцца ўлічанай: адзінка гэтага ўліку — адзін кіў.

Калі кій сустракаецца з упартаю і нерухомаю перашкодай, ён яе абыходзіць, калі з упартаю і жывою — замахваецца ці кідаецца на яе.

Але адхінуўшыся ад крыніцы сваёй рухомасці, сваёй кінетычнасці, кій апынаецца пакінутым, і тады сабакі і гусакі могуць нарэшце паздзекавацца з яго, могуць нарэшце сквітацца з ім.

Як бы павольна кій ні клыпаў, ён усё роўна некалі давядзе — калі не ў скіт, то на кірмаш, калі не да Кіева, то да Вільні, калі не да Вільні то да Іўя альбо Вілейкі.

## КАМОРА

Усё спажыўнае ў гаспадарцы сцякаецца, нібы ў мора, у камору, і яна ўсіх корміць.

Камора для гаспадаркі — крама: у ёй стаяць бочкі і карабы, а пад бэлькай вісіць скаромнае — кумпякі і кілбасы.

Камора не лекар, але часам не горш за лекара вылечвае і ад хворасці, і ад зморы.

У каморы пануе заўсёдны морак: і ў спёку, і ў вецер, і ў макратэчу ў ёй, бы ў скрыёмных харомах, утульна.

Калі ў каморы маркота, хату даймаюць клопаты, грызе згрызота, марнуе Марока, калі ў каморы дастатак — і хата ў гуморы.

**ЗІМА**

Беларуская з і м а — зямля, усланая небам.

Літоўская ž i e m a «жме»: яе дужасць добра адчувае і аўкштайт, і жэмайт.

Руская з *и* м а не толькі з'ява прыроды, але і грамадскае мерапрыемства — вялікі агітацыйны «ізм».

Сербская з і м а непрадказальная, нібы *змај* (змей).

Польская z i m a вывярае свой, знаны адной ёй, азімут.

Сербскалужыцкая z y m a прадзімаецца скразнякамі.

Палабская z a i m a займае сабою ўсю прастору і ўвесь час, становячыся займеннікам-заменнікам таго, што было калісьці і чаго ўжо няма.

Старажытнапруская s e m o самааддана захоў-вае семя — для невядомай вясны, для невядо-май сяўбы.

Старажытнаіндыйская h i m a мае сваёю сядзі-баю Гімалаі.

## ГРАБЛІ

З чаго б ні рабіліся граблі — з клёну, з ясеню альбо з грабу, яны габлююцца і шліфуюцца і, губляючы сваё першапачатковае — «рабое» — аблічча, набываюць бляск «адукаванасці».

Граблі не грэбуюць ніякай работай: тое, што расцярушылася, яны зганяюць у кучу, тое, што зблыталася ў закарузлыя звязы, разрабоўваюць на камякі, а тое, што блізка, падсоўваюць яшчэ бліжэй.

Пальцы ў грабляў нязграбы, і самі яны худыя — адно хрыбет і рэбры, аднак дзякуючы гэтай сваёй нязграбнасці, гэтай сваёй хударлявасці, граблі зграбна ўвіхаюцца на двары, на лузе, у агародзе і храбра ўграбаюцца ў бруд і ў гной.

Граблі абагаўляюцца гурбамі курэй і вераб'еў, і пеўні таксама калі-нікалі схіляюць перад імі свае ганарлівыя грабяні.

**СНОП**

Калі зжынаецца на полі спелая збажына, ззаду, на пожні, нібы слупы, паўстаюць снапы — апосталы жніва.

Нібы да постаці пояс, да снапа дапасоўваецца перавясла, і тыя збажыніны-сцяблінны, што паасобку калыхаліся пад ветрам, цяпер ушчымлены ў цесны натоўп.

Сноп «зноўны»: у ім сто, а можа, тысячу разоў паўтараецца адзін і той жа матыў, адна і тая ж песня, але ад гэтага яна не становіцца «сапсаванай».

Сноп «посны», але не худы, сноп поўны, але не спанелы, і самотнае поле ўспамінае сноп як свой самы лепшы — свой самы залаты — сон.

## САНІ

Прытуліўшыся да сцяны вазоўні, сані спяць і вясною, і летам, і восенню і сняць тую пару, калі ўсё наваколле засцелецца снегам, калі настане «санчас».

Тады ім адчыняюцца дзверы ў шырокі свет, тады яны маюць пашану, тады аднаўляецца іхняе існаванне, тады яны вяртаюцца ў свой «санавіты» стан і пішуць на белай аснове свае няўрымслівыя высновы.

З узнёсла выгнутымі насамі сані нясуцца ў белы абсяг, і хто ведае, ці іх за сабой цягнуць коні, ці яны самі прыспешваюць іх.

Сані наскія, ім знаёмыя ўсе мясціны: і дзе ў лесе стаіць дрыўняк, і дзе на балоце — сена.

Нагружаныя, сані насілу, сантыметр за сантыметрам, сунуцца ў двор, і нішто астатняе ў гэты час іх не займае, але вольныя — імкліва і лёгка ўлятаюць у санет і санату.

**ПЛЯМА**

Пляма, як запаленая лямпа, аб'яўляецца сваім колерам, формай, абсягам. На яе ўсе звяртаюць увагу, аб ёй плямкаюць і плявузгаюць і паказваюць на яе пальцамі, і тое поле, якое аблямоўвае яе, саромеецца яе, як сваёй заганы.

Пляма пляскатая, але калі хто спрабуе пазбавіцца ад яе гвалтам, не ўлічваючы яе глыбокіх асаблівасцяў, пляма ператвараецца ў яму, якая не мае ні дна, ні паверхні.

Нібы аплявуха, пляма ўлепліваецца ў аблічча прадметаў, даводзячы ім, што яны не такія ўжо і нявінныя, і, нібы лямант, апелюе да тых, хто чуе, што на самой справе звыклая ўсім рэчаіснасць не лемантар, дзе ўсё вядома і проста, а праблема, якая вымагае вырашэння.

**КУПІНА**

Купіна выпукваецца з балота, нібы купал патанулай бажніцы.

Сярод аднастайнай застойнай і тупіковай масы, у якой купаецца купіна, яна акупунктурная кропка якасці, і калі на яе наступаюць, калі на яе націскаюць, гэта адчувае і на гэта адгукаецца ўвесь асяродак.

Купіна скупая: яна не дазваляе, каб тая унікальнасць, якую яна назапашвала і накоплівала, размывалася і танула ў ніякай стыхіі.

Купіну акупоўваюць пукі сітніку, пукі асакі. Купіне адрасуюцца шматлікія кепікі і кпіны, але тым не менш усё, што мае сабе цану, пнецца на адзінае месца, дзе спаўна акупаецца іхняе колішняе паніжэнне,— на купіну.

## ЖОЛУД

Жолуд валодае надзвычайнай дужасцю, якая, як з шолудзяў, дазваляе яму вылузвацца з дужак усемагчымых абмежаванняў і нават з самога сябе.

З галіны векавечнага дуба — з галіны самой векавечнасці — жолуд падае ў дол, каб потым, адольваючы прыцягненне долу, цягнуцца да жаданага — да «жалуданага» — узроўню.

Жолуд луджаны: нібы палудай, ён атулены жоўта-рудой абалонкай; яна сцеражэ яго ад жуды сустрэчы з заўчаснаю рэчаіснасцю, і ў ёй доўжыцца яго засяроджанае вандраванне ў часе.

Жолуд — адменная ежа: і калі голад, і калі лад.

Пра таго, хто не ўмее паводзіцца ў жыцці, кажуць, што ён няўдалы, што ён недалужны; што да жолуда, дык ён заўжды ўдалы, заўжды «далужны».

**ЧОВЕН**

Дзе рэчка, дзе возера, там і човен — спрадвечны «чаловень» возера альбо рэчкі.

Човен выцесліўся, вычасаўся, «вычавіўся» на сушы і лічыцца сваяком карытам і ночвам, але калі ў карытаў і ночваў «авечыя» звычкі, то ў чоўна — «воўчыя», калі карыты і ночвы прысвечаны сушы і толькі час-почас асвечваюцца вадою, то човен начуе і днюе ў вадзе, калі карыты і ночвы сухія знадворку, то човен наадварот.

Калі ж човен знячэўку ці паступова напаўняец-ца вадою, тады ён нявечыцца і прычальвае не да берага, а да дна.

Човен навучаны асцярожнасці, ён чуйны да току вады і вагання хваляў, і вочы яго рассяроджаны па ўсёй плошчы ягонага цела.

У звычайнае надвор'е човен заслоньвае-зачыняе свае магчымасці, але ў адчайны час ён заахвочваецца на немагчымае і ўзлятае туды, дзе надоечы лёталі чайкі.

**ШАЛІ**

Шалі шануюць раўнавагу, і калі нехта яе парушае, яны хвалююцца, непакояцца, пакуль нарэшце не расшалопаюць, колькі — кіло альбо лот — важыць гэтае парушэнне, а да таго ж яшчэ колькі яно каштуе — дукат альбо шэлег.

Шалі пільна сочаць адна за адной, не дазваляючы адна адной шальмаваць, і калі адна з іх хоча прыўлашчыць сабе нейкі лішак, другая тут жа шалохаецца ад абурэння ўгору.

Шалі не маюць шляху, а маюць шкалу, якая, як школа, утрымлівае іх ад шалаў, ад шалапуцтва і навучае шляхетнасці.

Шалі вітаюцца, б'ючы адна адной чалом:
«— Шалом, шаля! — Шалом!..»

**ЛЕБЯДА**

Сярод «лабудзівага» зелля лебяда вымалёўваецца, як лебедзь сярод гусей: яна белага стану, белага паходжання, белай «косткі».

Лебяда не дбае аб прывілеях і расце, дзе давядзецца: на лядах, пад плотам альбо, калі гаспадыня згаджаецца, дык і на градах.

Але дзе б яна ні расла, яна пільнуе людскую долю, і калі парушаецца жыццёвы лад, калі над краем пануе няўрод, а людзі бадзяюцца, быццам здані, шукаючы, дзе б што здабыць на абед ці вячэру, лебяда нагадвае аб сабе: яна, хоць бедная, але яда, а ў часіну нішчымніцы, бадай, тое самае што і бульба, бадай, тое самае што і хлеб.

Лебяда туліцца да людзей, а людзі любяць яе больш за любое іншае зелле, ведаючы: дзе лебяда, там смутак не смутак, голад не голад, бяда не бяда.

**АКНО**

Вока хаты, акно спакон веку ўзіраецца ў свет, і свет спакон веку ўзіраецца ў акно. І таму яно заўсёды старое, як сама хата, і новае, як сам свет.

Акно выводзіць хату ў кантэкст навакольля, пераконваючы яе, што тое «кіно», якое яно ёй паказвае, мае да яе нейкае — і мо не малое — дачыненне.

Акно акантавана каробкаю, перахрышчана рамаю, аздоблена ліштвою, абгрунтавана падаконнікам і ўзаконена аканіцай.

За акном, па двары, ходзіць конь.

На акне стаіць вазон з кветкамі.

Над акном, у куце-покуці, узвышаецца ікона.

**МУХА**

Літоўскае m u s ė куслівая, як аса, але ёй мусіць усё даравацца, бо яна ***тusц*** (наша).

Сербская м у в а да ўсіх праяўляе ўвагу, з усімі імкнецца знайсці супольную мову, а сустракае змову.

Беларуская м у х а прымхлівая: яна пільнуецца сваіх Сёмухаў і сваіх Дзесятухаў, дзе можа ўволю павесяліцца,— пабыць «пад мухай».

Украінская м у х а кумекае, як бы ёй дзе змахляваць, але, махлюючы, апрача гешэфту, атрымлівае аплявуху.

Руская м у х а «зуха»: яна мае «ухараўскія» ўхваткі, нібыта яна сама вынайшла прымаўку: «Адным махам сем мух забіяхам» і сама ж намерваецца яе спраўдзіць.

Чэшская m o u c h a гаспадыня ўхаце: яе хапае, каб пасмакаваць і малако, і мёд, і муку.

Латышская m u š a — мошка, але ў гэтай мошкі душа музы.

**ЖОРНЫ**

Парожнія, жорны стаяць, але калі ў іхняе жарало ўсыпаецца хоць бы жменя зерня, яны ажываюць, яны разварушваюцца, яны «жораюць» пачастунак, варожачы, што ўрэшце з яго атрымаецца, ці корж, ці аладак, ці піражок.

Тое, што распачынаў жняяр-серп і прадоўжваў цэп-малацьбіт, жорны даводзяць да ўзорнага завяршэння.

Жорны жорсткія: яны мажджэрацъ, перашароў-ваюць, пературшчваюць жарству жыта, ячменю, пшаніцы.

І гэтаксама, як жорны, кружацца між сабою зямля і неба, не выпускаючы са свайго кругазвароту ні пружанца, ні ружанца, ні жупранца, пакуль кожны з іх не перамучыць сваіх шурпатасцяў, не зжыве заганаў, пакуль кожны з іх не зробіцца «зорны», пакуль кожны з іх не зведае канчатковага паражэння, а разам з тым — перамогі.

**МАЛАКО**

Беларускае м а л а к о смачнейшае за мак і маліну: малым яно дае моц і розум, а старых малодзіць.

Стараславянскае м л □ к о як Мекка: усе да яго імкнуцца, усім яно лекі.

Рускае м о л о к о падмацунак касцу і малацьбіту і *лакомство* катку.

Балгарскае м л я к о мляўкае, як летні сон: яно лашчыць язык і паднябенне.

Праславянскае m e l k o змялелае, як Няміга.

Лужыцкае m l o k o закрашвае локшыну.

Шведскае m j o l k пахне мёдам і зёлкамі.

Нямецкае M i l c h мілае, нібы малітва маці за сваё немаўля.

**ЗВОН**

Звон адзываецца на ўсе святы, на ўсе вялікія падзеі і, супадаючы са сваім зрокавым вобразам, зноўку і зноў апынаецца звонку яго.

Звон азанує прастору, і той абсяг, які займаюць яго зовы, яго пераазовы-звёны, становіцца своеасаблівай зялёнай зонай.

І нават калі б звон званіў безупынна, разумнаму слыху ён усё роўна не назаляе.

**ШКАРЛУПІНА**

Шкарлупіна заглытвае яйка, нібы змяя-шкарупея, але так, што яно застаецца цэлым і непарушным, а сама, у сваю чаргу, становіцца яго часткай, яго шкурай, яго ахоўнай знадворнаю абалонкай.

Няма той хвіліны, каб шкарлупіна не рупілася аб яйку, яна атуляе яго, як найдаражэйшы скарб, пільна і шчыльна, не пакідаючы нідзе ніводнай шчылінкі.

Шкарлупіна крохкая, але не настолькі, каб дазволіць знадворным штуршкам і шкрэбінам пашкодзіць яшчэ не народжанаму жыццю;

шкарлупіна цвёрдая, але не настолькі, каб не дазволіць гэтаму жыццю прабіцца, прастукацца, пралупіцца, а самой, ні на што не скардзячыся і не наракаючы, апасці купкай спустошаных і бескарысных ракушак, распасціся на шалупінне.

## ВІЛЫ

Праславянскія v i d l a справядлівыя: што б яны ні рабілі, яны заўсёды робяць для кагосьці — для «вы».

Сербскія в и л е, нібы пракудлівыя німфы-вілы, штохвілі ўхіляюцца ад вайны, а, ухіліўшыся ад вайны, ухіляюцца і ад міру.

Украінскія вила працавітыя, як валы; але калі яны маюць сілу, не маюць «вільності», калі маюць «вільность», не маюць сілы.

Беларускія вілы, ці яны ўбіваюцца ў гной, ці ўвіхаюцца з сенам, усялякі раз мусяць ведаць, у якім баку Вільня.

Польскія widły відушчыя: яны глядзяць у ваду Віслы, а бачаць, што робіцца далёка ў наваколлі.

Рускія вил ы, куды б ні вялі, заўсёды апынаюцца перад немінучым выбарам: или — или.

**НЕРАТ**

Нерат нырае ў нетры ракі і, прапускаючы раку праз сябе, затрымлівае яе жыхароў — рыбін,

Нерат нікому не дароўвае неабачлівасці, і хто ў яго раптам трапляе, таму няма ходу ні ўзад, ні ўперад.

Але нерат не рады сваёй удачы, бо калі ён парожні — ён адчувае сябе ракою, для якой няма перашкоды, а калі з рыбай — дык рыбай, якая шукае і не знаходзіць ратунку.

**АСКЕПАК**

Калі здараецца кепскае — б'ецца люстэрка ці гляк, тады ўзнікаюць аскепкі — аспекты пытання, якія забылі само пытанне, складнікі спектру, якія згубілі сам спектр.

І як бы пасля іх ні склейвалі і ні склепвалі, яны ўжо не змогуць вярнуцца ў колішнюю самаадсутнасць, яны ўжо не змогуць прыняцца ў ранейшую цэласнасць.

На аскепак, нібы на блазна-кепа, валяцца кіпы кепікаў, яго папікаюць, яго папіхаюць, пакуль наогул не выпхнуць на сметнік, і калі шкліну ці гляк шкадуюць, то нікому ніколі не прыйдзе на думку пашкадаваць аскепак, сказаць, што ён кемлівы, што ён пекны.

Аскепак — скептык: ён ведае, што ў аснове ўсіх непарушных саюзаў, усіх маналітных сплаваў прысутнічае непрыкметнае, але шматстайнае «аз», і гэтае «аз» аднойчы захоча акрэсліцца, захоча стаць к і м с ь ц і.

**ВЕРАЦЯНО**

Нібы яго точыць верад, верацяно шчыруе ад цямна да цямна, а калі запальваецца лучына, то і ў часы вялікіх і мігатлівых ценяў, і такім чынам расце: набывае ўсё большую вагу, таўшчыню і вартасць.

Скіроўваючыся сваім верхам і нізам у два процілеглыя канцы, сумяшчаючы і ўраўнаважваючы ў сабе два процілеглыя вектары, верацяно не западае ў неварацьць, а ўцягвае навакольную прастору ў віртуальную сферу свайго ўплыву.

Быццам віруе вір, верацяно верціцца адно толькі наўкола самога сябе і, «перацягваючы» разбэрсанае ў спарадкаванае, няпэўнае ў пэўнае, верыць, што яно цэнтр рэчаіснасці.
І ці возьмецца хто пярэчыць, што яно не мае рацыі?!.

## СЛУП

Стараславянскі столпъ, нібы святочны стол, прываблівае да сябе людскія толпы.

Украінскі с т о в п, нібы пост, «сталае» ўсіх, хто едзе і хто ідзе, і таму ён — сто, і таму ён — стоўпішча.

Рускі столб стаіць пасярод дарогі, і той; хто разбівае аб яго лоб, лаецца: «Асталоп!», а хто блытаецца ў трох соснах, вітае яго: «Апостал!»

Сербскі с т у б — тубылец: выступаючы над зямлёй, нібы ступа, ён, нібы студня, уваходзіць углыбіню.

Літоўскі s t u l p a s адтуль і адсюль затуляе сваім тулавам Летуву ад непажаданых наступстваў.

Беларускі слуп лупаціцца ў наваколле, спрабуючы даўмецца, чаму ён усім слугуе, а ўсе яго лупяць, усе лупцуюць.

## КЛЮЧ І ЗАМОК

Ключ кліча, замок адгукаецца, ключ шукае, замок чакае, ключ ведае, замок мае, ключ то знікае, то зноўку ўзнікае, замок застаецца заўсёды на тым самым месцы.

Ключ ад усіх хаваецца, замок усім аб'яўляецца, ключ — у схованцы, замок — навідавоку, ключ уладкоўваецца ў сухім і ў цёплым, замок мокне на дажджы і калее на холадзе.

Ключ — клічнік, замок — пытальнік, ключ — модус, замок — атрыбут, ключ — учынак, замок — з'ява, ключ належыць мужчыне, замок — жанчыне, ключ — неба, замок — зямля.

Замок забараняе, ключ дазваляе, замок — зіма, ключ — вясна, замок — правіла, ключ — выключэнне, замок — загадка, ключ — адгадка, замок — нуль, ключ — адзінка.

Ключ бачыць, замок пазірае, ключ чуе, замок слухае, ключ — лічба, замок — слова, ключ — дзейнік, замок — выказнік, ключ — выпадковасць, замок — заканамернасць, ключ — магчымасць, замок — неабходнасць.

Ключ — смык, замок — скрыпка, і куды б, далёка ці блізка, ні адыходзіў ключ ад замка, сувязь, якая іх лучыць, не калечыцца і не камечыцца, і адкуль бы, здалёк ці зблізку, ні вяртаўся ключ да замка, за гэтым вяртаннем сочыць музыка іхніх узаемадачыненняў.

**СУМЁТ**

Сумёт месціцца каля перашкоды — плота, паветкі, моста, а то і проста, дзякуючы якой-небудзь умяціне ці зачэпцы, у полі.

Сумёт высноўваецца з сумяціцы — сумоўя ветру і снегу, але выснаваны, уяўляе ансамбль, дзе пануе сіметрыя.

Да сумёта не стасуецца схема: калі ён геаметрыя, то мастацкая, калі мастацтва, то геаметрычнае, а хутчэй за ўсё ён сумесна і геаметрыя, і мастацтва, іхняя сума.

Нібы самалёт, аддадзены палёту, сумёт з цягам часу перастае існаваць — перацякае ў палёт, але, не ўпадаючы ў сум, і ранішне-белы, і вечарова-сцямнелы сваёю прысутнасцю ўсім аб'яўляе: «Sum» («Я ёсць»).

**БАГНА**

У багне, бы ў лазні-бані, бавяць свой час паганскія багі-нячысцікі, і агонь апраметнай грэе яе «габінеты».

Багна багатая тым, што ёй аддае наваколле, і ўсё, што яно аддае, «габае» нагбом,

Ціхмяная, нібы ягня, багна нікога не палохае, ні на кога не нападае, аднак яе баяцца, як ганьбы, і агінаюць, нібы благое здарэнне.

Багна абагульняе ваду і сушу, і хто ўгадае, якая ў яе глыбіня, якая ў яе «гібльня».

**МЁД**

Украінскі м е д найлепшая яда і мядзведзю, і людзям.

Рускі м ё д насычаны, нібы ёд: ён і пячэ, і гоіць.

Праславянскі m e d ъ адмысловы сродак для медытацыі.

Літоўскі m e d u s духмянлівы, нібы мята.

Латышскі m e d u s ведае на памяць усе рэцэпты старой медыцыны.

Старажытнапрусжі m e d d o загуслы, як медзь.

Старажытнаіндыйскі m e d h u — квінтэсенцыя рэчаў, згушчаы дух самой матэрыі.

Ірландскі m i d дае сілу ідалам і розум – людзям.

Беларускі м ё д — нямая мелодыя, якая гучыць адно толькі таму, хто ім ласуецца.

**ЧАРОТ**

Чарот чарадою заходзіць ва ўрочышча Шчары, Нарачы, Нешчарды і, пабраўшы, каб дыхаць, у рот цыбуры сваіх трубак, нібы раптам заснуў ці падпаў пад чары, там затрымоўваецца.

Адной сваёй часткай чарот учапerваецца ў грунт, другою — уточваецца ў ваду, трэцяй — урошчваецца ў паветра, і, сам пры гэтым становячыся нечым чацвёртым, у салодкім палёце сторч галавою ўстромліваецца ў чарэнне нябёсаў.

Чарот тварыўся не на ўроку малявання, а на ўроку чарчэння, і сярод іншых квяцістых і маляўнічых рэчаў, нібы патароча, ён «вечаровы» і «чарнавы».

## АЛАДКА І БЛІН

Аладка гладкая, блін пульхны, аладка ўдалая, блін файны, аладка — латка, блін — лапік, аладка — аўра, блін — німб.

Аладка пячэцца на патэльні, блін — на блясе, аладка салодкая, блін «аблізны», аладка лагодзіць згадку, блін — успамін.

Аладка — на Каляды, блін — на Вялікдзень, аладка — на сняданак, блін — на абед, аладка пахкая, блін бліскучы, аладка ладкуецца ў далонь, блін плішчыцца ў жменю; але аладка гэткая ж смачная, як і блін, а блін лепіцца з таго ж самага цеста, што і аладка.

**ВЕЦЕР**

Беларускі в е ц е р сланяецца па свеце, пераціраючы пацяруху і цярэбячы вецце дрэў.

Рускі в е т е р нясе ўсім *привет.*

Польскі w i a t r ветэран; яго аповеды вартыя веры.

Палабскі v o t r мае непаўторны водар, але гэты водар закаркаваны ў стагоддзях.

Ніжнялужыцкі w j e t š знявечаны: нікога не чапаючы, ён чакае, калі ўсталюецца вечар, які схавае яго ад староннiх вачэй і старонніх спачуванняў.

Славенскі v e t e r надзімае ветразі ў Ядранскім (Адрыятычным) моры.

Славацкі v i e t o r трымаецца аднаго вектару, на ўсе астатнія накладаючы вета.

Чэшскі v i t r з аднолькавай цікавасцю зазірае ў вітрыны і ў вітражы.

Македонскі в е т а р інтравертны: ён вандруе ўнутры адной прасторы, адной тэрыторыі.

Стараславянскі в ѣт р , як бог, мае тры твары: адзін — для хмараў-аблокаў, другі — для зямной паверхні і трэці — для мора.

Нямецкі W i n d працуе: ён круціць крылы ў вентылятараў і ў ветракоў.

Латышскі v ē j š увішны: калі непагадзь — свішча, калі пагода — сушыць развешаную бялізну.

**ШАПКА**

Шапка сваячыцца з шафай, але калі шафа мае справу з многімі прадметамі, то шапка з адным, але самым галоўным.

Яна прысвечана ў першапачаткі, якіх ніхто не можа ўбачыць і аб якіх, нават шэптам, ніхто нічога не можа сказаць,— у чалавечыя думкі, і таму спакваля назапашвае-набывае статус даверанай асобы.

З усіх бакоў шапка шчыльна «зашпаклявана», і як бы ні шныпарылі скразнякі, яны не могуць намацаць ніводнай шпары.

Шапка — капа, якая падвышае чалавека ў яго ўласных вачах і ў вачах іншых і здабывае яму пашану. І таму нават самы апошні спадар, нібы шпак шпакоўню, шукае альбо спадзяецца калі-небудзь знайсці свой красамоўны, заўсёды ўсім прад'яўлены «пашпарт» — шапку, якая яму пасуе.

**ГАРОХ**

На беларускі г а р о х рохкаюць свінні, што ён у агародзе найгоршы, а ён у адказ рагоча.

Рускі г о р о х, калі на яго глядзяць, харошы і гожы, а калі ядуць — горкі.

Украінскі г о р о х агарошвае, думалі, што ён «ох», а ён — «ах», думалі, што яго нямнога, а яго цэлы рог.

Польскі g r o c h хоць не град, але грукатлівы, хоць не грош, але ганарлівы.

Чэшскі h r á c h вялікі, нібы арэх, і нават грак разважае, ці яго праглынуць, ці — далей ад граху — абмінуць.

Праславянскі g o r x ъ, калі сеецца, з прыгоршчаў перавандроўвае на горку, а калі выспее — зноў у прыгоршчы.

**ЖМЕНЯ**

Жменя — «меня»: тое, чаго не мае, яна бярэ, а тое, што мае, яна аддае і такім чынам усталёўвае раўнавагу паміж парожнім і поўным.

Калі жменя бярэ болей, чым яна можа ўмясціць, тады яна ненаежа; калі яна аддае меней, чым узяла, калі нешта ў ёй «зажымаецца», тады яна жмінда.

Жменя абмежаваная, і таму яна паўтарае адзін і той жа рух, памнажаючы яго на ўсю даўжыню чалавечага жыцця.

Жменя сее і жменя жне. Жменя мне і жменя табе.

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА

Алесь Разанаў нарадзіўся 5 снежня 1947 года ў вёсцы Сялец Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыўшы школу, у 1966 годзе паступіў на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта, з якога, аднак, за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях (восень 1968 г.), накіраваных на абарону беларускай мовы, быў адлічаны.

У 1970 годзе скончыў Брэсцкі педагагічны інстытут. Служыў у войску, працаваў у школе настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, літсупрацоўнікам газеты «Літаратура і мастацтва», бюлетэня «Родная прырода», рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура», старшынёй Беларускага фонду Рэрыхаў, навуковым супрацоўнікам Скарынаўскага цэнтра, цяпер выконвае абавязкі галоўнага рэдактара часопіса «Крыніца».

Аўтар зборнікаў паэзіі «Адраджэнне» (1970), «Назаўжды» (1974), «Каардынаты быцця» (1976), «Шлях-360» (1981), «Вастрыё стралы» (1988), «У горадзе валадарыць Рагвалод» (1992), «Паляванне ў райскай даліне» (1995), «Рэчаіснасць» (1998).

Заснаваў і ўвёў у беларускую паэзію новыя формы — вер- сэты, вершаказы, квантэмы, зномы.

Узнавіў шэраг твораў старажытнай беларускай літаратуры, у прыватнасці Кірылы Тураўскага, Францішка Скарыны, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Язэпа Руцкага, Кірылы Транквіліёна-Стаўравецкага, Мялеція Сматрыцкага, Іпацій Пацея.

Склаў кнігу паэзіі Янкі Купалы «Выйдзі з сэрцам, як з паходняй!..» (1982).

Выступае ў друку з германеўтычнымі распрацоўкамі (каментарыі на вершы Надзеі Артымовіч пад назваю «Дзверы» выйшлі ў 1994 г. у Беластоку асобнаю кніжкай). Перакладае з літоўскай, славенскай, нямецкай ды іншых моў. Творы самога Алеся Разанава перакладзены больш чым на 20 моў, асобнымі выданнямі выйшлі кнігі ў Грузіі, Германіі, Балгарыі, Польшчы.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы (1990).

## ЗМЕСТ

*Вершы*
Пошук
«Наіўны хлопчык з сіняй казкі...»
Маланка
Мова
Спякота
Адкрыццё
«Які запал!..»
Немагчымае
«Ноч гасіць у вокнах агні...»
Чалавек
Празорца
Воля
Вытокі
Эксперымент
«Урал, Урал!..»
Шчасце
«Сцюдзёнае паветра разлілося...»
Паганіні
Тамаза Ккмпанела
Сакавік
Прамільгнуўшае
Роспачная балада
Нявыказаная балада
«Смуткуе бярозавы гай...»
Балада прыкметы
Дрэвы
Лес
Запавет
Радзіма
Узыход
Пачатак
«Не распнутае доляю ўбогай...»
Пытанне
«Сачу вясну...»
«Іх далячыні развялі...»
«Адно сказаць...»
«Каб не пакінуць успаміну...»
«Калі мы проста былі знаёмыя...»
«Усюды голас твой чуцён...»
«Усплёскі вады і вербаў...»
Арышт Кастуся Каліноўскага
Папярэджанне

*Пункціры*
*Залевы. Дражняць міражы...

*Паэмы*
Паэма жніва
Было балота
Паэма калодзежа
Паэма рэха
Паэма рыбіны
Паэма сланечніка
Першая паэма шляху
Паэма гарачага лісця
Паэма запаленых свечак
Паэма чырвоных вяровак
Гліна

*Версэты*
Дарэшты
Зброя
Апора
Пярэчанне
Падзел
Навобмацак
Спадчына
Апошні час
Шыльдачкі
Здарэнні
Абсяг
Бязмежжа
Мэта
На гэтай зямлі
Птах
Вучань чараўніка
Зацьменне
У крузе
Гаворка Саша
Завея
Сінія людзі
Чорны абраз
«Дзве мэты...»
Заваёўнікі
Сляды

Мяжа
Маланка
Разам з травой
Паверхня
Камяні
Сыны Іова
Трансмутацыя
У старой хаце
На другі год вайны
Сіні туман
Рэчы
Палёт
Стары горад
Далечыня
Прыкметы
Другое сонца
Змеі
Іван Гуговіч
«На маёй дарозе…»
Расколіна
Лесвіца
Будучыня
Шэрань
Лясная дарога
Студня
Сховы
Дрэвы
Ланцуг
Танец з вужакамі
Пасткі
Дубовы плот
«Што прымушае нас…»
Падарунак хроснай маці
Аскепкі
Чаравікі
«Абуджаюся і засынаю…»
Лабараторыя
Вандроўны горад
Адліга
Адгэтуль
Парог  Снег
Краты  Дзічка
Відушчы камень
Апошні аргумент
Карона
Мы, людзі
Госці
Палёт стралы
Лужыны
Рыбіна
«Прымаю тое, што ёсць…»
Пастухі
Ролі
Сяргей Цыган
Плынь
Планета метамарфозаў
«Гавару, услухоўваючыся…»
Яны
У лесе
З ключом у руцэ
Атава
Гліняныя чалавечкі
«Вобразы вабяць…»
Тыгр
У каморы
Старая хрысціянка
Заваёўнікі-ІІ
Газеты
Пасажыры
Крыніца, з якой піў святы
Мітынг
Заваёўнікі-ІІІ
Нож з драўлянымі тронкамі
Тры труны
Sumus ne simus
На Нямецкай дарозе
Маму Тхакур дае
Рэчы-ІІ
Паляванне ў райскай даліне
Хмара
Спарышы
Рунь
«За далягядам грымоты…»
Чырвоны змрок
Заваёўнікі-IV
Дарожныя знакі
Кладкі
Бацькавы рэчы
Бульбіны
Ідал

На свята Збавення душы і цела
Алёсы
Навіны
Дарагі Запалянец
Падводны плывец
Маленькія ночвы
Сербская вёска
Скарб
Дасягненні
Палёт кажана
Старыя дрэвы
Чачэнская куля
Навальніца
Два беззаконні
Бездань
Спрадвечны пыл
Надзея, якая не мае патрэбы ў абгрунтаванні
Ганна-Марыя
Позірк
Старэйшы брат
Святое жыта
Чырвоная гліна
Бура
Атрад
Пагарджаны прарок
Цуд
Голас

*Вершаказы*

Горад
Дуб
Дым
Дзверы
Дарога
Воўк
Карані
Брук
Скрынка
Хлеб
Піла
Калода
Зброя
Пячора
Каса
Лёд
Маланка і гром
Грошы
Бераг
Сякера
Птах
Пчала
Барана
Певень
Лес
Свечка
Дождж
Гліна
Грыб
Век
Дзіда
Гузік
Павуціна
Бяда і гора
Верас
Карона
Кажух
Лейцы
Месяц
Кішэня
Голад і холад
Страла
Ліштва
Вясло
Будзень і свята
Госць
Сцежка
Нара
Кій
Камора
Зіма
Граблі
Сноп
Сані
Пляма
Купіна
Жолуд
Човен
Шалі
Лебяда

Акно
Муха
Жорны
Малако
Звон
Шкарлупіна
Вілы
Нерат
Аскепак
Верацяно
Слуп
Ключ і замок
Сумёт
Багна
Мёд
Чарот
Аладка і блін
Вецер
Шапка
Гарох
Жменя
Біяграфічная даведка

Разанаў А.

Танец з вужакамі: Выбранае Мн Маст. літ., 1999.— 462 с.— (Беларускімі паэзія XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0468-0

Публікацыя ў 1966 годзе вершаў адзінаццацікласніка Алеся Разанава стала падзеяй у беларускай паэзіі. Але падзеяй у беларускай паэзіі стала наогул уся творчасць паэта, з чыім імем звязаны яе найбольш прынцыповыя дасягненні апошніх дзесяцігоддзяў. Класічны традыцыяналіст і разам з тым яркі наватар, А. Разанаў увёў у паэзію свае, новыя, жанры, здзейсніўся па словах крытыкі, як школа і як накірунак і, нягледзячы на шчыльныя ідэалагічныя забароны, сказаў непаўторнае слова пра час і пра сябе. Творы А. Разанава нязменна прыцягваюць увагу чытачоў і даследчыкаў, актыўна перакладаюцца на іншыя мовы.

Падводзячы рысу пад здзейсненым, кніга выбраных твораў тоіць у сабе магчымасці ўсё новага прачытання і скіравана ў наступнасць, «якая заўсёды тут».

УДК 882.6-1